Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЛІСТАПАДА 2016 г. ЧАЦВЕР № 217 (28327)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Стаж: страхавы ці агульны?**

СТАР. 3

Сямейная газета



**На шпагат — у 66 гадоў!**



**Адзін стыль на дваіх**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**4,817 млрд долараў**

*у эквіваленце дасягнулі, па папярэдніх дадзеных на пачатак лістапада, золатавалютныя рэзервы Беларусі ў міжнародным вызначэнні ў кастрычніку 2016 года. За апошні месяц яны павялічыліся на 62,1 млн долараў. У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў зменшыўся на 70,5 млн долараў і на 1 лістапада склаў 5,175 млрд долараў у эквіваленце. Падтрыманню золатавалютных рэзерваў спрыялі паступленне сродкаў ад продажу Нацбанкам і Мінфінам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, купля Нацбанкам замежнай валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, а таксама паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9083 | ▲ |
| Еўра | 2,1332 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0298 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0746 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ПЕРШЫ ЎРОК ЗДАРОЎЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка сталічнага мікрараёна з вуліцы Жукоўская Марына СКУДНАЯ далучае сваю двухгадовую дачку Надзею да аздараўленчых трэніровак на трэнажоры, які стаіць у двары.

■ Разумныя грошы

## ДРОБНЫМ ШРЫФТАМ ЧЫТАЦЬ АБАВЯЗКОВА

### Не заўсёды спецыяльныя акцыі банкаў, аператараў мабільнай сувязі і гандлёвых сетак для нас прымальныя

**Праўда, разумеем мы гэта звычайна ўжо пасля таго, як трапляем «на вуду» на першы погляд цікавых, але на самай справе неадназначных прапаноў. І заўважу, што папасціся на такі кручок «аматараў бясплатных падарункаў» можа любы чалавек, незалежна ад узросту, полу, адукацыі і сацыяльнага статусу. У гэтым выпадку сапраўды лічыць, што яму прапануюць вельмі прывабныя ўмовы (набыцця тавару, адкрыцця ўкладу, атрымання пластыкавай карткі і г. д.), а яшчэ кліент упэўнены — так пашанцавала выключна яму. Таму і трэба карыстацца момантам, нават нягледзячы на нейкія там дробязі... Але ў фінансах усе нюансы галоўныя.**



### Задарма не бывае

Днямі мне на электронную пошту трапіў рэкламны ліст ад аднаго камерцыйнага банка, дзе прапанавалася набыць першую бясплатную пластыкавую прэміум-картку, якая вартае на кошт уладальніка да 2% ад сумы пакупак. Мне адразу патлумачылі, што яна адкрывае новы этап у развіцці элітнага «пластыка» ў краіне. У гэтым банку картку афармляюць бясплатна, без якіх-небудзь абавязацельстваў для актыўных кліентаў. Далей выкарыстоўваць яе можна для аплаты пакупак і атрымання прывілеяў у любой частцы свету, у тым ліку — зніжак падчас падарожжаў і вольнага доступу ў VIP-залы міжнародных аэрапортаў. Згадзіцеся, што стартавыя ўмовы прапановы досыць прывабныя.

Самай «смачнай» умовай гэтай карткі выступае менавіта павышаны кэшбэк — пры аплаце «пластыкам» банк кампенсуе частку выдаткаў падчас шопінгу.

СТАР. 4

■ І так бывае...

## Каб за прыгажосць не заплаціць здароўем

### Якія рызыкі тоіць у сабе наведванне саматужнай цырульні

**Аксана адчула сябе дрэнна яшчэ на рабоце. Раптам забалела галава, адчувалася ламата ва ўсім целе, пад вечар паднялася тэмпература. Першая думка была пра грып. Хоць яшчэ як быццам няма эпідэміі, але ж каварны вірус можа спасцігнуць не толькі ў сезон захворванняў. Малады офісны работнік адпрасілася ў кіраўніцы крыху раней з цвёрдым намерам вылежаць усе выхадныя ў ложку ў спадзяванні, што арганізм справіцца. Але лепей не стала, дабавіліся рвота, болі ў жываце, а родныя заўважылі, што скура дзяўчыны набывае жоўтае адценне.**

Медыкі хуткай дапамогі адразу западозрылі вірусны гепатыт, дзяўчыну адвезлі ў бальніцу. Абследаванне пацвердзіла папярэднія меркаванні. Дыягназ парэнтэральны вірусны гепатыт азначае, што чалавек заражаецца праз кроў. Дзяўчыне прапанавалі ўспамінаць, дзе і як магло адбыцца заражэнне. Прыём наркотыкаў, а таксама інфіцыраванне палавым шляхам адпадала, пераліванне крыві і іншыя маніпуляцыі ў медустановах дзяўчыне не рабілі. Як высветлілася, зубы яна лячыла даўно ў вядомага ў іх райцэнтры прыватнага стаматолага. Цырульню маладая асоба наведвае лепшую ў горадзе, і майстар, гаваркая Юлія, кожны раз расказвае, як часта іх правярае санітарная служба, і як старанна яны апрацоўваюць інструменты. Лечачы ўрач, здаецца, недарэмна спытала ў Аксаны, калі яна праколвала вушы.

СТАР. 14

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА ТУРЦЫІ

**Афіцыйныя перагаворы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана адбудуцца 11 лістапада ў Палацы Незалежнасці, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць шырокі комплекс пытанняў развіцця міждзяржаўных адносін з акцэнтам на актывізацыю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, абмяняюцца поглядамі па праблематыцы рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня. Па выніках перагавораў чакаецца падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў.

У рамках праграмы афіцыйнага візіту Прэзідэнта Турцыі ў Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Рэджэп Таіп Эрдаган прымуць удзел у беларуска-турэцкім бізнес-форуме, а таксама ў цырымоніі адкрыцця Саборнай мячэці ў Мінску.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ДОНАЛЬДА ТРАМПА З ПЕРАМОГАЙ НА ВЫБАРАХ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дональда Джона Трампа з выбраннем на пасаду Прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Ваша перамога — сведчанне выбару амерыканскага народа на карысць палітыкі, якая грунтуецца на сумленнасці, адказнасці, пошуку перамен, — гаворыцца ў віншаванні. — Сваёй актыўнай, шчырай і смелай пазіцыяй у ходзе перадвыбарнай кампаніі Вы ўзварухнулі амерыканскае грамадства, вярнуўшы яго да сапраўднай дэмакратыі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь у знешнепалітычнай дзейнасці заўсёды прытрымлівалася неабходнасці канструктыўнага супрацоўніцтва са Злучанымі Штатамі Амерыкі. «Спадзяюся, што пад Вашым кіраўніцтвам нармалізацыя адносін паміж нашымі краінамі прадоўжыцца», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы таксама пажадаў Дональду Джону Трампу здароўя, энергіі і настойлівасці ў выкананні перадвыбарных абяцанняў.

## Нашы кнігі ў Астане

**Больш за 500 выданняў прэзентуе наша краіна на Еўразійскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы ў Астане.**

Удзел ва ўрачыстым адкрыцці Еўразійскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу прыняў першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Луцкі, адкрыла кніжны форум дзяржсакратар Казахстана Гульшара Абдыкалікава. Яна пабывала і на беларускай экспазіцыі, азнаёмілася з прадстаўленымі там выданнямі.

На выстаўцы прэзентаваны ўвесь спектр літаратуры, якая выдаецца ў Беларусі. У тым ліку краіназнаўчая, дзіцячая, вучэбная. На цэнтральнай пляцоўцы пасля ўрачыстага адкрыцця выстаўкі былі прэзентаваны кнігі выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». У беларускую экспазіцыю ўвайшлі таксама кнігі Выдавецкага дома «Звязда», выдавецтваў «Вышэйшая школа», «Мастацкая літаратура» і інш.

Еўразійская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш будзе працаваць да 12 лістапада, паведамляе БЕЛТА. Гэта буйнейшае культурна-асветніцкае мерапрыемства ў еўразійскай прасторы, якое праходзіць напярэдадні 25-годдзя Незалежнасці Рэспублікі Казахстан і аб'ядноўвае на адной вялікай інтэлектуальнай пляцоўцы выдавецкія, навукова-адукацыйныя і паліграфічныя кампаніі краін СНД, Еўропы і Азіі.

■ Полацк-2017

# У ГОНАР ПЕРШАДРУКАРА

### Вызначаныя дамінанты наступнага Дня беларускага пісьменства

**Свята, што налета пройдзе ў самым старажытным горадзе Беларусі, стане асаблівым: яно адбудзецца пад знакам адметных для гісторыі нашай краіны дат — 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і 1155-годдзя Полацка. Пра гэта падчас пасяджэння Нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства-2017 паведаміла намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА.**


Фота БЕЛТА.

«Гэтыя два знакавыя юбілеі павінны быць асноўнымі ў канцэпцыі Дня беларускага пісьменства», — сказала яна. Намеснік прэм'ер-міністра прапанавала таксама крыху змяніць яго фармат: «Не зусім правільна, калі, адкрыўшы раніцай у нядзелю свята, ужо вечарам мы яго закрываем. Гэта павінна быць працяглае мерапрыемства». Таму мяркуецца, што адкрыццё Дня беларускага пісьменства пройдзе ў суботу, 2 верасня, а самі ўрачыстасці прадоўжацца два дні. Віцэ-прэм'ер зазначыла, што свята, якое сёлета прымаў Рагачоў, прайшло на высокім узроўні, таму і Дзень пісьменства ў Полацку мае быць не менш яркай падзеяй для жыхароў і гасцей горада.

Па традыцыі на свяце пісьменства не застануцца па-за ўвагай і знакавыя для беларускай літаратуры даты. У 2017 годзе мы адзначым 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, юбілеі Цішкі Гартнага, Алеся Гаруна, Янкі Брыля, Пімена Панчанкі і іншых. Пра гэта падчас пасяджэння аргкамітэта паведаміла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**.

Плануецца, што дзень беларускага пісьменства будзе адзначаны і яркай прэм'ерай фільма, які пакуль мае ўмоўную назву «Шляхамі Францыска Скарыны», паведамляе БЕЛТА.

«Канцэпцыя Дня беларускага пісьменства — паказаць сувязь гісторыі і сучаснасці. Прадэманстраваць, што ідэі першадрукара актуальныя сёння для развіцця Беларусі і іншых краін. Мы прапануем зрабіць акцэнт не толькі на тэатралізаваным дзействе, але і зняць фільм, прайсці шляхамі Скарыны па гарадах і краінах. Кінастужка пакажа, што краіны, дзе бываў і жыў наш першадрукар, маюць непарыўную сувязь з Беларуссю», — падкрэсліла Лілія Ананіч.

Мяркуецца, што праграма свята беларускага пісьменства ў Полацку будзе багатай і насычанай. Так, пройдзе традыцыйны міжнародны «круглы стол» з удзелам беларускіх і замежных літаратараў, адбудзецца канферэнцыя «Полацкія чытанні», конкурс чытальнікаў «Жывая класіка», фестываль кнігі і прэсы. Арганізатары таксама прапануюць палачанам бліжэй пазнаёміцца з творчасцю і працай выдатных землякоў, у ліку іншых — мастака Івана Хруцкага, выдаўца, даследчыка, збіральніка фальклору Браніслава Эпімаха-Шыпілы. Пабачыць госці свята і літаратурна-музычную праграму «Як на свет радзіўся Янка...», прысвечаную жыццю і творчасці Янкі Купалы. У пастаноўцы прымуць удзел вядомыя беларускія артысты — Анатоль Ярмоленка, Іна Афанасьева, Валерый Дайнека, арт-група «Беларусы», ансамбль «Песняры». Гэтую імпрэзу прапануе арганізаваць Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Лілія Ананіч таксама адзначыла, што Міністэрства інфармацыі ўжо пачало распрацоўку юбілейных мерапрыемстваў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Тэма падрыхтоўкі да знакавага юбілею сёлета знайшла шырокае адлюстраванне ў канцэпцыях правядзення буйных культурна-інфармацыйных мерапрыемстваў, такіх, як Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, Дзень беларускага пісьменства ў Рагачове, рэспубліканскае свята «Александрыя збірае сяброў». Да гэтай знакавай даты дзяржаўныя выдавецтвы пачалі выпуск у 2016 годзе і прадоўжаць у 2017-м падрыхтоўку шэрагу кніжных выданняў.

Мерапрыемствы да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання запланаваны ў наступным годзе і ў рамках работы кніжных экспазіцый на міжнародных і нацыянальных выстаўках-кірмашах, рыхтуюцца тэматычныя праекты ў сродках масавай інфармацыі. Адметна, што да правядзення вялікага нацыянальнага свята далучацца абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, Нацыянальная акадэмія навук, Міністэрствы культуры, замежных спраў, адукацыі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

## СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ

Прадстаўнікі ўлады выходзяць на адкрыты дыялог. Па традыцыі ў суботу ва ўсіх рэгіёнах Беларусі пройдуць прамыя тэлефонныя лініі. Графік работы ранейшы — званкі ад грамадзян і юрыдычных асоб 12 лістапада будуць прымаць з 9 раніцы і да паўдня.

**Тэлефонныя лініі правядуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васілевіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня гарадскога Савета дэпутатаў ПАНАСЮК Васіль Васілевіч (80172224444).

■ Геапалітыка



# ЧЫСТАЯ ПЕРАМОГА

Дональд Трамп, які стаў Прэзідэнтам ЗША, уразіў свет — ён здолеў зрабіць гэта. Па ўсіх цвярозых разліках, ён павінен быў прайграць гэтыя выбары. Супраць яго мог спрацаваць дэмаграфічны фактар. Яго сутнасць у тым, што з кожным годам у ЗША белых выбаршчыкаў становіцца ўсё менш, а выбаршчыкаў «каляровых» — усё больш. Кожны год у Амерыку прыязджаюць мільёны і мільёны новых імігрантаў. Даволі хутка яны атрымліваюць грамадзянства і могуць галасаваць на выбарах. Пры гэтым «каляровае» насельніцтва ўстойліва падтрымлівае Дэмакратычную партыю і галасуе на прэзідэнцкіх выбарах за кандыдатаў ад дэмакратаў. Напрыклад, 70—80 працэнтаў лацінаамерыканцаў — найбольш шматлікай групы «каляровага» насельніцтва ЗША — галасуюць толькі за кандыдата ад Дэмакратычнай партыі. Супраць Трампа таксама выступіў істэблішмент Амерыкі, які раздражнёна пырхаў кожны раз, калі ён, асабліва не цырымонячыся, пачынаў «выносіць смецце з хаты». А гэта ў ЗША галоўная сіла. Нават сродкаў на правядзенне кампаніі Хілары Клінтан сабрала значна больш за свайго канкурэнта.

Здавалася, што моц амерыканскай сістэмы, якая аб'яднала большасць прадстаўнікоў эліты, не зможа быць пераадолена бунтаром супраць яе. Дональд Трамп здолеў зрабіць гэта. Лагічнае пытанне: як у яго гэта атрымалася?

Ствараецца яснае ўражанне, што яговыя праціўнікі проста недаацанілі сітуацыю. Узяць,



напрыклад, вынікі сацыялагічных апытанняў, пераважная большасць з якіх праводзілася і была абнародавана сапернікамі Трампа. Пастаянныя запэўніванні ў тым, што Хілары Клінтан нашмат апярэджвае свайго канкурэнта, сыгралі для яе фатальную ролю. Прыхільнікі Клінтан, упэўненыя ў яе гарантаванай перамозе, расслабіліся, і адным з фактараў перамогі Трампа стала тое, што многія з іх проста не прыйшлі прагаласаваць. У сваю чаргу прыхільнікі Трампа, напалоханыя прагнозамі, па якіх ён гарантавана прайграе, паспрабавалі пераламаць сітуацыю: яны масава прыйшлі і прагаласавалі. Гэта не першыя выбары, прайграныя з-за таго, што каманда відавочнага фаварыта і яго прыхільнікі празмерна расслабіліся і зрабілі няправільныя крокі. І не апошнія.

Наступнай памылкай стала занадта «брудная» вядзенне кампаніі супраць Трампа. За нейкія некалькі тыдняў раптам адразу 12 жанчын прад'явілі абвінавачванні Трампу ў непрыстойных паводзінах. І звычайнаму амерыканскаму выбаршчыку стала ясна, што Трамп, відома, не анёл, але гэта ўжо занадта. Таму што калі гэта праўда, а не чорны піяр-ход, то дзе ж у папярэднія гады ўсе гэтыя абураныя паводзінамі Трампа жанчыны былі і чаму ніколькі не імкнуліся агучыць свае абвінавачванні?

Перамога Трампа сігналізуе пра многае. У тым ліку пра тое, што ў ЗША сапраўды назапасілася шмат праблем, якія дамінуючы тыпаж палітыкаў аказаўся няздольным вырашыць. Нягледзячы на відавочныя праблемы, нормай жыцця для паспяховага палітыка сталі саладжавыя ўсмешкі, імкненне на словах усім дагадзіць і нікога не пакрыўдзіць, нежаданне абмяркоўваць у адкрытую вострыя сітуацыі. Паліткарэктнасці стала занадта шмат для Амерыкі, яна лепш падыходзіць Еўрасаюзу з больш выпешчаным і інтэлектуальным выбаршчыкам, чым краіне, у якой насельніцтва працуе больш і ніколі само сябе занадта рафінаваным не лічыла. Дзіўна, але мільярдэр, які рэжа праўду-матку пра вострыя праблемы, падаўся амерыканцам, якія часта не абцяжараны лішнімі грашыма, больш сваім, чым больш бедная ў параўнанні з Трампам Клінтан.

Моцным бокам Трампа стаў адыход ад звыклых стэрэатыпаў, у адпаведнасці з якімі кандыдат ад дэмакратаў павінен прытрымлівацца праграмы Дэмакратычнай партыі, а кандыдат ад рэспубліканцаў — праграмы Рэспубліканскай партыі. Праграма Трампа змешаная — у ёй ёсць свае прывабныя бакі і для тых, і для іншых. Для самога Трампа гэта ператварылася ў масу праблем на стадыі вылучэння і праймерыз, калі вядомыя члены Рэспубліканскай партыі адмаўлялі яму ў падтрымцы з-за негатоўнасці адмовіцца ад прывычнай для іх ідэалогіі.

Адыграла сваю ролю і экстравагантнасць Трампа. Удасканаленыя ім за доўгі час працы тэлевядучым шоу прыёмы заваявалі сэрцы выбаршчыкаў там, дзе не змаглі заваяваць іх розум. Па статыстыцы, Трамп з разгромным лікам прайграў усе тэледэбаты Хілары Клінтан. Хілары была больш пераканаўчай і рацыянальнай. Але Трамп здолеў спадабацца амерыканцам, а выбаршчык часта галасуе не на карысць больш рацыянальнага і дасведчанага палітыка, а больш шчырага. Так было ў свой час з перамогай Рональда Рэйгана, акцёра, які пераканаўча выканаў ролю кандыдата ў прэзідэнты і стаў адным з самых вядомых прэзідэнтаў ЗША. Дональд Трамп пачаў падобным чынам, і ў яго ёсць шанц падобным чынам працягнуць.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Прамая лінія

# Страхавы стаж дае права на працоўную пенсію, агульны — уплывае на яе памер

**Трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю і не ведаеце, куды звярнуцца? Хочаце даведацца, ці маеце права на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу? А можа, ёсць пытанне наконт дзіцячых дапамог? На гэтыя і іншыя пытанні нашым чытачам давала адказы старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ падчас «прамой лініі», якая адбылася ў рэдакцыі «Звязды» ўчора.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Добры дзень. Мяне завуць Таццяна, я з Мінска тэлефаную. Жанна Аляксандраўна, скажыце, калі ласка, што такое страхавы стаж і якія работы (віды дзейнасці) уключаюцца ў яго?***

— Страхавы стаж — гэта перыяды работы, прадпрымальніцкай, творчай і іншай дзейнасці, на працягу якіх ажыццяўлялася выплата абавязковых страхавых унёскаў.

Наогул, у заканадаўстве ёсць два паняцці — страхавы і агульны стаж. Першы дае права на працоўную пенсію, другі — уплывае на яе памер. Падчас вучобы на дзённых аддзяленнях навучальных устаноў, ваеннай службы, догляду дзяцей да трох гадоў страхавыя адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва не робіцца. Адпаведна гэтыя перыяды не ўваходзяць у страхавы стаж. Але ў агульны стаж, які ўплывае на памер пенсіі, яны залічваюцца.

Не ўключаюцца ў страхавы стаж таксама перыяды догляду інваліда I групы або састарэлага, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту і мае патрэбу (па заключэнні МРЭК (урачэбна-кансультацыйнай камісіі) або дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя) ў пастаянным доглядзе, а таксама перыяды догляду дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Не залічваецца ў яго і перыяд атрымання дапамогі па беспрацоўі.

Такім чынам, каб мець права на атрыманне працоўнай пенсіі ў 2016 годзе, трэба, каб у вас было 15 гадоў і 6 месяцаў страхавога стажу. А пачынаючы з 1 студзеня 2017 года працягласць страхавога стажу будзе штогод павялічвацца на паўгода — пакуль не дасягне 20 гадоў. Такім чынам, у 2017 годзе працоўныя пенсіі па ўзросце і за выслугу гадоў будуць прызначацца пры наяўнасці страхавога стажу 16 гадоў, у 2018-м — 16 гадоў і 6 месяцаў і г.д.

***— А як можна пацвердзіць свой страхавы стаж? І якім чынам яго пацвердзіць пры адсутнасці дакументаў аб працы?***

— Справа ў тым, што ўмова выплаты абавязковых страхавых унёскаў прымяняецца ў дачыненні да перыядаў работы пасля 01.07.1998 года. Дакументальна пацверджаныя перыяды работы (перш за ўсё з дапамогай працоўнай кніжкі), якія мелі месца да 01.07.1998 года, уключаюцца ў стаж, у тым ліку і ў страхавы, без дадатковага пацвярджэння факта выплаты абавязковых страхавых унёскаў.

Пры гэтым варта мець на ўвазе, што перыяды работы з 01.07.1998 года да 01.01.2003 года павінны пацвярджацца яшчэ і даведкай аб перыядзе выплаты абавязковых страхавых унёскаў і аб суме заработнай платы (даходу), з якой гэтыя ўнёскі выплачаны, якая выдаецца работадаўцам. Пасля 01.01.2003 года — дастатковa звестак індывідуальнага (персаніфікаванага) уліку, якія атрымліваюць органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва.

Такім чынам, для ўключэння ў працоўны стаж перыяду работы, што мела месца пасля 01.07.1998 года, недастаткова прад'явіць працоўную кніжку з запісам аб прыёме і звальненні. Неабходна пацвердзіць, што ў перыяд работы вы падлягалі дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню і за вас плаціліся страхавыя ўнёскі.

Пры гэтым мае значэнне не толькі факт выплаты абавязковых страхавых узносаў, але і памер заробку, з якога яны выплачваліся. Для ўключэння ў стаж у поўным аб'ёме тых ці іншых перыядаў работы ўнёскі павінны быць выплачаны з даходу, які перавышае мінімальна дапушчальны ўзровень аплаты працы. Іншымі словамі, памер заробку не павінен быць ніжэйшым за мінімальную заработную плату. У адваротным выпадку ў стаж для прызначэння пенсіі залічваецца перыяд, вызначаны з прымяненнем паправачнага каэфіцыента.

Калі ж дакументы аб рабоце адсутнічаюць і няма магчымасці іх атрымаць, бо работадавец спыніў сваю дзейнасць і дакументы ў архіўныя ўстановы на захоўванне не здадзены, перыяды работы могуць быць устаноўлены камісіямі па прызначэнні пенсій, якія ўтвараюцца раёнными (гарадскімі) выканаўчымі і распарадчымі органамі на падставе паказанняў не менш за двух сведак, якія ведаюць вас па сумеснай рабоце ў арганізацыі або ў індывідуальнага прадпрымальніка і маюць дакументы, што пацвярджаюць іх працу за ўвесь час, у дачыненні да якога яны сведчаць.

***— Дзякуй за падрабязны адказ!***

*(Працяг «Прамой лініі» чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў «Звязды».)*

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■ Падпіска-2016

## Сустрэнемся на гасціннай Случчыне!

*Паводле прагнозаў сіноптыкаў, сёлетні лістапад халаднейшы за кліматычную норму. Але гэтыя абставіны ніколькі не змяншаюць цеплыню нашых сустрэч з чытачамі «Звязды». Мы ўжо пабылі ў Мінскім раёне, а сёння звяздоўцы працуюць на Карэліччыне. Паўсюль сустракаем людзей, якім даспадобы наша газета, здольных нават і тэмы для далейшай журналісцкай распрацоўкі падказаць. Такія паездкі ўжо сталі добрай традыцыяй.*

*Наступны пункт прызначэння доўга вызначаць не прыйшлося. Ужо заўтра мы завітаем на працавітую, гасцінную, багатую на людзей і гістарычныя падзеі Случчыну (усім вядомыя слуцкія паясы — сапраўдны брэнд Беларусі — дасюль ткуць менавіта тут!). Гэта мясціны, дзе «Звязду» любяць і чакаюць, што, дарэчы, чарговы раз пацвердзіла падпіска на чацвёрты квартал. Спадзяёмся, што такі высокі тэмп случане будуць трымаць і надалей, бо ведаем: у Слуцку насамрэч усё па-людску.*

*Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца на Слуцкім раённым вузле паштовай сувязі 11 лістапада з 10 да 13 гадзін (калі будзе шмат ахвотных — затрымаемся і болей!). Усіх, хто аформіць падпіску, чакаюць адметныя звяздоўскія сувеніры на добрую памяць. Абавязкова завітайце — даўно не бачыліся!*

# ШЭПТЫ І КРЫКІ «ЛІСТАПАДА»

Навіны з кіназалы

**Ідуць апошнія дні Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», і набліжаецца цырымонія закрыцця. Яна адбудзецца заўтра ў кінатэатры «Масква». А ў гэты час журы ўжо назвала пераможцаў конкурсу нацыянальных кінашкол і конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік».**

Кіно на час фестывалю заняло ў нашым жыцці ўвесь эфір. З раніцы да вечара мы глядзім фільмы розных праграм «Лістапада», горача абмяркоўваем апраўданасць драматургічных ходаў і дысцыплінавана прытрымліваемся дэвіза сёлетняга форуму «Насустрач натхненню».

Журы конкурсу нацыянальных кінашкол вырашыла аддаць прыз «За найлепшы фільм конкурсу маладога дакументальнага кіно» ізраільскай карціне «Мой сябар, Яніў» Мааяна Шварца. Беларуская карціна «Паспець пачуць цішыню» Ягора Бякава атрымала дыплом «За здольнасць аўтара стварыць і падтрымліваць асаблівую атмасферу фільма», а расійская стужка «Агонь» Надзеі Захаравай узяла дыплом «За найлепшую аператарскую работу». Украінскі фільм «Дом» Ганны Корж адзначаны дыпломам «За асаблівага пратаганіста і здольнасць рэжысёра паказаць яго гісторыю». І, нарэшце, дыплом «За творчы падыход і развіццё формаў расповеду гісторыі» дастаўся Міжнароднай кінашколе «Doc nomads».

Сваю работу таксама завяршыла журы «Лістападзіка». Яно зрабіла стаўку на стужкі для юнацтва. Прыз «За найлепшы фільм" адышоў французскай карціне «Мікроб і бензін» Мішэля Гондры — рэжысёра, што зняў у нейкім сэнсе культавую карціну "Вечнае зззянне чыстага розуму" з Джымам Кэры і Кейт Уінслет у галоўных ролях. Дарэчы, фільм «Мікроб і бензін» можна глядзець па дасягненні сямнаццаці гадоў — конкурс «Лістападзік» і яго вынікі паказваюць, як трансфармуецца сучаснае дзіцячае кіно, якое ў чыстым выглядзе сябе ўжо зжыло.

Прыз «Найлепшая дзіцячая роля» адышоў нямецкаму фільму «Прыгоды Нэлі» Дамініка Весэлі, а «Найлепшая работа дарослага акцёра ў дзіцячым фільме» — Джордану Прэнцісу, што сыграў у карціне «На ўзроўні вачэй», — яна ж атрымала Спецыяльны прыз журы. Апроч гэтага былі размеркаваны «Залаты Лістападзік» і некалькі дыпломаў.

Вынікі асноўных конкурсаў ігравога і дакументальнага кіно, «Маладосці на маршы» і Нацыянальнага конкурсу будуць агучаны заўтра, падчас цырымоніі закрыцця. Дарэчы, паказы работ Конкурсу беларускага кіно праходзяць з самымі актыўнымі дыскусіямі. Відавочна, таму, у першую чаргу, што самі аўтары прадстаўляюць свае карціны, але, напэўна, прычына хаваецца і ў блізкасці інтарэсаў беларускіх аўтараў і мясцовай публікі.

Фестывальная насычанасць прыйдзе да свайго лагічнага завяршэння — наступіць час аналітыкі і рэфлексіі. Агляды праграм, рэцэнзіі, інтэрв'ю чытайце на старонках «Звязды» ў бліжэйшыя дні.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Партнёры

# АПОРНЫЯ ПУНКТЫ НА ШАЎКОВЫМ ШЛЯХУ

## Выстава тавараў Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна Кітая адкрылася ў сталіцы

**У ёй прымаюць удзел больш за 40 прадпрыемстваў рэгіёна. Прадстаўлены такія галіны вытворчасці, як сельская гаспадарка, харчовая прамысловасць, тавары народнага спажывання, машынабудаванне, прыборабудаванне, электроніка, інфармацыйныя тэхналогіі, горназдабываючая прамысловасць, будаўніцтва, супрацьпажарныя распрацоўкі...**

Мерапрыемства арганізавана ў рамках Праграмы развіцця стратэгічнага партнёрства нашай краіны і Кітая на 2014-2018 гады.

— Пэўны час назад мы ўдзельнічалі ў якасці ганаровага госця на выставе «Кітай — Еўразія» ў горадзе Урумчы, сталіцы Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна, — звярнуў увагу **Аляксандр ЯРАШЭНКА, намеснік міністра эканомікі нашай краіны.** — Мы тады дамовіліся пра тое, што нашы кантакты, у тым ліку ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, будуць працягвацца. Сённяшняя выстава — працяг узаемадзеяння з гэтым кітайскім рэгіёнам.

Сіньцзян-Уйгурскі аўтаномны раён Кітая — дастаткова вялікі. Ён займае шостую частку ўсёй тэрыторыі краіны.

— І кітайскім бокам, і намі ён разглядаецца як адна з вузлавых платформ эканамічнага пояса Шаўковага шляху, — адзначыў Аляксандр Ярашэнка. — Наш кітайска-беларускі індустрыяльны парк таксама павінен стаць такой платформай. Злучыць два гэтыя пункты і прызвана цяперашняя выстава.

**Вячаслаў БРЫЛЬ, намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты,** падкрэсліў, што на выставе прадстаўлены амаль усе кірунікі эканомікі Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна.

— На выставе ва Урумчы былі дасягнуты пэўныя дамоўленасці, думаю, тут мы працягнем наладжваць кантакты паміж бізнесам і Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі, — сказаў ён.

— Мы вельмі рады наведаць Беларусь і паўдзельнічаць у гэтай выставе, — **прызнаўся Хэ Імін, начальнік дэпартамента камерцыі Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна.** Ужо другі раз арганізавана такая паездка ў вашу краіну. У дэлегацыю ўключана больш за 60 чалавек з больш чым 40 прадпрыемстваў. У Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне вялікая ўвага ўдзяляецца развіццю супрацоўніцтва з Беларуссю. Паміж намі наладжаны вельмі цесныя сувязі.

Выстава будзе доўжыцца да 11 лістапада. Ад сябе заўважу, што наведаць яе будзе цікава не толькі бізнесменам, але і звычайным гараджанам: можна пакаштаваць кітайскія стравы, набыць тавары лёгкай прамысловасці.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## Не размаўляйце на пуцях па мабільніку!

**Беларуская чыгунка падвяла вынікі акцыі «Дзеці і бяспека»**

Работнікамі ваенізаванай аховы магістралі было арганізавана 189 рэйдаў, падчас якіх да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты больш за 80 чалавек за праход па чыгуначных пуцях у недазволеным месцы, спагнаныя штрафы на суму больш за 340 рублёў. Выяўлены і выведзены ў бяспечныя месцы 36 непаўналетніх, якія знаходзіліся на аб'ектах чыгункі без суправаджэння бацькоў ці дарослых. З 15 непаўналетнімі, якія знаходзіліся на чыгуначных пуцях у навушніках і размаўлялі па мабільным тэлефоне, праведзены прафілактычныя гутаркі. З зоны павышанай небяспекі выдалены 24 чалавекі, якія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДРОБНЫМ ШРЫФТАМ ЧЫТАЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Унікальнасць механізма заключаецца ў тым, што ўладальнік карткі сам вызначае «любімыя аб'екты» (ежа, спорт, вандроўкі і г.д.), з якіх будзе вяртацца 2% ад сумы транзакцый, тады як з усіх астатніх — 1%. Выбраныя катэгорыі можна перыядычна змяняць. Далей удакладняецца, што перавод грошай на бягучы карт-рахунак можна зрабіць праз АРІП або наяўнымі праз інфакіёск. За такі перавод сумай да 3 тысяч рублёў у месяц камісія спаганяцца не будзе. «Цудоўны «пластык», — падумаў я і паехаў за ім у банк.

Праўда, вырашыў удакладніць некалькі нюансаў непасрэдна на месцы. І вось... Картку мне дадуць і сапраўды бясплатна, але пры ўмове, што адначасова з афармленнем я пакладу на рахунак у банку амаль палову свайго заробку і пачну хуценька гэтыя грошы траціць. А як хуценька трэба? Менавіта ад гэтага і залежыць рэальны кошт гэтай карткі. Калі чалавек за месяц купляе ў крамах тавараў на суму больш за 300 рублёў (камунальныя плацяжы, сотавы апаратар, крэдыты і іншыя плацяжы праз АРІП не ўлічваюцца), то ён прызнаецца банкам актыўным кліентам і за карыстанне карткай 1,9 рубля ў месяц не плаціць. А калі ты патраціш карткай меншую суму, то банк аўтаматычна спіша з рахунку гэтыя 19 тысяч старымі. Атрымліваецца, што для эканомных кліентаў гэты «пластык» ужо не бясплатны.

З папаўненнем рахунку нашай прэміум-карткі таксама ўзніклі цяжкасці, бо праз АРІП з маёй зарплатнай карткі другога банка за такі перавод здымуць камісію. А вось зрабіць перавод наяўнымі без камісіі можна толькі праз спецыяльны інфакіёск гэтага камерцыйнага банка, якіх нават у Мінску няшмат. І яшчэ. Паслуга СМС-апавяшчэння па гэтай картцы будзе каштаваць яе ўладальніку 2 рублі ў месяц. Гэта пры тым, што сярэдні цэннік такой паслугі на фінансавым рынку складае ад 60 капеек да рубля.

Вось так. Такія важкія плюсы з павялічаным кэшбэкам амаль цалкам зніклі пасля таго, як я даведаўся аб усіх іншых нюансах гэтай карткі. І гэта яшчэ не ўсё. Спецыяліст банка паведаміла мне, што тарыф за карыстанне «элітнай» карткай у памеры 1,9 рубля лічыцца льготным і дзейнічае толькі паўгода. А які яго памер будзе потым, яна не ведае.

## Заўважыць паметку

Часам пэўныя гандлёвыя сеткі, буйныя крамы і сур'ёзныя кампаніі распрацоўваюць для спажыўцоў спецыяльныя прапановы, калі тавар можна набыць у крэдыт, працэнтная стаўка па якім складае амаль 0%. І гэта без першапачатковага ўзносу. Ствараецца нейкі рай для пакупнікоў? Але гэта не зусім так.

Так, стаўкі па крэдыце бываюць і сапраўды невялікія, але такія крэдыты выдаюцца на маленькі тэрмін (да трох месяцаў) і абавязкова на пэўны (звычайна дарагі) асартымент тавару. Перад тым, як рашыцца на такія ўмовы, трэба даведацца, колькі аналагічны тавар каштуе ў канкурэнтаў. Магчыма, што магазін прапануе вам тэхніку гэтай мадыфікацыі па павышанай цане, бо яму неабходна яшчэ разлічыцца з банкам, які крэдытуе пакупку.

Цяпер наконт заявы аб тым, што любая пакупка ў дадзенай гандлёвай сетцы ажыццяўляецца ў крэдыт пад нулявы працэнт. Такая лічба сапраўды ёсць, але побач з ёй стаіць паметачка, маленькая такая зорачка, якая недзе там унізе расшыфроўвае, што льготны перыяд беспрацэнтнага крэдыту складае ўсяго 15 дзён (бывае нават 30). Якім стане потым гэты крэдыт для карыстальніка — у рэкламе не гаворыцца. Непасрэдна ў гандлёвым пункце кліенту растлумачаць, што на афармленне крэдыту работніку банка спатрэбіцца ваш пашпарт, даведка аб заробках (часам і без даведкі) і гадзіна часу. Усё, праз гадзіну вы ўжо ўладальнік тэлевізара, халадзільніка, камп'ютара, мэблі ці яшчэ чаго-небудзь. І грошы сёння ў вас ніхто не патрабуе. Так, пачнецe нешта там плаціць праз два тыдні.

А мы вырашылі ўдакладніць канкрэтныя ўмовы нельготнага перыяду такога крэдыту. Аказалася, што не вельмі ён і цудоўны. Стаўка па ім звычайна складае ад 36% да 40% гадавых. Цікава, але ў сістэмных дзяржаўных банках крэдыты пад спажывецкія патрэбы выдаюць кліентам пад 24% — 27%. Зразумела, што на агульных падставах для атрымання такога крэдыту кліенту неабходна будзе прынесці ў банк не толькі пашпарт і даведку аб заробках, але і прывесці ў аддзяленне некалькіх паручыцеляў або аформіць залог.

**Імпульсіўнае рашэнне аб набыцці тавару ў крэдыт непасрэдна ў магазіне можа каштаваць новаму ўладальніку сур'ёзных дадатковых выдаткаў.**

Згодзен, што апошні варыянт патрабуе больш часу, але... Імпульсіўнае рашэнне аб набыцці тавару ў крэдыт непасрэдна ў магазіне можа каштаваць новаму ўладальніку сур'ёзных дадатковых выдаткаў.

## Кошт вады

Ёсць у мяне пытанне і да рыбы, дакладней — да філе рыбы, якое прадаецца ў воднай глазуры. Гэтая вада ацэньваецца звычайна ў працэнтах да ўсёй масы прадукту. Бывае ад 5% да 40% і нават да 50%. Напрыклад, мае знаёмыя выбіраюць філе, дзе вады да 10%. Выбіраюць аднатыповую рыбу з аднолькавай доляй вады і шукаюць таннейшую ў розных крамах. Усё зразумела. Але, ёсць «фінт» ад вытворцаў, калі на этыкетцы паказваецца не доля глазуры, а адразу дзве лічбы: агульная маса тавару і вага аснойнага прадукту. Звычайна фокус з дзвюма лічбамі выкарыстоўваецца ў тым выпадку, калі доля вады і сапраўды зашкальвае, але бываюць і выключэнні. А як можна дакладна падлічыць гэтую долю непасрэдна ў краме? Гэтыя пытанні пакуль застаюцца адкрытымі.

## Растэрміноўка без пераплаты?

Гэта яшчэ адзін фокус заваблівання кліентаў. Яго звычайна выкарыстоўваюць у цэнтрах продажу мабільных апаратараў. Пад такую растэрміноўку на 6 месяцаў і без пераплаты там выстаўлены дарагія смартфоны. І моладзь клюе на такую прапанову, бо расцягнуць аплату «мабілы» коштам у 400—600 рублёў на паўгоддзе і нічога за гэта не дапліціць — гэта ўдача. А можа нешта іншае?

Мы з дачкой спецыяльна гэтую тэму «пад лупай» разглядалі. Аказалася, што аналагічны гаджэт у суседнім цэнтры нашага мабільнага апаратара каштуе ўжо значна танней пры ўмове, калі мы за яго аплачваем усю суму адразу. Калі пакупнік адмаўляецца набываць тавар у растэрміноўку, то ён атрымлівае зніжку. Стварэцца ўраженне, што ў абодвух гэтых выпадках прадавец ідзе нам насустрач.

На самай справе памер пераплаты растэрміноўкі ў першым выпадку будзе роўны зніжцы, якую прапануюць у другім цэнтры ў межах аднаго мабільнага апаратара. У адным выпадку нам проста прапануюць купіць смартфон па нармальнай цане, а ў другім (у растэрміноўку) — ужо даражэй. Няўжо нас падманваюць, бо прапануюць схему, якая блытае пакупніка? Не, адказваюць нам прадстаўнікі гандлю, гэта такі маркетынгавы ход, бязвінная хітрасць, магчыма, невялікі псіхалагічны трук. А за гэта ў нас сёння не караюць. Пакуль не караюць, удакладняюць у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю...

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

# ВЯСЁЛКА ЯКАСЦІ НАД ЛІДАЙ

## З журналістамі «Звязды» гутарыць дырэктар Лідскага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Мікалай ВАСІЛЕЎСКІ

**Прадстаўляем суразмоўцу.**

**Родам з вёскі Дакудава Лідскага раёна. Цікавасць да прыбораў і наогул тэхнікі была з дзяцінства, і шлях у прафесію пачынаў з вучобы ў Гродзенскім прафесійным вучылішчы, дзе рыхтавалі метролагаў. Размеркаванне атрымаў на Лідскі лакафарбавы завод. Прафесія спадабалася, дазваляла падыходзіць да сваіх абавязкаў творча, і за кароткі тэрмін малады спецыяліст унёс каля трыццаці рацыяналізатарскіх прапаноў. Некаторыя актуальныя і цяпер. Пасля службы ў арміі скончыў адзіны на той час у Саюзе профільны тэхнікум у Адэсе. Вышэйшую адукацыю па метралогіі атрымаў у Ленінградскім політэхнічным інстытуце ўжо пазней, падчас работы ў Лідскім ЦСМС. Бо з завода маладога спецыяліста запрасілі сюды начальнікам аддзела. Рост па прыступках службовай лесвіцы лагічна завяршыўся прызначэннем на пасаду дырэктара, на якой Мікалай Іванавіч па-ранейшаму дэманструе ўсё той жа творчы падыход.**



***— Мікалай Іванавіч, сёння мы падрабязна расказваем на старонках газеты пра лідскі завод гарачага цынкавання «Конус». Якія яшчэ прадпрыемствы вашага рэгіёна можна адзначыць за пастаянную работу над якасцю?***

— Можна сказаць добрае слова пра сумеснае беларуска-польскае прадпрыемства СТАА «Бел-Пласт Інтэрнэшнл», што выпускае якасную ўпакоўку. Тут пастаянна ўдасканальваюць сваю работу і змяншаюць затраты. Украняюць самыя навейшыя тэхналогіі, таму прадукцыя становіцца больш якаснай і таннай. Кіраўнік прадпрыемства ўзнагароджаны знакам «Лідар якасці». А прадпрыемства сабрала, лічыце, усе ўзнагароды краін СНД за якасць.

Грыміць па-ранейшаму ААТ «Лідскае піва», нарошчвае абароты. Вядзецца прэвентыўная мадэрнізацыя вытворчасці. ААТ «Лідская мука»: яго мука сапраўды нумар адзін, прадаецца «на раз».

ААТ «Лакафарба» зараз вельмі папулярная за кошт фталевага ангідрыду (гэта сыравіна для вытворчасці лакаў). Зараз тут будуюць другую чаргу адпаведнага цэха, бо прадукцыя нарасхват.

Сумеснае прадпрыемства «Белтэксоптык» выпускае дабротную аптычную тэхніку, больш за 90 працэнтаў яе ідзе на экспарт. У прадпрыемства цудоўны сацыяльны пакет.

Варта нагадаць ААТ «Лідаграпраммаш» (цяпер — філіял завода «Лідсельмаш»). Яго збожжаўборачныя камбайны «Ліда 1300», выпуск якіх у свой час быў наладжаны сумесна з славутай фірмай «Кейс» (а цяпер гэта ўжо «Ліда 1600»), а таксама сеялкі і іншая сельскагаспадарчая тэхніка экспартуюцца ў Расію, Казахстан, Польшчу, Італію, Іран. А гэта найлепшае сведчанне якасці.

Альбо возьмем Мінойтаўскі рамонтны завод. Раней наглядаўся некаторы спад, цяпер усё выраўнялася. Прадукцыя ідзе ў Расію, Грузію, ва Украіну. Экспарт набірае абароты, зараз удзельная вага экспартных паставак — 39,9 працэнта.

***— Давайце пагаворым пра ўдзел вашага калектыву ва ўсёй гэтай надзвычай важнай рабоце, асабліва ва ўмовах нарошчвання экспарту.***

— Урад устанаўлівае пералік прадукцыі, якую павінен праверыць трэці бок, у асноўным на бяспечнасць. Трэці бок — гэта найчасцей мы. Праўда, зараз пералік прадукцыі, якія мы павінны сертыфікаваць, зменшыўся, бо адначасова з практыкай сертыфікацыі з'явілася дэкларацыя. Гэта калі кіраўнік прадпрыемства дэкларуе належную якасць сваёй прадукцыі ўласным дакументам, грунтуючыся на пратаколах праведзеных акрэдытаванымі органамі Дзяржстандарту выпрабаванняў. І гэтага як бы дастаткова для паспяховага прасоўвання тавару на рынку. А ў лістападзе распачалася практыка электроннага дэкларавання, калі прадпрыемства выконвае гэтую працэдуру на сваю рызыку, абыходзячы органы стандартызацыі. Ступень яго адказнасці ўзрастае.

Тым не менш работы нашым службам хапае. Па-ранейшаму сертыфікуем паслугі. Хоць яны цяпер не падлягаюць абавязковай сертыфікацыі, многія прадпрыемствы бытавога абслугоўвання працягваюць сертыфікаваць свае паслугі добраахвотна, бо такая сусветная практыка.

Вядзецца сертыфікацыя сістэм менеджменту якасці. Сёння мы маем справу з трэцяй версіяй сістэмы менеджменту якасці, якая грунтуецца на фундаменце першых дзвюх і патрабуе ў дадатак да ўсяго ўлічваць існуючыя рызыкі і напрацаваць мерапрыемствы для пагашэння такіх рызык, форс-мажорных абставін. А форс-мажору хапае — гэта і хістанні долара, і хістанні цаны на нафту, і складанасці ў міжнароднай сітуацыі... Вось зараз з гэтымі рызыкамі і працуем у першую чаргу. Бо любая вытворчасць павінна быць ад іх абаронена.

Мы за ўвесь час сертыфікавалі 59 прадпрыемстваў сваёй зоны на адпаведнасць дзеючых там сістэм менеджменту якасці міжнародным стандартам, а зараз пастаянна іх вучым, як прадбачыць магчымасць з'яўлення рызык, каб звесці да мінімуму непажаданыя наступствы. І дапамагаем перайсці на новую версію стандартаў ISO.

***— І што ў выніку? Наколькі шырока ўкаранёна сістэма менеджменту якасці ў сямі раёнах вашай зоны абслугоўвання?***

— Сістэма дзейнічае на ўсіх асноўных, буйных прадпрыемствах зоны абслугоўвання. І на тых, якія не надта на слыху, — на «Белкофе» ў Ашмянах, на «Ліор-Пластыку» — а гэта перапрацоўка рыбы ў Навагрудку, у шэрагу раённых арганізацый «Сельгастэхнікі», на Смаргонскім хлебазаводзе, на швейнай фабрыцы ў Навагрудку «Белкрэда», у Смаргонскім райпа, будаўнічых арганізацыях — пералік вялікі.

Некалькі прадпрыемстваў сертыфікаваны на НАССР. З распрацоўкай і ўкараненнем менавіта гэтых сістэм кіравання бяспечнасцю харчовых прадуктаў крыху складаней, бо патрабуецца вялікая мадэрнізацыя прадпрыемства, перш за ўсё забеспячэнне высокай культуры вытворчасці, захаванне санітарных нормаў, ледзьве не суцэльная герметызацыя прадпрыемства.

Не ўсюды пакуль можна дабіцца такой стэрыльнасці. Але за аналізам рызык і крытычных кропак харчовай вытворчасці — будучае, і ў гэтым кірунку трэба працаваць. У Лідзе НАССР пакуль атрымалі 9 прадпрыемстваў, пяць з іх — з нашым удзелам і дапамогай.

***— Мікалай Іванавіч, лозунг «Купляйце беларускае» па-ранейшаму актуальны ці ён зняты з павесткі дня?***

— Лічу яго актуальным. Тым больш што бясконцыя гандлёвыя войны перашкаджаюць нармальнаму экспарту нашых тавараў у бліжняе замежжа. Айчынныя вытворцы склалі там моцную канкурэнцыю мясцовым таваравытворцам, адсюль гэтыя нічым не падмацаваныя прыдзіркі. Брэнд «Беларускае» настолькі папулярны, што ім карыстаюцца нават для падману пакупніка. Часта фальсіфікаваную прадукцыю — такую, як сыры, масла, сухое малако, рэалізуюць пад маркай нашых беларускіх вытворцаў.

***— Што новага за апошнія гады з'явілася ў рабоце лідскага цэнтра?***

— Узялі больш выразны курс на абарону экалогіі. У свеце экалагічныя ўмовы пагаршаюцца — расце колькасць шкодных выкідаў, азонавы слой змяншаецца, прадукцыйнасць зямлі таксама, плюс парніковы эфект, і расце колькасць адходаў жыццядзейнасці чалавека. Сапраўдны галаўны боль любой дзяржавы. А значыць, і наш.

Мы пайшлі на арганізацыйныя меры — стварылі ў сябе новы аддзел, які займаецца інвентарызацыяй крыніц шкодных выкідаў, шумаў, выхлапаў, прамысловых сцёкаў. Тут ёсць дзе прыкласці намаганні, веды. Напрацоўваем вопыт, які спатрэбіцца ўсім. У ліку актуальных задач — распрацоўка тэхналагічных дакументаў і інструкцый па ўтылізацыі тых жа адходаў, распрацоўка праектаў санітарна-ахоўнай зоны прадпрыемстваў.

Трывожыць, што ў рэальным сектары скарачаюць службы стандартызацыі, метралогіі. А парк абсталявання, за якім патрэбен кантроль, расце.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**



Паверка нівеліраў і тэадалітаў даручана вопытнаму інжынеру-метролагу Валянціне Шкутавай.

Фота Ягены ПЯСЕЦКАЙ.



# Я ЗАНЯТЫ

Тралейбус... «Ба, я заняты, кажы хутчэй, што ты хацела», — злуецца ў слухаўку (пэўна, на сваю бабулю) малады чалавек з дрэдамі і праз секунду зноў утаропліваецца ў свой планшэт. І такіх хлопцаў і дзяўчат, жанчын і мужчын я бачу практычна штодзень па дарозе на работу. «Я заняты» — хвароба сучасных людзей. Гэты вірус часам не абмінае і мяне: здараецца, адкладваю сустрэчы з блізкімі людзьмі на панядзелак, забываюся палюбавацца на зоркі...

«Гэта ж жудасна! Што ж у Вас за жыццё, калі няма часу нават паглядзець на Вялікую Мядзведзіцу», — дакорліва пазірае на мяне з манітора камп'ютара настаўнік Марын Мірою — галоўны герой фільма «Безыменная зорка».

І чамусьці адразу ўзгадваецца дыялог паміж лётчыкам і Маленькім прынцам:

— Я заняты сур'ёзнай справай.

— Ты размаўляеш, як дарослыя! Я ведаю адну планету, там жыве такі Пан з пунсовым тварам. Ён ніколі не нюхаў кветкі. Ні разочку не глянуў на зорку. Ён ніколі нікога не любіў. І ніколі нічога не рабіў. Ён заняты толькі адным: лічэннем. Цэлымі днямі напралёт ён, як ты, паўтарае адно і тое ж: «Я чалавек сур'ёзны! Я чалавек сур'ёзны!» І проста ледзь не лопаецца ад гордасці. Але гэта не чалавек, гэта — грыб!

...Бацька вярнуўся з працы позна, злы і стомлены. У дзвярах яго чакаў 5-гадовы сын:

— Тата, можна спытаць?

— Вядома, пытайся.

— Тата, колькі ты зарабляеш за гадзіну?

— Гэта цябе не тычыцца. А чаму ты, уласна, пытаешся?

— Мне проста трэба ведаць! Калі ласка, скажы: колькі ты зарабляеш за гадзіну?

— Ну, 20 долараў.

Малы апусціў галаву і прамармытаў:

— Ого... Тат, а ты не пазычыш мне 10 долараў?

Бацька разззлаваўся:

— Ты спытаў толькі таму, што хацеў грошай на цацкі, коміксы або іншыя бескарысныя глупствы! За гэта зараз жа пойдзеш у свой пакой і ляжаш спаць! І падумай пра тое, які ты эгаіст! Я кожны дзень з ранку да вечара працую, каб цябе карміць!..

Маленькі хлопчык пайшоў у свой пакой і зачыніў дзверы.

Бацька сеў на канапу, уключыў тэлевізар, але ніяк не мог супакоіцца — усё злаваўся на сына. Ды як той адважыўся задаць такое пытанне, толькі каб выпрасіць грошай?

Але праз гадзіну мужчына супакоіўся і задумаўся: можа, сыну сапраўды трэба купіць нешта за 10 долараў? У рэшце рэшт, ён рэдка просіць грошай. Бацька ўстаў, падышоў да пакоя сына і прыадчыніў дзверы.

— Ты спіш, сынок? — спытаў ён.

— Не, тат, не сплю, — адказаў хлопчык.

— Ты ведаеш, у мяне быў цяжкі дзень. Напэўна, таму я на цябе накрычаў. Ты прасіў 10 долараў — вось, трымай.

Хлопчык сеў на ложку і заўсміхаўся:

— Дзякуй, тата, вялікі дзякуй!

Затым хлопчык выцягнуў з-пад падушкі некалькі скамечаных купюр і павольна пералічыў іх. Бацька зразумеў, што ў сына ўжо былі грошы, і зноў раззлаваўся.

— Калі ў цябе былі грошы, — спытаў бацька, — то чаму ж ты прасіў яшчэ?

— Таму што ў мяне было мала, але зараз хопіць. Тата, глядзі: у мяне ёсць 20 долараў. Можна мне купіць гадзіну твайго часу? Калі ласка, прыходзь заўтра дадому крыху раней. Я вельмі хачу, каб ты з намі павячэраў...

«Той дзень, лічы, завянуў пустацветам,
Калі ты пяць хвілін пашкадаваў,
Каб дзецям паказаць куточак свету
І харaство людзей, і дрэў, і траў», — нагадвае нам Пімен Панчанка, але...

«Мне няма калі», — пастаянна кажам мы. Некалі патэлефанаваць, напісаць, пабачыцца з тым, хто чакае. Мы вечна занятыя, кудысьці спяшаемся. «Добра», — адказвае час і знікае... Часта назаўсёды.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск № 21 (64)

■ Тыя, хто побач

# Калі мама з татам — рок-зоркі

**Яшчэ гадоў дзесяць таму мы танцавалі пад іх саўндтрэкі на дыскатэках і выкрыквалі на памяць словы песень. Такімі яны і запомніліся: з доўгімі, моднымі на той час грыўкамі, электрагітарамі ў руках і кранальнымі для падлеткавай душы тэкстамі. А сёння — гэта адказныя бацькі і шчаслівыя муж і жонка. Міхаіл і Карына Накарашвілі адпаведна саліст і былы бас-гітарыст рок-гурта «NUTEKI», тата і маці двухгадовага Роберта і месячнай Бэлы. Яны гасцінна запрасілі «СГ» дадому на гарбату. А падчас таго, як па чарзе нянчылі немаўля, падзяліліся сакрэтамі штодзённага сямейнага шчасця і гісторыяй жыцця, пра якую можна было б напісаць кнігу...**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Добрая справа

# ШЧАСЛІВЫЯ ПЕЛЬМЕШКІ

## Гісторыя пра чулых людзей, якія выратоўваюць асаблівых жывёл

**«Для мяне няма нічога страшнага ў сляпых катах. Яны выдатна сябе адчуваюць і надзвычай добра вісяць на шторах», — усміхаецца Варвара КУЛАЕВА, заснавальнік групы падтрымкі асаблівых жывёл «Добры Леў». Яна разам з іншымі неабыякавымі людзьмі дапамагае тым, хто сустрэў ката- ці сабаку-інваліда і не змог прайсці міма. Разам з мужам яны ўжо выратавалі не адну такую жывёлу, а зараз выхоўваюць жыццярадаснага Льва, з якога ўсё і пачалося.**



— Два з паловай гады таму мы ўзялі ў сваю сям'ю часова пажыць сабаку Лёву, — расказвае Варвара. — Ён інвалід-спінальнік. У яго паралізаваная задняя частка цела. Тады мы разумелі, што інфармацыі вельмі мала, дапамогі прасіць практычна няма дзе. Ветэрынары з такімі жывёламі сутыкаліся вельмі рэдка, бо, як правіла, іх усыпляюць. У выніку мы з Лёвам прайшлі шмат выпрабаванняў. А потым вырашылі сваімі ведамі падзяліцца з іншымі.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

# «Адзін з найшчаслівейшых момантаў здарыўся ў 63 гады...»

## Людзі трэцяга ўзросту — пра свае захапленні і жыццёвую філасофію

**Карней Чукоўскі некалі напісаў у сваім дзённіку: «...Ніколі я не ведаў, што так радасна быць старым, што ні дзень — мае думкі становяцца ўсё дабрэйшыя і святлейшыя». Ці многія з ім пагодзяцца? Гэта ўжо залежыць ад чалавека. Бо на пенсіі, як і ў любым узросце, жыць можна па-рознаму. Хтосьці замкнуўся ў сабе і ўсё яму не мілае, а іншы вырашыў, што трэці ўзрост — час, калі можна і трэба атрымліваць асалоду і займацца тым, чым хочацца. Перад вамі — маналогі людзей, якія цяпер, на пенсіі, займаюцца ні многа ні мала — кіназдымкамі ў студыі дакументальнага кіно мінскага Універсітэта трэцяга ўзросту. Прачытаўшы іх, вы пераканаецеся, што самае моцнае шчасце магчымае не толькі ў юнацтве.**

## Афанасій Грынь, 82 гады: «ЧАЛАВЕК, КАЛІ ЁН АДЗІН, ЗГАСАЕ...»

Я ўжо скончыў двухгадовыя курсы журналістыкі ва Універсітэце трэцяга ўзросту, цяпер займаюся англійскай мовай, а яшчэ — рэжысурай і кіназдымкамі. З'яўляюся фотакарэспандэнтам у грамадскай арганізацыі ветэранаў падраздзяленняў асаблівай рызыкі. Да гэтага часу ваджу машыну, выязджаю на прыроду — у грыбы-ягады.

Галоўнае для чалавека ва ўзросце — гэта зносіны з людзьмі. Чалавек, калі ён адзін, згасае. І яму прыходзяць у галаву розныя благія думкі: што ён нікому не патрэбны, і навошта тады жыць? А ў нас ва Універсітэце людзі раскрываюцца. Дзеляцца сваім вопытам, многія пішуць вершы, якія выходзяць потым у нашым бюлетэні...

Яшчэ вельмі важна здароўе. У яго трэба ўкладвацца пачынаючы з дзяцінства. Усё сваё свядомае жыццё я займаюся спортам. Гімнастыка, цяжкая атлетыка, плаванне... Я быў ваенны, у арміі бегаў кросы на 5 і на 10 кіламетраў нават перад дэмабілізацыяй, калі мне было 50 гадоў. На лыжах хаджу да гэтага часу! І зарадку раблю, і гантэлі цягаю. Абавязковы пункт праграмы — кантрасны душ. І вядома, харчаванне. У арміі ў гэтым плане ўсё было распісана. Але пасля дэмабілізацыі я перайшоў на бессалявую дыету, і на ёй ужо 30 гадоў. Думаю, солі ў хлебе цалкам дастаткова для чалавека. І яшчэ вельмі важна не пераядаць! Не трэба сядзець на нейкіх дыетах, я лічу, што можна есці ўсё, але пакрысе.



«У мяне шмат творчых планаў».

Мне пашанцавала, у мяне выдатная дружная сям'я: ёсць жонка, дачка, сын, унучка. У жонкі ўжо хворыя ногі, яна рэдка выходзіць з кватэры, але галоўнае, што яна ў мяне ёсць.

**Навукоўцы высветлілі, што аптымісты жывуць у сярэднім на 7,5 гадоў больш.**

Маёй унучцы зараз 30 гадоў, яна разумніца, скончыла два інстытуты, ведае англійскую і нямецкую мовы, цяпер вучыць іспанскую і італьянскую.

Жыць зараз вельмі цікава! Тэхнічны ўзровень вырас неймаверна, мы калісьці і марыць пра такое не маглі! Памятаю, калі я вучыўся на трэцім курсе, у Ленінградзе ствараліся перасоўныя каляровае тэлебачанне. Мы ўсе тады былі ў захапленні. А цяпер у мяне вось у гэтай маленькай прыладзе (паказвае смартфон) ёсць усё. Я магу прама ў гэтую хвіліну зайсці на сайт Белага дома ў Вашынгтоне! Вельмі цікаўлюся навінамі, кожны дзень заходжу ў інтэрнэт. У нас дома тры камп'ютары. На адным з іх — спецыяльная праграма для мантажу фільмаў.

**Я перайшоў на бессалявую дыету, і на ёй ужо 30 гадоў. Думаю, солі ў хлебе цалкам дастаткова для чалавека.**

Я думаю, што калі хтосьці не хоча вучыцца новаму, напрыклад карыстацца камп'ютарам, — гэта не з-за ляноты. Такое бывае, калі чалавек не бачыць перспектывы перад сабой, калі ў яго апатыя — або з-за адзіноты, ці з-за нейкай сямейнай бязладзіцы. Таму што калі чалавек нармальна сябе адчувае, то гэта ж вельмі цікава — зайсці ў інтэрнэт, палазіць па сайтах, паглядзець там які-небудзь фільм, якога ў нас і ў пракаце не было. Я, напрыклад, нядаўна так паглядзеў выдатны турэцкі фільм «Залаты век», ад якога дагэтуль у захапленні.

У мяне яшчэ шмат творчых планаў. Мару стварыць фільм аб Беларусі, падагульняючы такім чынам работу ў нашай кінастудыі. Акрамя таго, цяпер у маіх планах — дажыць да праўнука. Па характары я аптыміст. Лічу: што б ні здарылася ў жыцці, трэба ісці наперад і думаць пра лепшае.

## Тамара Дзялендзік, 66 гадоў: «ЦІ, МОЖА, НАМ АСАБІСТАЯ ЯХТА ПАТРЭБНА?»



Індыйскія танцы дораць асаблівую прыгажосць.

Да пенсіі я працавала ў «Белтэлекаме». А калі выйшла на пенсію, разгубілася: што рабіць? Як жыць? І неяк, гуляючы з суседкай па горадзе, зайшлі ў наш Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання. А там — індыйская музыка, у зале — заняткі індыйскімі танцамі... Я не змагла сябе прымусіць адтуль сысці. У маладосці ўвесь час была занятая: работа, сям'я, дзеці, чытанне, захапленне фатаграфіяй, увогуле, было не да танцаў... А тут на пенсіі пайшла танцаваць — і ўжо праз год мне прапанавалі ўвайсці ў склад ансамбля індыйскага танца пры Палацы прафсаюзаў. Яшчэ год заняткаў — і я ўпершыню выйшла на сцэну...

Ведаеце, нас раней ніхто не вучыў жаноцкасці. А індыйскія танцы — плаўныя, далікатныя, жанчына становіцца гнуткай і вельмі жаноцкай. У яе іншая хада, выправа, рухі больш разняволеныя...

Мне вельмі шмат чаго хочацца, але я разумею, што нельга ахапіць неабсяжнае. Але, як выйшла на пенсію, зацікавілася складаннем радаводу. Завяла адмысловы агульны сшытак, стала пісаць успаміны. Дайшла па мамінай лініі да 1739 года!

**Некаторыя ўпэўненыя: вось калі б у мяне было шмат грошай, я быў бы шчаслівы. Але калі даць яму мільёны, ён, калі не быў шчаслівы да гэтага, то гэтак жа не будзе і ўзбагаціўшыся.**

А потым мне падарылі кінакамеру, і я захапілася кіно. Асвоіла адпаведную камп'ютарную праграму і неўзабаве пачала рабіць відэаролікі. Яшчэ пайшла на ёгу. Там у мяне было пачуццё калектыву, згуртаванасці, мы былі аднадумцамі. Я і цяпер у сваім узросце магу сесці на шпагат!

Калі адкрыўся Універсітэт трэцяга ўзросту, тут жа адправілася туды запісвацца. Займалася там краязнаўствам, дапамагала іншым у якасці валанцёра. А ў 2014 годзе мы ўсе разам арганізавалі сваю кінавідэастудыю, і я з галавой сышла ў гэта. Вельмі люблю рабіць відэасюжэты з жыцця: пра свайго ката, пра кветкі... Цяпер ужо сама выкладаю ва Універсітэце трэцяга ўзросту асновы відэамантажу.

Зараз я жыву з мужам і ўнучкай, якая вучыцца ў БДУІРы. Ад хатняй работы ніхто мяне не вызваляў. Але я ўмею планаваць свой час. А любімыя заняткі дораць натхненне, у мяне тады з'яўляецца настрой і вымыць вокны, і прыбрацца ў кватэры, і згатаваць што-небудзь смачнае.

Я лічу, што ні ў якім выпадку чалавеку нельга запавольвацца, спыняцца, інакш засесць цякучка і хандра. І вельмі важна быць удзячным жыццю за ўсё. Я, напрыклад, удзячная за кожны глыток вады! Перад тым як выпіць ваду, заўсёды ў думках звяртаюся да яе з добрымі словамі. Яшчэ мне вельмі дапамагаюць аплікатары Кузняцова, «калючкі», як я іх называю. Іх у мяне шмат розных памераў. Раю ўсім імі карыстацца, яны сапраўды дораць здароўе. А для прыгажосці — замарожваю настой меліссы і праціраю кубікамі лёду твар. І імкнуся думаць толькі пра добрае, бо нашы думкі матэрыяльныя!

Калі ўспамінаць самыя шчаслівыя, яркія моманты ў жыцці, то адзін з самых важных, калі я нарадзіла свайго першынца — сына. Мне тады быў 21 год. Мяне перапаўнялі захапленне, каханне, боязь — вельмі шмат было пачуццяў!



Наша гераіня — у цудоўнай форме.

Яшчэ адна шчаслівая падзея, з разраду самых-самых — гэта паездка ў Індыю ў 2012 годзе. Мне тады было 63 гады. Я была перапоўненая ўражаннямі і эмоцыямі. Там нават не заўважаеш, проста не прымаеш да ўвагі ні бруд, ні тое, што каровы ходзяць па цэнтральных вуліцах Дэлі... Таму што гэта перабіваецца асаблівай энергетыкай, паветрам, сонцам — усё там нібы напоўнена нейкім вышэйшым сэнсам.

**Як выйшла на пенсію, зацікавілася складаннем радаводу. Завяла адмысловы агульны сшытак, стала пісаць успаміны. Дайшла па мамінай лініі да 1739 года!**

Я ўдзячная жыццю за мужа і за дзяцей, за шчасце дыхаць... Лічу сябе вельмі шчаслівай і думаю, што ўсе мы шчаслівыя, але многія не заўважаюць свайго шчасця. А наконт цяжкасцяў... Я лічу, прыстасавацца можна да чаго заўгодна, акрамя смерці. Я да гэтага часу часта ўспамінаю Індыю і яе шчаслівых жабракоў. А мы ўсе чымсьці незадаволеныя, хоць усё неабходнае для жыцця ў нас ёсць. Ці нам асабістая яхта патрэбна?

А калі камусьці сумна жыць, то не трэба казаць, што гэта жыццё сумнае. Не, гэта ён сумны. Такому чалавеку трэба мяняць сябе ў першую чаргу. Некаторыя ўпэўненыя: вось калі б у мяне было шмат грошай, я быў бы шчаслівы. Але калі даць яму мільёны, ён, калі не быў шчаслівы да гэтага, то гэтак жа не будзе і ўзбагаціўшыся. Таму што шчасце ў нас унутры.

**Святлана БУСЬКО.**
busko@zviazda.by




# МАМІНЫ ПЕСНІ

Дзяцінства ў мяне было цяжкае. Па волі лёсу мама засталася інвалідам. І як кажуць у народзе: «Муж жонку любіць здаровую, а брат сястру багатую». Гэта і сапраўды так, бо бацька мой, калі мне было тры гады, пайшоў ад нас, стварыў другую сям'ю. Мы засталіся, як кажуць, — старое (мая бабуля), малое і хворае.

Мая мама была рукадзельніца. Яна не магла ўстаць з ложка, але рукамі рабіла ўсё для людзей: выцінанкі ды кветкі з паперы (тады гэтым упрыгожвалі іконы, вокны), вязала розныя рэчы, цудоўна вышывала. Ёй неслі работу з усёй акругі. Гэтым і зараблялa на жыццё. Бабуля чытаць зусім не ўмела, а мама чытала па-руску, па-стараславянску і па-польску. Яна скончыла адзін клас польскай школы. А стараславянскай і рускай мове яе навучыў мой дзед Мікіта.

Мама мяне таксама вучыла ўсяму, што ведала. У час вайны я ўжо добра ўмела чытаць, пісаць, рашаць задачы, магла расказаць па памяці шмат вершаў. У нас дома быў сапраўдны культ кнігі. Першая мая кніга — «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра. Яе дала бабуліна родзічка са Скідзеля, Вольга Васілеўна, яна працавала настаўніцай пачатковых класаў. Гэтую кнігу па вечарах мы чыталі ўсёй сям'ёй. Слова «рабінзоны» нікому не было вядомае, таму кнігу «ахрысцілі» «Мірон».

Пры адступленні немцаў бабуля вынесла маму ў авёс, каб яна не згарэла ў хаце. У гэтай схованцы мы праляжалі аж да вечара. Бабуля некалькі разоў поўзала ў прамым сэнсе на жываце дамоў, каб нешта вынесці, і калі вярнулася да нас, мама запыталася:

— А «Мірон» дзе?

— У мяне за пазухай, — адказала бабуля.

То ж трэба, у такую хвіліну думала пра кніжку!

Пасля вайны ў 1944 годзе ўжо арганізавалася школа, і настаўнік экзаменаваў і вызначаў, каму ў які клас ісці. Бабуля сказала, каб мяне запісалі ў трэці. Але я зусім не ведала граматыкі, а таксама не ўмела дзяліць і множыць лікі, таму мяне запісалі ў другі клас. Што ўмела мама, тое і я.

Школа месцілася ў прыватным доме, у «чыстай палавіне», а гаспадары жылі ў кухні. На сцяну павесілі класную дошку, у левым яе куце настаўнік акуратна напісаў крэйдай табліцу множання. Яна заўсёды была перад вачыма вучняў, а падчас кантролю завешвалася фіранчакай. Пачатковую школу наведвалі амаль усе вясковыя дзеці, а вось у пяты клас пайшла прыкладна палова вучняў (бо трэба было хадзіць у суседнюю вёску за 5 кіламетраў), астатнія пакідалі вучобу, а сямігодку скончылі і таго менш. 10-ты ж клас — наогул толькі чацвёра, у тым ліку і я. Вяскоўцы не вельмі імкнуліся, каб іх сыны ды дочкі вучыліся, казалі, што з навукі хлеб есці не будзеш, бо сялянскія дзеці не «выб'юцца ў людзі». Вядома, так лічылі не ўсе.

Я вучылася добра, мела добрую памяць. Падручнікаў і сшыткаў не хапала, але ж затое была бібліятэка. О, які гэта быў скарб! Я прыносіла кнігі, а мама іх чытала паміж вязаннем. Я вару ежу, а яна расказвае, аб чым прачытала.

Калі я перайшла ў сёмы клас, памерла бабуля. І я засталася за гаспадара ў хаце. Так мы і жылі, на мае плечы лёг клопат даглядаць маму, варыць ежу, наогул усё рабіць. Дапамагаў Шура, стрыечны мамін брат. Мама працавала дзень і ноч — вязала людзям. Кароўку мы ўжо не трымалі, былі толькі курачкі.

Гора нам было з аднавяскоўцамі. Яны казалі маме, каб яна не пускала мяне ў школу, маўляў, хай я буду дома і даглядаю яе. Маме і адказваць не было чаго, бо іх дзеці пры здаровых бацьках кінулі вучобу. Яна плакала, але ні разу не сказала мне пакідаць школу, бо вельмі хацела, каб я вучылася.

...Мама, можна лічыць, не мела адукацыі, а выхоўвала правільна. Яна заўсёды правярала мой дзённік і не толькі адзнакі, а і глядзела, каб запісаны былі ўсе заданні на заўтрашні дзень. Распытвала, аб чым я даведалася ў школе. А аднойчы быў цікавы выпадак. На ўроку батанікі нам расказалі, што кветкі бываюць мужчынскія і жаночыя, што яны апыляюцца. Ну, думаю, мама гэтага ніяк не можа ведаць. І калі я пра гэта ёй расказала, то яна мне цэлую навуку выклала: што расліны бываюць двухдомныя і аднадомныя, што каноплі — адна расліна — мужчына, а другая — жанчына. Я здзівілася, адкуль яна ўсё ведае.

Сярэднюю школу я скончыла без троек. Дырэктар школы Канстанцін Канстанцінавіч Махавікоў быў вельмі добрым і справядлівым чалавекам. На выпускным вечары ён запрашаў нас па адным і гутарыў, куды хто будзе паступаць. Я яму сказала, што хачу быць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры.

**Вяскоўцы не вельмі імкнуліся, каб іх сыны ды дочкі вучыліся, казалі, што з навукі хлеб есці не будзеш, бо сялянскія дзеці не «выб'юцца ў людзі». Вядома, так лічылі не ўсе.**

У нас быў цудоўны настаўнік Давыд Цімафеевіч Бірулёў, ён прывіў мне любоў да літаратуры. Вершы, абсалютна ўсе, чытаў па памяці, а на ўроках мовы выкарыстоўваў табліцы — парадыгмы, якія, відаць, сам прыдумваў. Мы ішлі не ад правіла да прыкладу, а, наадварот, мелі прыклад, ды яшчэ вершаваны, і па ім фармулявалі правіла.

Дырэктар ухваліў мае намеры і параіў ісці ў райкам камсамола, каб накіравалі працаваць піянерважатай, а паступаць параіў завочна, ён ведаў маю дамашнюю абстаноўку.

Так я і зрабіла. Паступіла на завочнае аддзяленне ў ВНУ і ўладкавалася на працу важатай. Выбрала, дзе бліжэй дамоў, усяго тры кіламетры — Бубнаўскую сямігодку.

І вось атрымала я першую заработную плату. Як сёння помню: купіла хлеба, селядцоў і цукру. Мама з радасці аж заплакала і сказала: "Ну, цяпер то я ўжо памру, бо калі чалавеку становіцца добра жыць, то ён паміра". Ёй добра жыць? Так, і сапраўды добра, бо яе мара збылася. У яе было толькі адно жаданне, каб я вучылася.

У маёй мамы быў цудоўны голас. Яна ў дзявоцтве спявала ў царкве на клірасе, ведала безліч песняў. Цяпер думаю, чаму я ў яе амаль нічога не распытала пра жыццё, які багаты матэрыял мела б. Тады было не гэта не цікава, а потым — не вернеш, а памерла мама рана, у 42 гады, было хворае сэрца, ды і як яно магло быць здаровым у такім горы. Яна часта спявала песню, слоў якой я да сённяшняга дня так і не знайшла (астатнія песні пазнаходзіла, перапісала ў сшытак, які назвала «Песні мамы», пазнаёміла з імі сваіх дзяцей). Толькі і помню некалькі слупкоў:

*Нарадзіла мяне маці*
*Ранелька ў нядзелю,*
*Дала яна ліху долю,*
*Дзе яе я падзену.*
*Ой, пайдзі ты, ліха доля,*
*На луг папасіся,*
*Хоць на гадок, хоць на другі*
*Ад мяне адвяжыся.*
*Я думала, ліха доля*
*На лузе пасецца,*
*Калі выйду, аглянуся,*
*А ж за мной валачэцца.*

Яна яе часта спявала, калі была адна. Я падыходзіла да дзвярэй і бачыла, што мама плача. Потым памаленьку адчыняла дзверы: яна адразу сціхала і выцірала вочы. Я думала, як гэта можна спяваць і плакаць: песня для мяне, гэта песня, а як плачаш — гэта другое. Толькі потым, калі мамы не стала, зразумела, як гэта можна...

**Яўгенія КУЛЕВІЧ,**
*в. Сялец, Смаргонскі раён.*

# Насустрач прыгодам — са свабоднымі рукамі,

## або Як падарожнічаць з адным заплечнікам

**Нярэдка мы бяром у паездку больш рэчаў, чым трэба на самай справе. Многія сукенкі ды спаднічкі складаем з думкай: «На ўсялякі выпадак, раптам я захачу гэта надзець». Шампунь і гель для душа часта проста бяром з ваннай у велізарных ёмістасцях. Ну, а пяць пар абутку, відавочна, не патрэбныя ні на 7, ні на 14 дзён, ні нават на паўгода падарожжа.**

**Калі я толькі пачынала вандраваць, гэтак жа, як і многія, брала з сабой шмат рэчаў. Частку з іх так і не выкарыстала ў паездцы, а без некаторых лёгка абышлася б. З кожным разам склад маіх рэчаў усё больш набліжаецца да ідэальнага. І калі тыдзень таму была ў трохдзённай камандзіроўцы, калегі з цяжкімі чамаданамі здзіўляліся, як умудраюся вандраваць з адным заплечнікам (у які на зваротным шляху нават кілаграмовы торт змясціўся;-). І прасілі падзяліцца сакрэтамі.**

Вялікіх сакрэтаў, насамрэч, няма. Проста штораз, калі збіраюся ў паездку, складаю спіс мерапрыемстваў, якія збіраюся наведаць і, адпаведна, спіс рэчаў, якія варта ўзяць з сабой. Потым задаю сабе пытанне: ці сапраўды я не змагу абысціся без усіх гэтых рэчаў? І апошні спіс скарачаецца напалову. Я бяру толькі жорсткі мінімум.

**Ніжэй прывяду некалькі парад, якія дапамогуць і вам правільна сабраць заплечнік.**



• Каб не вазіць лішняе, раскладзіце ўсе рэчы на канапе і падумайце пра кожную: чым замяніць, як паменшыць яе вагу і ці можна абысціся без яе наогул.

• Вазьміце зубную шчотку і зубную пасту ў маленькім цюбіку, шарыкавы дэзадарант. Мыла, шампунь і гель для душа, як правіла, ёсць у гасцініцах. Іх мяняюць штодзень. Калі з нейкай прычыны там гэтага не будзе, то можна купіць маленькі флакон на месцы і пакінуць яго пры выезджанні дадому. Парфумерыю ў вялікіх бутэльках — таксама выкладваем. Ручнік браць з сабой не трэба, у любым гатэлі, нават самым танным, яны ёсць. Што тычыцца дэкаратыўнай касметыкі, дык няхай ваша скура адпачне — яна гэта заслужыла.

• Вазіць з сабой фен? Пытанне вельмі спрэчнае, можаце загадзя ўдакладніць, ці ёсць ён у гатэлі, дзе вы будзеце спыніцца. На выпадак адсутнасці запасіцеся дарожным кампактным прыборчыкам.

• Бярыце толькі самую зручную і практычную вопратку і абутак. Паспрабуйце падабраць рэчы так, каб можна было іх надзець у любым спалучэнні. Я параіла б браць з сабой як мага менш вопраткі (гэта асабліва тычыцца дзяўчат).

### Плюсы ручной паклажы, калі вы леціце на самалёце

**Гэта хутчэй** — рэгістрацыя і атрыманне багажу не вельмі прыемныя і хуткія працэдуры і страчваць на іх свой час, які можна прысвяціць падарожжу або адпачынку пасля пералёту, мне не хочацца.

**Гэта танней** — багажныя зборы могуць падвоіць кошт авіябілета.

**Гэта бяспечней** — вашы рэчы не паляцяць у процілеглым ад вас напрамку, іх не ўпусціць нядбайны грузчык і ўжо дакладна ніхто не зможа ў іх пакапацца і нешта ўкрасці. Да таго ж чалавек з вялікім чамаданам прыцягвае ўвагу назойлівых таксістаў і дробных жулікаў больш, чым турыст з заплечнікам.



• Калі казаць пра бялізну і шкарпэткі, то 2-3 пары дастаткова, бо іх можна памыць у ракавіне ў гасцініцы. На батарэях яны да ранку высахнуць.

• Камбінуйце рэчы пры ўкладванні заплечніка: кофтамі можна абгарнуць ноўтбук, шкарпэткі і дробныя рэчы ў пакетах засунуць у абутак. Так вы зможаце сэканоміць шмат месца.

• Загадзя паглядзіце прагноз надвор'я ў тым месцы, куды сабраліся ехаць, каб, калі трэба, прыхапіць цёплыя рэчы. Але нават калі перадаюць дождж, парасон вам не спатрэбіцца. Лепш узяць дажджавік, які зойме зусім мала месца.

• Калі вы, як і я, любіце чытаць у дарозе, але не з'яўляецеся аматарамі электронных кніг, то смела бярыце з сабой папяровую. А прачытаўшы, пакіньце ў транспарце. Такі спосаб буккросінгу распаўсюджаны сярод вандроўнікаў.

• Ноўтбук — рэч вельмі патрэбная любому падарожніку. Але трэба добра разумець, едзеце вы працаваць або адпачываць. У першым выпадку вам неабходны ноўтбук, а ў другім досыць смартфона (для куплі квіткоў па інтэрнэце, прагляду фільмаў і іншых непрадбачаных сітуацый). Добры тэлефон можа замяніць фотаапарат і відэакамеру. Гэта таксама немалаважна ў падарожжы.

Спадзяюся, што гэтыя простыя парады дапамогуць вам сэканоміць свой час. І галоўнае — не забывайцеся дакументы, грошы і пазітыўны настрой! Бо ад яго, і толькі ад яго залежаць вашы ўражанні і адчуванні падчас падарожжа. Адсутнасць любых рэчаў можна перанесці, але калі няма настрою і адкрытага сэрца — нават з поўным заплечнікам вы будзеце сустракаць адны толькі перашкоды і нязручнасці.

**Юлія ДЗЕНІСЕНКА,** *г. Мінск.*

# Калі мама з татам — рок-зоркі

## «Мы ў Бабруйску сталелі хутка»

**М.:** Мне было 16 гадоў. У тым узросце, як зараз усведамляю, з'яўляўся вулічным хуліганам і жыў беспрынцыпова. І маё акружэнне было такім жа. Я піў, бавіў час у розных кампаніях, кватэрах, пасля, па шчырасці, адчуваў сябе жудасна. Мяркую, і мае сябры таксама. Я не ведаў, што можна жыць па-іншаму. Але больш за ўсё мяне прыгнятала поўная безнадзейнасць. Праз які год-другі я ўладкуюся на работу на завод, папрацую гадоў 40, пасля памру, дзе-небудзь паміж гэтым ажанюся. Напэўна, раз ці нават некалькі ажанюся. Па выхадных буду есці шашлык і піць піва. Так і пройдзе жыццё.

Мой тата быў алкаголікам палову майго жыцця, а маці — медсястрой у мясцовай бальніцы. Тата выпіваў, маці ціхенька працавала. Так было амаль ва ўсіх маіх суседзяў. Хтосьці з хлопцаў увогуле рос без таты і асуджаў бацьку, які пакінуў яго ў дзяцінстве. Сам у 19 адмаўляўся ад дзяўчыны, што ад яго зацяжарала... Мы ў Бабруйску сталелі хутка. Двары, раёны... Жылі па вулічна-турэмных законах. Мой старэйшы брат сядзеў у турме. У мяне ў тыя гады было 12 сапраўдных сяброў з нашага двара. Зараз 9 з іх — за кратамі.

***— У які момант усё змянілася?***

**М.:** Аднойчы мы сядзелі з сябрамі ў двары, ігралі, як заўжды, на гітарах. Падыходзіць да нас мужчына гадоў 35 і кажа: «Прывітанне, хлопцы! Файна граеце. У мяне ёсць месца для рэпетыцый. Я хацеў бы вас запрасіць». Мы падумалі, які круты прадзюсар! Але гэта паняцце неспалучальнае з нашым зусім невялікім горадам. Мужчына прапанаваў два варыянты, па якіх мы маглі б займацца: платны і бясплатны. На першы, вядома, сродкаў не было, але музыку мы любілі і прагнулі яе. У другім выпадку мусілі выканаць адну ўмову: дзесяць хвілін на рэпетыцыі слухаць тое, пра што прадзюсар будзе казаць. Вырашылі, што гэты падыход справядлівы, і, калі не захочам, проста не станем услухвацца. Пагадзіліся. Казаў ён нам пра матывацыю, сэнс жыцця, прынцыпы. І, што дзіўна, нас з сябрам яго словы зачапілі. Тады вырашылі, што трэба мяняць жыццё, бо яшчэ крыху — і будзе позна. Але чым займацца? Каб не было так, што «зразумеў жыццё — кінуў працу». Так і вырашылі зладзіць свой музычны гурт.

Спачатку ў нас былі старыя, разбітыя гітары. Тады не было відэа на «YouTube» і «лайфхакаў» пра тое, як іграць на інструментах. Ніхто ў родным горадзе не мог навучыць, як правільна націскаць клавішы на сінтэзатары і «шчыпаць» струны. Але мы спрабавалі, і так напісалася першая песня «Стекло души». Пасля выступілі на расійскім фестывалі «Призван быть первым», перамаглі, а затым двойчы аб'ехалі з турам па 15, а пасля і 25 гарадах Расіі. Такім чынам сфарміравалася аўдыторыя, якая нас ведала. А мы ў сваю чаргу атрымалі каштоўны вопыт, дзякуючы якому зразумелі, што можам рухацца далей — у Маскву.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
У свае два гады Роберт добра размаўляе і нават быў не супраць даць «СГ» кароткае інтэрв'ю.

***— Бацькі не былі супраць?***

**М.:** Калі ўсё гэта адбывалася, маці з татам разводзіліся. Я цалкам сябе забяспечваў: летам працаваў на будоўлі, у астатні час па вечарах спяваў у рэстаранах. І калі прыйшоў да бацькоў і сказаў, што ад'язджаю, каб спяваць, што ім было сказаць: «Заставайся тут, будзеш будаўніком»?

У Маскве панавалі іншыя правілы жыцця. Калі мы ў Бабруйску выходзілі ў двор з ежай — марозівам, булкай з варэннем, яблыкам — любы з хлопцаў мог узяць яе з тваіх рук і з'есці. Бо мы дзяліліся ўсім, што мелі, адно з адным. У Маскве, калі хтосьці з новых сяброў набываў бульбу-фры, а ты браў яе, казалі: «Чаму бярэш маё? Давай я табе куплю асобную». І гэта праяўлялася ва ўсім. Але, тым не менш, адзін з маскоўскіх сяброў — Сяргей — прытуліў нас у сябе дома. Мы жылі не адзін месяц у яго кватэры, начавалі ў спальніках пад кухонным сталом. Раніцай падымаліся, выходзілі ў пакой Сяргея, каб яго маці спакойна сабралася на работу, а пасля вярталіся пад стол і дасыпалі, бо па начах пісалі песні, а днямі працавалі, каб зарабіць на жыццё: кур'ерамі, афіцыянтамі. Не ведаю, ці здолеў бы я прайсці ўсё гэта другі раз.

Зараз удзельнікі групы, у тым ліку і расіяне, пераехалі ў Мінск, аформілі пасведчанне на права жыхарства. Мы жывём і працуем тут. Бо ў Маскве, калі ў дваццаты раз прыходзім на студыю, пытаюць: «Нагадайце, а вы хто?» Тут у нас свая студыя, знаёмыя, у Беларусі нас ведаюць. А сяброў я прывабіў роўнымі дарогамі, якаснымі прадуктамі, больш нізкімі цэнамі і... адсутнасцю пробак!

## «Я не меў ілюзій, што пасля шлюбу жанчына зменіцца»

***— Як пазнаёміліся з жонкай?***

**М.:** Мы жылі ў суседніх дварах. Ведаеце, такая добрая дзяўчына з прыстойнай сям'і на чале з татам — маёрам міліцыі. А мне тады хацелася зрабіць яе «дрэннай»: каб на дыскатэку са мной сходзіла, была сярод маіх сяброў... Але яе бацька даступна растлумачыў, што «пагоршыць» дачку не дасць. І мы доўга не бачыліся, пакуль не адшукаў Карыну ў рэпетыцыйнай базе і яна не далучылася да групы, стаўшы нашай бас-гітарысткай.

***— Калі вырашылі пажаніцца?***

**К.:** Мы знаёмыя з 14 гадоў. Міша заўжды для мяне быў добрым сябрам, чалавекам, які падтрымае нягледзячы ні на што. А ў гадоў 18 ён пачаў да мяне заляцацца. І я не магла зразумець, што адбываецца, бо ён заўжды быў толькі сябрам. Праўда, з агульнай марай і ладам жыцця. Таму я проста запытала: «Міша, што адбываецца?». На што ён прызнаўся ў пачуццях. Гэта было ў час, калі мы пераязджалі ў Маскву. На дзіва, бацькі лёгка мяне адпусцілі ў расійскую сталіцу. А праз год Міша зрабіў мне прапанову.

***— Хто ў вашай сям'і галоўны?***

**К.:** З гадамі гэты статус губляецца. Калі ўсё складваецца як належыць, то вы становіцеся памочнікамі адно аднаму і партнёрамі. Мы абмяркоўваем усе праблемы, але галоўныя ляжаць на плячах Мішы — дзе мы будзем жыць, куды разам рухаемся, і ўсё, што тычыцца фінансаў. У некаторых сем'ях гэтыя пытанні вырашае жанчына, і гэта таксама нармальна. Але ў нас склалася так. Адразу, калі пажаніліся, размеркавалі зоны адказнасці. Я, як жонка і маці, не перажываю, што буду есці заўтра і як зарабіць грошы. Магу зараз засяроджвацца на сям'і, дзецях, стварэнні ўтульнасці, чаго не можа рабіць Міша ў сілу свайёй занятасці, бо шмат ездзіць. Калі ён у Мінску — заўжды імкнецца як мага больш часу бавіць дома, дапамагаць.

**М.:** Сёння, напрыклад, Роберту ложак сабраў.

**К.:** Так. Карацей, даю яму магчымасць рэалізоўвацца як мужчыне.

**М.:** Цяпер разумееце, чаму я з ёй ажаніўся? *(Усміхаецца.)*

**К.:** Мяне часта пытаюць: «Напэўна, ты так пакутуеш, столькі цяжкасцяў?» Ды не. Першы год прыцірак быў няпросты.

**М.:** А толькі прывыкнеш, а муж ужо з'ехаў *(Смяюцца.)*

**К.:** І калі вярнуўся — ізноў прывыкай. Бывае, людзі сустракаюцца доўга, але як яны бавяць час?

**М.:** Забаўляюцца адно адным, прытрымліваюцца нейкіх роляў, прыдуманых у сваёй свядомасці. Але па-сапраўднаму не разумеюць партнёра. А мы адразу раскрылі ўсе карты: чаго чакаем ад жыцця і шлюбу. Кожны з нас — самадастатковы, можа існаваць паасобку, але разам мы здольныя стварыць больш і лепш. Мы ўсе неідэальныя... Карына, яе вернасць і каханне да мяне проста заваёўваюць. Я не здолеў бы сябе так любіць, як яна гэта робіць.

Я тэсціраваў будучую жонку. Глядзеў, як яна ставіцца да дзяцей, паводзіць сябе ў кампаніі сяброў. Калі мы ўсе паелі, прыбірае посуд ці ідзе класціся на канапу перад тэлевізарам. Бо разумеў, што жыць мне не з целам, а з чалавекам, асобай. І я хацеў даведацца, якая яна. Бо не меў ілюзій, што пасля шлюбу жанчына будзе мяняцца.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## «Хачу для сына быць найлепшым сябрам»

***— Зразумела, што бываюць і моманты нязгоды. Як выходзіце з канфліктаў?***

**М.:** Прабачаем.

**К.:** Размаўляем.

**М.:** Пагаджуся з Карынай. Нядаўна сябра паскардзіўся, што ў яго праблемы ў сям'і. І я параіў яму запытацца ў жонкі, што варта зрабіць, каб іх шлюб стаў шчаслівым. Калі зразумець, што патрэбна іншаму, жыццё наладжваецца. Даеш абяцанне, што «я буду кахаць цябе ўсё жыццё і рабіць цябе шчаслівай». І гэта двухбакова. Мы прынялі рашэнне ажаніцца ў той момант, як Карына сказала, што будзе шчаслівай, калі я стану яе мужам.

**К.:** Калі людзі жывуць разам, не звязваючы сябе абавязацельствамі перад грамадствам ці перад Богам, у іх нібыта існуе план «Б» — план адступлення. Навошта дамаўляцца, калі можна сысці і адшукаць прасцейшы варыянт? Але калі расставанне не альтэрнатыва, мы прыходзім да кампрамісаў.

**М.:** Гэта лепш і для нашай сям'і, і для нашых дзяцей. Тады знікае «я» і з'яўляецца «мы», якое даражэй за ўласнае самалюбства.

> **«У Маскве панавалі іншыя правілы жыцця. Калі мы ў Бабруйску выходзілі ў двор з ежай — марозівам, булкай з варэннем, яблыкам — любы з хлопцаў мог узяць яе з тваіх рук і з'есці. Бо мы дзяліліся ўсім, што мелі».**

***— Міхаіл часта ў паездках. Як вы да гэтага ставіцеся?***

**К.:** Прызвычаілася. Вядома, яго не хапае, сумуеш. Міша сэрцам вельмі прывязаны да дзяцей, таму для яго з'язджаць — цяжар яшчэ большы, чым для мяне ягоная адсутнасць. Аднойчы муж сказаў: «Карына, калі ты скажаш, каб я перастаў ездзіць, я гэта зраблю». Адчуваю, што ён гэтага чакае.

**М.:** Чакаю! Вы не ўяўляеце, што робіць з мужчынам дзеці.

***— Які лепшы падарунак свайму дзіцяці могуць зрабіць бацькі?***

**К.:** Час. «Жадаеце змяніць свет? Ідзіце і любіце сваіх дзяцей». Гэта словы Маці Тэрэзы.

**М.:** Час — гэта самы адчувальны рэсурс на зямлі. Калі я дам вам тысячу долараў, вы зможаце яе вярнуць?

***— Так, калі не патрачу.***

**М.:** А калі правільна ёю распарадзіцеся, то зможаце аддаць з прыбыткам. Але хто на гэтай зямлі зможа вярнуць год майго жыцця? Таму калі я адбіраю свой час у сына, то хачу быць перакананы, што раблю гэта не дарэмна, аддаю яго на штосьці карыснае для іншых.

***— Што хочацца даць дзецям, чаго калісьці не хапіла вам?***

**М.:** Больш магчымасцей і шанцаў выбраць. Мае бацькі далі ўсё, што маглі. Магчыма, калі б я паехаў вучыцца ў Амерыку, мой лёс і кар'ера склаліся па-іншаму. Хачу, каб сын фарміраваўся як асоба з маленства, асэнсавана, рос у годным асяроддзі і ўмовах, не праходзіў праз тыя памылкі, ад якіх можа выратаваць добрае бацькоўскае выхаванне.

Хачу сябраваць з сынам. Каб, калі ў яго ў падлетковым узросце ўзнікнуць праблемы, я быў першым, каму ён патэлефануе са словамі: «Тата, прывітанне! Тут такое... Як мне паступіць?» Хачу, каб ён ездзіў са мной. Каб бачыў, як яго тата рэагуе ў розных абставінах на стрэс, у канфліктах, у радасці, як вырашае складаныя пытанні. Але сяброўства хачу не навязанага, як гэта часта бывае, а сапраўднага, шчырага. Хачу даць дзецям усё, што маю.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*



**Фота зроблена пяць гадоў таму, калі Міша і Карына яшчэ ігралі разам (стаяць адно за адным у цэнтры здымка). Цяпер «NUTEKI» ездзяць па гастролях і даюць усяго адзін канцэрт на год у Беларусі. Бліжэйшы — ужо ў наступную сераду, 16 лістапада.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

■ Модная тэндэнцыя

# Уся сям'я — у адным стылі

## Мінчанка выпускае аднолькавае адзенне для бацькоў і іх дзетак

**Калі дзве дзяўчыны прыйшлі на мерапрыемства ў аднолькавых сукенках — гэта катастрофа. Іншая справа, калі падобна адзеліся мама з дачкой. Стыль family look вельмі папулярны за мяжой. Мінчанка Таццяна ШАПАВАЛАВА вырашыла, што беларусам таксама варта пераняць гэту модную тэндэнцыю, і пачала ствараць яркія камплекты ў адным стылі для бацькоў і іх дзетак. «Курыца Памада» — так небанальна маладая мама назвала сваю лінію адзення з вясёлымі прынтамі. Таццяна расказала нам, як, не маючы адукацыі дызайнера, запусціць сваю калекцыю, чаму сучасныя мамы не ходзяць у халатах і як выхаваць у дзіцяці пачуццё густу.**

Захапляцца стылем family look Таццяна пачала яшчэ да нараджэння дачкі. Разам з мужам яны прыдумалі свой лагатып, зрабілі фірмовыя майкі. Падчас падарожжаў куплялі сабе аднолькавыя футболкі ў розных краінах — ужо набіралася калекцыя.

Калі дзяўчына пайшла ў дэкрэтны водпуск, ёй не захацелася сядзець склаўшы рукі.

**«Мне здаецца, моду ствараюць свабодныя і смелыя людзі, і я хацела б, каб мая дачка расла такой. Часта проста адчыняю шафу і прапаную ёй самой выбраць рэчы».**

— У сучасных мам столькі часу вызваляецца праз тое, што ёсць усе выгоды: пральная машына, пыласос, — лічыць Таццяна. — Якраз тады мая сяброўка, якая жыве ў Кітаі, расказвала, што там сем'і любяць адзявацца падобна ці ў адным стылі. Жакно ўсе камплекты прадаюцца для бабуль, дзядуляў, бацькоў і дзяцей. Я стала для сябе заказваць такія рэчы. У Мінску гэтага зусім не было. Толькі індывідуальны пашыў. Яшчэ, праўда, у атэлье Вольгі Барабаншчыкавай прадавалі сукенкі ў стылі family look, але гэта дарагія ўборы на выхад.

Тады Таццяна вырашыла стварыць сваю міні-калекцыю. У паўсядзённым стылі: сутыкнуўшыся з мацярынскім жыццём, зразумела, што зручнае адзенне на кожны дзень — найлепшы варыянт для жанчын з маленькімі дзецьмі. Матэрыялам выбрала футар (від баваўнянай тканіны). Ён бывае розным па саставе: і тонкі, і цёплы. Плюс карысны для цела і прыемны навобмацак.

Асноўнай фішкай сталі прынты. Іх Таццяна распрацоўвае сама: яшчэ ва ўніверсітэце яна закончыла курсы паліграфічнага дызайну, а ў дэкрэце засвоіла на прафесійным узроўні маляванне на камп'ютары. Адшываецца адзенне — пакуль гэта толькі світшоты (байкі) — на фабрыцы. Дзяўчына, якая да нараджэння дачкі працавала кіраўніком аддзела маркетынгу сеткі піўных рэстаранаў, прызнаецца, што ў канструяванні нічога не разумее, таму робіць толькі эскізы будучых рэчаў, а ўжо лякалы па іх рыхтуюць спецыялісты. Праўда, перад тым як паспрабаваць сябе ў якасці дызайнера, Таццяна праходзіла са стылістам майстар-клас, каб ведаць асноўныя правілы падбора адзення.



Такія світшоты з вясёлымі прынтамі пачала выпускаць маладая мама.

Тэмай малюнкаў першай калекцыі сталі героі дыснэеўскіх мультфільмаў, другой — лабірынты. Прынты на байках розныя, але дапаўняюць адну гісторыю. Як мінігульня: мама можа адцягнуць увагу дзіцяці з дапамогай гэтых малюнкаў, супакоіць яго.

**«Жанчыны ў дэкрэтным, па-мойму, круцей выглядаюць, чым калі яны сядзелі ў офісе з ранку да вечара. З'яўляецца шмат натхнення».**

— Цяпер вельмі модна адзяваць дзіця па-даросламу. Нават славутасці так робяць. А мне гэта не падабаецца, — усміхаецца маладая мама, калі тлумачыць, чаму выбірае вясёлыя прынты. — Калі б я была дзіцем, я не хацела б, каб мяне так адзявалі. Бо вырасці мы заўсёды паспеем і панасіць такія рэчы — чорна-белыя, карычневыя — таксама. Таму спяшацца рабіць з маленькіх дзяўчынак жанчын не трэба. А наконт яркіх світшотаў для мам — здарова, калі дзіця бачыць, што побач з ім такія ж вясёлыя бацькі.

Пакуль марка «Курыца Памада» — штучная вытворчасць. Кожнай мадэлі адшываюць максімум 20 адзінак. Але яны разыходзяцца даволі хутка. Цяпер у праекта вялікая суполка ў «Інстаграме» — больш за 7 тысяч падпісчыкаў. Акрамя світшотаў, Таццяна плануе выпускаць у будучым сукенкі, байкі з капюшонамі.

— Пакуль я не пайшла ў дэкрэт, думала, што мамы — гэта жанчыны з тлустымі валасамі, у брудным халаце, якія нічога не паспяваюць. Але ў сучасных мам хапае вольнага часу, каб сачыць за сабой. Заўважыла, што яны такія красуні: усе падцягнутыя, стыльныя, — дзеліцца сваімі назіраннямі дзяўчына. — Цяпер жа ёсць магчымасць падбіраць сабе адзенне ў інтэрнэт-крамах і заказваць дастаўку на дом. У сэканд-хэндах можна «адкапаць» класныя рэчы. Жанчыны ў дэкрэтным, па-мойму, круцей выглядаюць, чым калі яны сядзелі ў офісе з ранку да вечара. З'яўляецца шмат натхнення.




Таццяна ШАПАВАЛАВА і яе двухгадовая дачка Тая любяць адзявацца аднолькава.

Сама Таццяна за модай не сочыць. Але, кажа, напэўна, у яе ёсць чуццё: спадабаецца нешта, а праз некалькі месяцаў гэта ўжо становіцца папулярным.

Пытаемся: ці ёсць нейкія правілы пры саставленні вобразаў у стылі family look? «Мне здаецца, класна, калі гэта не інкубатар (усе ў клетку, напрыклад), а падобная каляровая гама ці стыль адзення. У таты матылёк з такой жа тканіны, як сукенка ў дачкі, ці ва ўсіх шапкі аднолькавыя», — раіць маладая мама.

Кажуць, пачуццё густу ў дзяцей трэба выхоўваць з маленства. У Таццяны на гэты конт ёсць сваё меркаванне.

— Паняцце стылю, моды вельмі невыразнае, — разважае яна. — Бачыш нейкага суперславутага стыліста і думаеш: «Я так ніколі не адзелася б!», але ён лічыцца прафесіяналам. Мне здаецца, моду ствараюць свабодныя і смелыя людзі, і я хацела б, каб мая дачка расла такой. Часта проста адчыняю шафу і прапаную ёй самой выбраць рэчы. Гэта часам, вядома, даходзіць да абсурду: Тая можа надзець сукенку ў гарошак, пад яе джынсы і дапоўніць камплект абручом з банцікам. Ці прыбрацца ў Мікі Маўса. Але гэта яе бачанне моды.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Фота з архіва гераіні**

# ШЧАСЛІВЫЯ ПЕЛЬМЕШКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ»)*

Самае цяжкае — гэта пачаць. І з жывёламі тое ж самае. Каб ваш гадаванец зноў стаў шчаслівым, трэба папрацаваць. Першапачаткова складана і маральна, і матэрыяльна. Напрыклад, сабака-спінальнік — гэта, напэўна, адна з самых цяжкіх катэгорый жывёл-інвалідаў, якая ёсць у краіне.

— Такі сабака патрабуе пэўных затрат, ведаў і ўмення, — кажа Варвара. — Самыя галоўныя выдаткі будуць упачатку: паказаць лекарам, праапераваць, калі магчыма. Калі сабака будзе хадзіць толькі на дзвюх пярэдніх лапах — купіць яму інвалідную каляску. Потым у дадатак да звычайных «сабачых выдаткаў» проста дадаюцца падгузкі і пялюшкі.

Жывёлы прывыкаюць да новага становішча даволі хутка. Якая розніца, колькі ў цябе лап, калі ты можаш таксама хутка бегаць на прагулкі? У жывёл няма сацыяльных рамак, таму яны не будуць паказваць пальцам і гаварыць, што ты нейкі не такі. Яны прымаюць сябе і іншых такімі, якімі яны ёсць. Сляпыя каты злёгку вучацца арыентавацца ў кватэры і, будзьце ўпэўненыя, сваю міску не прапусцяць. Латак знаходзяць таксама на пяць з плюсам. Напрыклад, кошка Аймі, у якой няма аднаго вока, менавіта такая. Яна добра ладзіць з іншымі гадаванцамі і цяпер чакае сваіх гаспадароў.

— Калі ты знаходзіш скалечаную жывёлу ці твой гадаванец становіцца інвалідам, на самай справе ёсць два шляхі, — расказвае Варвара. — Першы, самы просты, — усыпіць. Другі — пазмагацца і падарыць яму магчымасць жыць паўнавартасна з інваліднасцю. Галоўнае, зразумець, ці дастаўляе яму траўма боль, які ўжо нічым не аблегчыць. Тады, на жаль, застаецца адзін варыянт — першы. Я, як гаспадыня сабакі-спінальніка, не бачу нічога страшнага ў сляпым каце. У мяне былі такія і выдатна сябе адчувалі. А для сабакі, у якога не трымаецца мача, купіце падгузкі — і ўсё. Рашэнне можна знайсці — было б жаданне.

У «Добры Леў» трапляюць жывёлы з рознымі траўмамі, большасць з іх бяздомныя. Але мяне ўразіла гісторыя з кацянём, якому гаспадары прышчамілі лапу дзвярамі ад халадзільніка. На працягу пяці дзён яны не звярталіся да ветэрынара, а потым вырашылі яго ўсыпіць. Як высветлілася, пазбавіцца ад жывёлы, якой незнарок зламалі лапу, аказалася значна прасцей. Валанцёры разам з ветэрынарамі паўтара тыдня змагаліся за яго жыццё. На жаль, з-за нясвоечасовай дапамогі выратаваць яго не атрымалася. А ў малога быў шанц вырасці вялікім шчаслівым катом, калі б гаспадары не ўспрымалі яго як жывую цацку, якую можна выкінуць, калі яна сапсавалася.

— Няма такой пароды, як бяздомныя жывёлы, — працягвае Варвара. — Людзі самі пазбавілі іх дому і робяць так кожны дзень. Пакуль гэта замкнёнае кола: адны калечаць, другія лечаць і, на жаль, па-іншаму не атрымліваецца. Трэба, каб нешта ў людскім разуменні змянілася, каб усе разам падключыліся, толькі так справа зрушыцца з мёртвай кропкі.

**У жывёл няма сацыяльных рамак, таму яны не будуць паказваць пальцам і гаварыць, што ты нейкі не такі. Яны прымаюць сябе і іншых такімі, якімі яны ёсць.**

У «Добрага Льва» няма прытулку: гадаванцы жывуць у дамах тых, хто іх знайшоў, або тых, хто пагадзіўся часова падзяліць з імі жыллё. Усё, што трэба, шукаюць у інтэрнэт-суполцы: лекі, ежу, часовы прытулак, грошы на аплату лячэння... І людзі дапамагаюць, чым могуць. Так і адбываецца выратаванне — усе аб'ядноўваюцца і даюць кату ці сабаку шанц на жыццё. Зараз «Добры Леў» дапамагае 31 жывёле.

— Ёсць у нас і «шчаслівыя пельмешкі», — расказвае Варвара. — Ведаеце, як у дзяцінстве сярод усіх пельменяў шукалі адзіны, з манеткай. Так я называю тых, каму пашчасціла, і мы своечасова ім дапамаглі. Напрыклад, Топа. Гэтага сабаку збіла машына на нашых вачах і нават не прытармазіла. Мы яго забралі і вылечылі. «Добры Леў» спрабуе рознымі спосабамі знайсці дапамогу, каб падтрымаць жывёл, за якімі даглядаюць куратары. Збіраем макулатуру, удзельнічаем у разнастайных акцыях, каб сабраць, абмяняць і потым на гэтыя грошы купіць нешта карыснае. Зараз актыўна шукаем людзей, напрыклад рамеснікаў, якія хацелі б з намі супрацоўнічаць і нейкі адсотак ад продажу або аказання паслуг аддаваць у «Добры Леў» ці адразу наўпрост для жывёлы, якая запала ў душу. З такімі прапановамі можна да нас звяртацца ў сацыяльных сетках («УКантакце»: https://vk.com/dobryjlev, «Фэйсбук»: https://www.facebook.com/dobryjlev). Будзем вельмі ўдзячны за любую дапамогу.



Кошачка Аймі шукае сваю сям'ю. Будучыя гаспадары, звяртайцеся да Святланы па тэлефоне 375447521833.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт» на праве хозяйственного ведения

| № лота | Описание | Адрес | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Грузопассажирский вагон ГАЗ 2705 кузов (рама) № 27050070367206/ X9627050070591464. 2007 г.в. Разрешенная масса – 3500 кг. Цвет – сине-зеленый. Двигатель – бензиновый, с рабочим объемом 2,4 л. КП – механическая. Автомобиль эксплуатируется | Минская обл., г. Фаниполь, ул. Заводская, 9 | 1 477,34 | 295,47 |
| Лот № 2 | Грузопассажирский вагон ГАЗ 2705 кузов (рама) № 27050060271202/X9627050060496166. 2006 г.в. Разрешенная масса – 3500 кг. Цвет – сине-зеленый. Двигатель – бензиновый, с рабочим объемом 2,4 л. КП – механическая. Автомобиль эксплуатируется | | 1 358,38 | 271,68 |
| Лот № 3 | Автомобиль грузовой специальный цистерна МАЗ 53373 1 кузов (рама) Y3M53373170000036. 2007 г.в. Разрешенная масса – 16 500 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 12 л. КП – механическая. Автомобиль не эксплуатируется | | 6 755,21 | 1 351,04 |
| Лот № 4 | Автомобиль грузовой специальный цистерна МАЗ 5337 кузов (рама) Y3M5337A280000922. 2008 г.в. Разрешенная масса – 16 500 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 12 л. КП – механическая. Автомобиль не эксплуатируется | | 5 788,55 | 1 157,71 |
| Лот № 5 | Седельный тягач МАЗ-МАН 642368 кузов (рама) Y3N64236880000062. 2008 г.в. Разрешенная масса – 29 500 кг. Цвет – зеленый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 12 л. КП – механическая. Автомобиль не эксплуатируется | | 11 207,10 | 2 241,42 |
| Лот № 6 | Автомобиль грузовой специальный цистерна MAZ-533702241 кузов (рама) Y3M53370270008519. Год выпуска – 2007. Разрешенная масса – 18 000 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 12 л. КП – механическая. Автомобиль не эксплуатируется | | 7 182,46 | 1 436,49 |
| Лот № 7 | Полуприцеп специальный цистерна PPC 96221-03 кузов (рама) X9096221360004883. Год выпуска – 2006. Разрешенная масса – 42 000 кг. Цвет – оранжевый. Полуприцеп не эксплуатируется. Эксплуатация по перевозке опасных грузов запрещена | | 4 342,96 | 868,59 |
| Лот № 8 | Полуприцеп цистерна ППЦ 30 кузов (рама) Y39PPC30080010024. Год выпуска – 2008. Разрешенная масса – 36 000 кг. Цвет – белый. Полуприцеп не эксплуатируется. Эксплуатация по перевозке опасных грузов запрещена | | 20 187,80 | 4 037,56 |
| Лот № 9 | Полуприцеп специальный цистерна ППЦ 30 кузов (рама) Y39PPC30080010026. Год выпуска – 2008. Разрешенная масса – 36 000 кг. Цвет – белый. Полуприцеп не эксплуатируется | | 20 187,80 | 4 037,56 |
| Лот № 10 | Полуприцеп специальный цистерна ППЦ 96221 кузов (рама) X9096221360004884. Год выпуска – 2006. Разрешенная масса – 31 500 кг. Цвет – оранжевый. Полуприцеп не эксплуатируется | | 4 340,82 | 868,16 |
| Лот № 11 | Автомобиль грузовой специальный цистерна MAZ 5337 31 кузов (рама) Y39AC100080010096/ Y3M53373170000037. Год выпуска – 2007. Разрешенная масса – 18 000 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 12 л. КП – механическая. Автомобиль не эксплуатируется | | 7 767,44 | 1 553,49 |
| Лот № 12 | Автопогрузчик вилочный Амкадор-451А с инвентарным номером 66662041 согласно инвентарной карточке учета основных средств. Год выпуска – 2007. Цвет: облицовка – желтый, кабина – белый, подъемник – черный. Вид движения – самоходное шасси. Мощность двигателя – 73,5 кВт. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 4 л. КП – механическая. Автопогрузчик не эксплуатируется | Аг. Гостиловичи Логойского р-на, на территории СК «Логойский» | 6 476,84 | 1 295,37 |
| Лот № 13 | Автомобиль грузовой специальный цистерна GAZ-5312 кузов (рама) № XTH531200M1306129. Год выпуска – 1991. Разрешенная масса – 7400 кг. Цвет – синий. Двигатель – бензиновый, с рабочим объемом 4,25 л. КП – механическая. Автомобиль не эксплуатируется. Пробег на 03.10.16 – 322 806 км | Минская обл., г. Фаниполь, ул. Заводская, 9 | 1 164,05 | 232,81 |
| Лот № 14 | Седельный тягач MAZ 642205 кузов (рама) Y3M64220570002062. Год выпуска – 2007. Разрешенная масса – 26 500 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 15 л. КП – механическая. Автомобиль не эксплуатируется | | 7 538,42 | 1 507,68 |
| Лот № 15 | Полуприцеп специальный цистерна DROMECH CNK-38/11 кузов (рама) BB1013. Год выпуска – 1996. Разрешенная масса – 34 000 кг. Масса без нагрузки – 6500 кг. Цвет – белый. Полуприцеп не эксплуатируется. Эксплуатация по перевозке опасных грузов запрещена | | 9 847,40 | 1 969,48 |
| Лот № 16 | Полуприцеп специальный цистерна PPC 96221-03 кузов (рама) X9096221360004885. Год выпуска – 2006. Разрешенная масса – 42 000 кг. Масса без нагрузки – 10 750 кг. Цвет – оранжевый. Полуприцеп не эксплуатируется. Эксплуатация по перевозке опасных грузов запрещена | | 4 344,00 | 868,80 |
| Лот № 17 | Седельный тягач МАЗ-МАН 642368 кузов (рама) Y3N64236880000064. Год выпуска – 2008. Разрешенная масса – 29 500 кг. Цвет – зеленый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 15 л. КП – механическая. Автомобиль в неудовлетворительном состоянии, не эксплуатируется | | 11 251,07 | 2 250,21 |
| Лот № 18 | Седельный тягач MAZ 543205-020 кузов (рама) Y3M54320560002151. Год выпуска – 2006. Разрешенная масса – 18 000 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 15 л. КП – механическая. Автомобиль в неудовлетворительном состоянии, не эксплуатируется | | 3 933,78 | 786,76 |
| Лот № 19 | Седельный тягач MAZ 5440 A8 кузов (рама) Y3M5440A870000046. Год выпуска – 2007. Разрешенная масса – 16 500 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 15 л. КП – механическая. Автомобиль в неудовлетворительном состоянии, не эксплуатируется | | 5 892,26 | 1 178,45 |
| Лот № 20 | Седельный тягач MAZ 642205 220P1 кузов (рама) Y3M64220570002068. Год выпуска – 2007. Разрешенная масса – 24 500 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 15 л. КП – механическая. Автомобиль в неудовлетворительном состоянии, не эксплуатируется | | 4 349,71 | 869,94 |
| Лот № 21 | Грузовой автомобиль специальный цистерна MAZ 53373 1 кузов (рама) Y3M53373170000034. Год выпуска – 2007. Разрешенная масса – 16 500 кг. Цвет – белый. Двигатель – дизельный, с рабочим объемом 12 л. КП – механическая. Автомобиль находится в неудовлетворительном состоянии после ДТП; не эксплуатируется | | 7 329,96 | 1 465,99 |
| Лот № 22 | Полуприцеп специальный цистерна ППЦТ 36 кузов (рама) X899644M070DF7037/Y39CAT11070005389. Год выпуска – 2007. Разрешенная масса – 32 000 кг. Масса без нагрузки – 14 040 кг. Цвет – серый. Полуприцеп не эксплуатируется | | 7 124,42 | 1 424,88 |

()* – цена указана в денежных знаках образца 2009 г.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость, приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь

Аукцион состоится **12.12.2016 в 11.00,** прием заявлений в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу Организатора аукциона. Шаг аукциона – 5%. Окончание приема заявлений – **08.12.2016 в 11.00.**
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот № __), принадлежащего РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт», **проводимом 12 декабря 2016 г.** Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Гончар Александр Александрович (8 033) 604 47 22.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона • адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3-й этаж**
**• +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-78079 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание кафе), площадью 515,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 4 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000001007129 (назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного для общественного питания (кафе)), площадью 0,0984, расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 4. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0984 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код 13,2, площадью 0,0130 га |
| Начальная цена продажи | 348 000,00 р. (триста сорок восемь тысяч рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 34 800 р. (тридцать четыре тысячи восемьсот рублей) |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 09 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя - доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 05 декабря 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## Информация о формировании реестра акционеров:

- полное наименование и местонахождение акционерного общества: **Закрытое акционерное общество «Амкодор-Спецсервис»**, 223003, г. Минск, ул. Брикета, 39;

- наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров: **Совет директоров, «08» ноября 2016 г.;**

- дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров: **«08» ноября 2016 г.».**

УНП 100187680

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ КОНКУРСА НА ПЕРЕДАЧУ В АРЕНДУ РЫБОЛОВНОГО УГОДЬЯ ФОНДА ЗАПАСА

**Городокский районный исполнительный комитет Витебской области по поручению Витебского областного исполнительного комитета**
**20 декабря 2016 г. в 14.00 в здании Городокского райисполкома, расположенного по адресу: Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2 (малый зал, каб. 110), проводит торги в форме конкурса по предоставлению в аренду рыболовного угодья фонда запаса для ведения промыслового рыболовства и организации платного любительского рыболовства со сроком аренды не менее 10 лет.**

**На торги выставляется рыболовное угодье (водоем) озеро Жодень окунево-плотвичного класса общей площадью 53,0 га, местонахождение рыболовного угодья – Витебская область, Городокский район, 32 км на северо-запад от г. Городка, у дер. Новка.**

Претенденты на участие в конкурсе с объектом конкурса знакомятся самостоятельно.

Сумма ежегодной арендной платы за предоставляемое в аренду рыболовное угодье озеро Жодень 222,6 (двести двадцать два) белорусских рубля шестьдесят копеек.

Условия конкурса – лучшие предложения по эффективности использования рыболовного угодья, изложенные в обосновании необходимости приобретения и намерений по дальнейшему их использованию, создание объектов благоустройства территории согласно схеме (со схемой можно ознакомиться по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, каб. 205 (с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням понедельник–пятница). Предусмотреть для зарегистрированных по месту жительства граждан в деревнях дер. Новка, Прудок Долгопольского сельсовета Городокского района льготные условия на осуществление платного любительского рыболовства.

Задаток вносится в размере 20 (двадцати) процентов от суммы ежегодной арендной платы за предоставляемое в аренду рыболовное угодье озеро Жодень 44,52 (сорок четыре) белорусских рубля пятьдесят две копейки.

Срок внесения задатка – при подаче документов. Порядок внесения задатка – единовременно.

Участник, выигравший торги в течение 5 календарных дней с даты подписания протокола проведения торгов, возмещает затраты на организацию и проведение торгов Городокскому районному исполнительному комитету. Сумма затрат и порядок их возмещения доводится до сведения участников торгов до начала их проведения в день проведения торгов.

**Для участия в конкурсе в срок по 14 декабря 2016 г. до 17.00 необходимо предоставить комиссии по организации и проведению торгов, по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, каб. 205 (с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням понедельник–пятница), следующие документы:**

1. заявление с указанием сведений о рыболовном угодье, которое желает получить в аренду по результатам торгов юридическое лицо;

2. предложения в письменной форме о выполнении условий торгов, запечатанные в отдельном конверте. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе торгов;

3. **копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесения задатка на расчетный счет ГУ Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области № 3600316007106 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка 153001795, УНП 300594330, код платежа в бюджет 04002;**

4. доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов.

Договор с победителем аукциона заключается Витебским областным исполнительным комитетом в сроки установленные законодательством.

**Контактный телефон (802139) 43105.**

**Нехта мо думае, што ў доўгія летнія падарожжы з начлегам на беразе рэчкі нас клічуць элегантныя істоты пад назвай камары. Хто ведае... Нехта мяркуе, што экскурсіі па мясцінах падарожжаў замаўляюцца намі дзеля мурашак, якія апантана паўзуць па скуры, варта толькі пачуць чарговы гістарычны аповед. Гэта праўда. Але ніхто не здагадваецца, што ў нашых падарожжах бываюць задзейнічаны яшчэ і не такія насякомыя. У тую летнюю вандроўку, якая асабліва ўспамінаецца цяпер, пад ціхі-ціхі, далікатна-празрысты палёт самых першых сняжынак, паклікалі нас матылькі.**

# НАД НЁМАНАМ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ



**Так выглядаў дом у Міневічах, у якім Эліза Ажэшка адпачывала і працавала летнімі месяцамі 1880-х. Яе акно выходзіла на Нёман.**

Нехта больш разумны скажа, што ніякія гэта не матылькі, а шчацінахвосткі — іншая, яшчэ прадкавая форма крылатых насякомых, вядомая ажно з Дэвону. Звычайныя падзёнкі, мятлушкі-аднадзёнкі, чый масавы ўзлёт з воднай гладзі нагадвае белым марывам зіму пасярэдзіне лета. У тое падарожжа над Нёманам нас паклікалі менавіта яны.

Начытаўшыся публіцыстыкі Элізы Ажэшкі (пісьменніца, бавячы лета ў вёсках над Нёманам, пісала не толькі аповесці), я падумала: што калі...

Што калі праехацца яе вёскамі і пашукаць тых, каго яна апісвала ў артыкулах-рэпартажах... Ясная справа, у галовах людзей пашукаць, у іх памяці. Ну, або на магілкі завітаць... І заадно ўбачыць масавы вылёт падзёнак — з'яву, якая «мноствам снежных кропак віецца ў ружовым дымку» ў час, калі «незлічоныя зоркі і прамяністая мгла, што авейвае Млечны Шлях, на неба ўжо выступілі». Сказана — зроблена! Выпраўляемся на Мастоўшчыну.

Завітаем найперш (па дарозе ж) на магілы сястры і бацькі нашай слаўнай пані Элізы, якая, між іншым, двойчы канкуравала за Нобелеўскую прэмію — то з Генрыкам Сянкевічам, то з Сельмай Лагерлёф, і хоць абодва разы «прайграла», але хіба гэта не тое самае, што адзін раз перамагчы? Ну амаль жа...

Пра магілы пытаемся ў крайнім домiку вёскі Залесна. «Праедзеце нізкія елкі — зірніце направа: Паўлоўскія ўсе пахаваныя там», — з веданнем справы адказвае жвавая бабка, хоць паспела я толькі прамовіць: «Скажыце, калі ласка, дзе магілы...» Што ні кажы, а вясковы люд свае мясцінкі ведае, гэта не тое, што пра сядзібу, скажам, Ежы Кабылінскага выпытваць у сталічнага жыхара. Пра магілы Паўлоўскіх пытаць даволася, бо Арчы... О, гэты Арчы. Ён зноў заблукаў. Гэтым разам са спадарожнікамі не сварыўся, дык на́ табе: дасведчаныя крыніцы апынуліся не такімі дасведчанымі — каардынаты далі неўпапад.

Магілы бацькі Элізы Ажэшкі Бенедыкта Паўлоўскага (памёр, калі ёй было два гадкі) і старэйшай сястрычкі (памерла яшчэ падлеткам) трэба было мне бачыць, каб запэўніць нябёсы ў светлай згадцы: часам, памёршы, можна толькі ўзмацніць прысутнасць сваю на зямлі. Калі б гэтыя двое жылі сабе і жылі, хто ведае, ці мелі б мы ў сваёй культурнай спадчыне Элізу Ажэшку? Не толькі ж «молат і кавадла» паўстання 1863-га зрабілі з яе пісьменніцу. Душэўны і духоўны перавароты адбыліся ў ёй значна раней — з пахавальнымі звонамі, відавочна. І вось цяпер заўзятая вандроўніца, аматарка твораў Ажэшкі, можа пакланіцца тым, да каго яе ўлюбёнка ішла ўсё жыццё. Ішла так, каб быць вартай сустрэцца з імі — вальтэр'янінам і адзінай сяброўкай дзяцінства.

Што далей? Далей літаральна над Нёманам, паводле аднайменнага твора: наш шэры човен сунецца ўздоўж берага, амаль што над ім навісаючы. Трошкі экстрыму па разбітай дажджом дарозе (называецца, выбралі дзень) — і мы ўжо ў вёсцы Міневічы, дзе некалі стаяў драўляны, на пяць пакояў, дом, што належаў панам Каменскім, якія здавалі яго на лета і цёплую частку восені пані Элізе з усёй яе «не сям'ёй». «Паколькі сям'і не маю, — пісала яна сябру, — то здалёк тая немалая колькасць асоб выглядаць можа дзіўна». Жыла яна тут з «нібыта сям'ёй», складзенай з «нібыта чужых», але «па сутнасці найдаражэйшых».

Што можам бачыць мы ў Міневічах, якія таго дома ўжо не маюць? Увогуле, ёсць тут славутасць, да якой імкнецца кожны турыст: магіла паўстанцаў 1863 года, апісаная ў рамане «Над Нёманам» з такім імпэтам, што чытач няхай там пра яе і чытае. Мы ж выпраўляліся шукаць людзей і спадзяваліся ўбачыць падзёнак. Апошняе магчыма толькі ноччу, ды дождж лье такі, што наўрад ці магчыма ўвогуле. Але чытач няхай верыць, што ўсё будзе добра. Пакуль жа пераступаем парог выпадковай хаты, каб даведацца, скажам, пра ведзьму Слабошыху. Апісваецца яна ў наднёманскіх артыкулах Элізы Ажэшкі як самая сапраўдная прадстаўніца «чартоўскага племені», «досыць злосная». Але ж гаспадыньку выпадкова выбранай хаты мы не палохаем, проста пытаемся пра жанчыну па прозвішчы Слабош, якая жыла тут даўно-даўно, а чым займалася — хіба, маўляў, важна? Адказ — агаломшвае трапнасцю! «Слабошыхі я, дзіцяткі, не ведаю, але да вайны тут жыў дзядзька Слабош, то пра яго ўсе казалі, што чытае ён... чорную магію».



Фота Уладзіміра ЦВІРКІ.

**Літаральна над Нёманам.**

Наступны ў плане пункт — Багатырэвічы таго ж Мастоўскага раёна, у час Элізы Ажэшкі — Гродзенскага павета Лунненскай воласці. Ёсць і тут славутасць, да якой імкнецца кожны турыст: магіла Яна і Цэцыліі, паводле легенды — першых людзей на гэтай зямлі. Легенда расказваецца тут ледзь не кожным. Мы ж зноў шукаем рэальнае — сляды герояў артыкулаў. Напрыклад, шляхціча Стралкоўскага, што меў сад, у які пані Эліза з таварышкамі хадзілі па агрэст і парэчкі. Гэты шляхціч меў дзіўную звычку на любое пытанне адказваць пытаннем: "Я ведаю?" «Калі яго ў самы поўдзень спытаць пра тое, дзень цяпер ці ноч, інакш не адкажа», — іранізавала пісьменніца. І ведаеш што? Знайшлі мы таго гумарыста Стралкоўскага! Лядоўня, якая і па сённяшні дзень у Багатырэвічах існуе (з паўкруглым скляпеннем, каменная), належала «пану, які меў велькі сад». А даведаліся мы пра гэта ад гаспадынькі зноў выпадкова выбранай хаты. Прозвішча гаспадынькі ведаеш, чытач, якім аказалася? Стралкоўская (праўда, па мужы). Містыкус звычайкус, так бы мовіць.

Недзе тут жа стаяў невялікі дамок, жыў у ім «пан Адам». «...і яна ўсё да яго хадзіла. А ён заўсягда замыкаўся, дык яна пастукае ў дзверы: «Пане Адаме, прошэ адэмкнуць». Ён тады: «А-а-а, это Элі-і-іза! Ты як прыедзеш, дык і з-пад пазногця выкалупнеш!» А яна пісала тут кнігу, то ўсё выспрашвала пра даўнія часы, каб яе напісаць. І ён, Адам той, усё ёй расказваў. І прыгаворваў: «Калі ажанюся, дык толькі з Элізай Ажэшкай».

Гэта ўжо іншая гаспадынька расказвае, Тэрэса Багатырэвіч. Такія вандроўкі мо больш цікавыя, чым «экскурсійныя». Тут і экскурсаводы больш апантаныя, і ўражанні больш жывыя.

А падзёнак мы, чытач, даруй за марную надзею, не ўбачылі: дождж працягваў лупіць рэчаіснасць. Людзям ад яго было нічога, а падзёнкам надвор'е не лётнае. Але пад раніцу, прачнуўшыся дзеля рыбы (трэба ж нешта здабыць на сняданак), назіралі мы нешта не менш цікавае. Нешта цалкам супрацьлеглае падзёнкам. Рукакрылыя нявызначаных відаў — мо нетапыры, мо кажаны, а мо шыракавушкі ці начніцы — кружлялі, ловячы насякомых, над самай вадой, у павольным павевтраным вальсе. Як быццам яшчэ не хапала нам містыкі.

**Падарожнічала**
**Святлана ДЗЯНІСАВА.**

## *Рамантыкам*



*З вёскі Паніжаны Эліза Ажэшка «выпісала» сабе для аповесці «Хам» галоўнага героя, Паўла Кабыцкага, і сына яго жонкі Франкі, Хтавіяна. Юбілейны нумар часопіса «Свет» за 1891 год, паказваючы пратапытаў твора, змясціў фотаздымак з подпісам: «Мужыцкая сям'я рыбака Казлоўскага з вёскі наднёманскай Паніжаны. Стары мужык з сеткай — герой аповесці Элізы Ажэшкі «Хам». Кабета ў чапцы — Уляна з той жа аповесці. Хлопец злева — Хтавіян, прыёмны сын Хама, дзіця яго жонкі Франкі». А пані Эліза ніколі і не хавала, што ўсе яе героі рэальна існуюць, хоць і маюць іншыя імёны.*

## *Паслядоўнікам*

*Праехаўшы ўздоўж Нёмана далей — даехаўшы да вёскі Паніжаны, вы можаце ўбачыць цэркаўку, якая пачынала будавацца тады, калі адпачывала тут Эліза Ажэшка. Перад уваходам у яе, абрамляючыся прыступкамі, ляжыць вялікі часаны камень. «Бацюшка наказваў не закрываць яго, таму што гэта ж рукамі людзі высякалі. Хіба цяпер так можна высячаць?» — кажа стараста царквы і вёскі Любоў Якімовіч. У гэтай царкве ўсё так, як было ў цэрквах пазамінулага часу. У тым сэнсе, што гэта сапраўдны партал у мінулае. Раю наведаць.*



## ДАЛЁКА І БЛІЗКА

**14 лістапада ў Тайландзе — фестываль плывучых лодачак з лісця. Гэта калі па-нашаму, а па-іхняму — Лоі Кратонг. Ці, калі зусім ужо рамантычна, свята дванаццатай поўні. Некалі (мабыць, у поўню) жонка аднаго караля (не было бо ёй чым заняцца) зладзіла вялізную чашу (кратонг) з бамбуку і лісця бананаў, ды запоўніла садавінай. І з той пары кожны так робіць, як толькі надыходзіць новая дванаццатая поўня. Па сутнасці, гэта ахвяра вадзе, па якой кратонгі плывуць воляй ветру і сілай цячэння.**



Свята новага бажале трэба бачыць на ўласныя вочы і асабіста ў ім браць удзел — каб не казаць пасля, як казалі раней манархі, што віно на поўнач ад Ліёна вельмі кіслае і на стол яго лепш не ставіць. Проста яно, бажале, вельмі нядоўга захоўваецца. Але ж і паспявае раней, чым, скажам, бардо. Іншымі словамі, час паспытаць бажале. 17 лістапада сустракаймася для гэтага ў Францыі.

**Да 4 снежня ў Мінску, у Доме-музеі І з'езда РСДРП, паказваюць свет старажытных людзей. Вось дзе аўстралапітэкі, пітэкантрапы, неандэртальцы, іншыя гуманоіды і — увага! — чалавек будучыні сустрэліся ў адным месцы, ды — яшчэ увага! — згодныя з вамі сфатаграфавацца.**

Мерапрыемства ў духу твораў незабыўнага Хагарда — свята старажытнай багіні племені майя па імені Ішчэль (перакладаецца як Вясёлка) — плануецца правесці ў Мексіцы 8 снежня. Два дзясяткі кіламетраў ад паўвострава Юкатан — і вы паначартасны ўдзельнік працэсій і рытуалаў у гонар Павуціны, Якая Ловіць Ранішнюю Расу. Гэта яшчэ адно імя жонкі вярхоўнага бога Іцамны, той самай Ішчэль, ці Вясёлкі.



**У Полацку ў музеі гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора праходзіць выстава геральдычнай кафлі. Стагоддзі — ад XVI да XVIII, экспанаты — былая нечая ўласнасць: Друцкіх-Сакалінскіх, Кішкаў, Шантыраў, Дарагастайскіх... Уражвае.**

Музей прыроды і экалогіі, што ў Траецкім прадмесці Мінска, запрашае паглядзець на насякомаедныя расліны. Доступ да тых, што харчуюцца насякомымі, яшчаркамі, грызунамі і жабкамі, адкрыты ажно да 22 студзеня.



■ З уласнага досведу

# Выхаванне гульнёй,

## або Як прывучыць дзяцей прыбіраць за сабой цацкі

*У нашай сям'і (як, думаю, у кожнай, дзе ёсць маленькія дзеці) была праблема «раскіданых цацак». Малыя гулялі са сваімі машынкамі, канструктарамі, галаваломкамі, кубікамі і перад сном пакідалі ўсё гэта на падлозе... І, як вы думаеце, хто за імі прыбіраў? Прывільна — мама.*

*Вядома, працей і хутчэй самой навесці парадак у дзіцячым пакоі. Я раней таксама так думала. Пакуль не зразумела: сёння гэта цацкі на падлозе, а заўтра — камусьці дастанецца неахайная жонка ці муж. Таму настойліва заклікаю ўсіх бацькоў знайсці паўгадзінкі вольнага часу, выдыхнуць і адчуць важнасць моманту. Найлепшы спосаб прывучыць дзяцей прыбіраць за сабой — захапіць іх гэтай, на першы погляд, сумнай справай. Вось некалькі прыкладаў сумесных гульняў, якія дапамаглі мне ў свой час.*

**Гульня 1. Следчыя**

Скажыце дзіцяці, што яго любімы плюшавы мішка страціў сярод цацак бірульку і вельмі засмуціўся. «Давай яму дапаможам», — прапануйце малечы і пасля гэтых слоў самі пачніце падымаць цацкі і складаць іх у скрыню. Глядзячы на вас, дзіця таксама пачне шукаць бірульку. Непрыкметна падкладзіце «страту» пад апошнюю цацку. Малеча знойдзе яе і будзе радавацца. Няхай мішка падзякуе за знаходку.

**Гульня 2. Запасы на зіму**

«Давай уявім, што мы з табой у лесе. Ты — вавёрачка, а я — зайка. Нам трэба будзе рыхтавацца да зімы. Вавёрачка будзе збіраць арэшкі (кубікі), а зайка — смачную капусту (машынкі). У кago камора (кошык, скрыня) напоўніцца хутчэй, той і выйграў». Пры гэтым можна ўключыць вясёлую песеньку, якая падыме настрой вашаму жэўжыку і заадно разаўе музычны слых.

**Гульня 3. Цур, я ў доміку**

Для кожнага віду цацак можна прыдумаць сваю скрынку — домік. Назва залежыць ад вашай фантазіі — «Домік для мяккіх цацак», «Домік для кубікаў»... Можна аформіць іх разам з дзецьмі, выкарыстоўваючы выразаныя карцінкі з часопісаў ці проста каляровую паперу. Дзіця, якое зрабіла сваімі рукамі домік для цацак, будзе выкарыстоўваць яго па прызначэнні і пад вечар з задавальненнем прыбіраць туды сваіх цацачных сяброў.

**Гульня 4. Будаўнікі і паштальёны**

Прапануйце сыну пагуляць у будоўлю, каб ён быў у ролі пад'ёмнага крана, які дастаўляе ўсе цацкі ў патрэбныя месцы. А дачушка няхай часова пабудзе работніцай пошты, якая пакуе пасылкі. Вы нават не ўяўляеце, як дзяцей весяліць такая гульня!

**Гульня 5. Хто хутчэй?**

Уладкуйце «Алімпійскія гульні»: падзяліце пакой на дзве часткі і прыбірайце кожны сваю палову на хуткасць. Выйграе той, хто хутчэй прыбярэ сваю частку пакоя.



**Гульня 6. Нам не страшны шэры воўк**

Прапануйце дзіцяці расласці ўсе цацкі па іх характарыстыках. Маленькія асобна ад вялікіх, мяккія — на адну паліцу, лялькі (салдацікі, робаты) — на іншую, кубікі — у адну скрынку, канструктар «Лега» — у іншую. Пацікаўцеся ў малечы: «Ці ёсць у цябе цацкі круглай (квадратнай, чырвонага колеру і г.д.) формы?» Ён іх адразу вам пакажа, а далей справа вашай фантазіі. Напрыклад: «Так, гэта чырвоная машынка. А дзе яе гараж?» (Дзе домік лялькі? Дзе жывуць мячыкі?) Калі ж дзіця толькі адказвае «Там!» і не спяшаецца саджаць ляльку на яе законнае месца, то можна перапытваць і гэта дзеянне ў гульню. Раскажыце, як лялька Маша вярталася «дадому» на паліцу, якія прыгоды з ёй адбыліся ў дарозе. Магчыма, ёй сустрэліся шэры воўк, Бармалей або Кашчэй Бессмяротны? Падкажыце дзіцяці, што лялькі неабходна яго дапамога і суправаджэнне да «дома». І наступны раз яно само не захоча пакідаць любімага слоніка або ляльку сам-насам з сур'ёзнымі небяспекамі!

**Гульня 7. Загадкі-збіралкі**

Апішыце малому прадмет, які ён павінен знайсці: «Гэта чырвонае і круглае». Здагадаўся? Вядома, мяч. Давай яго хутчэй пакладзем у кошык. А цяпер трэба знайсці тое, чым можна пісаць і маляваць. Правільна, гэта ручкі і алоўкі. Іх паставім у спецыяльную шкляначку на стале.

**Гульня 8. Госці для лялькі**

У любімай лялькі Машы сёння свята? Выдатна, будзем сустракаць гасцей. А як жа запрасіць кагосьці ў дом, калі ў ім такі вэрхал. Хутчэй давай навядзем парадак у пакоі. Пасля таго як дзіця збярэ цацкі, зрабіце невялікае чаяванне з лялькамі.

***Малечы імгненна ўключаюцца ў прапанаваныя бацькамі «конкурсы», нават няма неабходнасці абяцаць ім прызы. Шчыры ўдзел мамы ды адсутнасць у таты незадаволенага погляду, адцягненага ад «мега-важных» спраў, — лепшая ўзнагарода для дзіцяці! Калі вы ўсё ж такі хочаце паабяцаць які-небудзь заахвочвальны прыз — лепш, калі гэта будзе штосьці не матэрыяльнае. Напрыклад, прагляд мультфільма, сумесная прагулка, чытанне любімай казкі.***

***Калі вы вырашылі прывучаць малога да ўборкі, то гуляйце разам штодзень, праяўляйце фантазію і прыдумвайце новыя гульні. Пры гэтым не забывайцеся кожны раз хваліць дзіця: «Як добра ты ўсё прыбраў!» Пахвала — самая моцная матывацыя.***

**Ідэямі дзялілася мама са стажам Аляксандра ЗДОР.**

**А як вы прывучылі сваіх дзяцей прыбіраць за сабой? Лістуйце!**

■ Беларусікі

**Хлопчык Мацейка жыве ў Оршы са сваімі бацькамі. Яму ідзе трэці годзік, і ён ведае ўжо шмат казак і забаўлянак. Мацейкава бабуля — настаўніца роднай мовы. Для ўнука яна купіла вышыванку, саматканы пояс і зладзіла восеньскую фотасесію.**



***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымкі вашых дачушак і сыночкаў, унучкаў і ўнучачак, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім, 4-5 сказаў, аповедам пра фота) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж было зразумела, што гэта «беларусік». Арыгінальнасць і творчы падыход вітаецца! Аднаго з беларусікаў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз***






# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**ПАКАШТУЙЦЕ!**



## Марынаваныя галубцы з морквай па-карэйску

Лісце капусты бланшыраваць як на звычайныя галубцы. Прыгатаваць фарш з морквы, надзёртай па-карэйску, і часнаку. Закрасіць яго прыправай для карэйскай морквы. Начыніць гэтым фаршам галубцы. Скласці іх у слоічкі і заліць расолам — на 1 літр вады: 1,5 ст. л. солі, 0,5 шклянкі цукру, 0,5 шклянкі алею, 0,5 шклянкі воцату 9%, лаўровы ліст, перац чорны гарошкам.

Усё даводзім да кіпення. Гэтым марынадам заліваем галубцы, 30 хвілін стэрылізуем і пад «футра». Зімой адкрываем нашы марынаваныя галубцы і атрымліваем асалоду.

## Пірог «Яблычны Спас»



**Пірог уяўляе сабой удалае спалучэнне рассыпістага пясочнага цеста, мяккага далікатнага ванільнага тварагу, салодкіх яблыкаў з карычнай ноткай і верхняга пласта безэ.**

*Спатрэбіцца. Для цеста: 1,5 шклянкі мукі, 2 ст. л. цукру, 100 г сметанковага маргарыну (можна ўзяць масла), 50 г смятаны, 1 жаўток, 0,5 ч. л. соды. Для тварожнага пласта: 250 г тварагу, 3 ст. л. цукру, 1 жаўток, ванілін. Для яблычнага пласта: 4-5 сярэдніх яблыкаў, карыца. Для безэ (суфле): 2 бялкі ад вялікіх яек, цукар.*

Разаграваем духоўку да 180—190 °С. Злучаем жаўток, цукар, растоплены маргарын, смятану, разрыхляльнік; змешваем да аднароднай масы. У сумесь прасейваем муку, замешваем мяккае пясочнае цеста. Размяркоўваем яго па форме, робім невысокія борцікі, праколваем відэльцам.

Тварог расціраем з цукрам, жаўтком, ванілінам. Размяркоўваем тварожную масу над пясочнай. Чысцім яблыкі ад скуркі і ад насення, наразаем на тонкія скрылікі. Раўнамерна выкладваем яблычныя кавалачкі на тварожны пласт, пасыпаем карыцай. Ставім пірог у духоўку і выпякаем 25—30 хвілін.

Тым часам рыхтуем безэ: узбіваем бялкі, паступова дадаём цукар. Для суфле досыць пары лыжак цукру, а для безэ трэба больш. У любым выпадку бялкі трэба ўзбіваць да ўстойлівых пікаў. Выкладваем бялковую масу на верх пірага і выпякаем яшчэ 10—15 хвілін (агонь зменшыць да 170 °С).

**САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ**

## Сакрэты, пра якія не раскажа ні адзін цырульнік

**Выйшла з цырульні — прыгажуня, капа бліскучых валасоў на галаве струменіцца па плячах, валасок да валаска. Паўтарыла тое ж самае дома — і суцэльнае расчараванне. А ўсё таму, што цырульнікі ведаюць некалькі сакрэтаў, пра якія не любяць распаўсюджваца.**

**Уся ўвага кончыкам.** Толькі тым, у каго сапраўды сухая скура галавы, патрабуецца дадатковае ўвільгатненне кандыцыянерам па ўсёй даўжыні валасоў, у тым ліку і каранёў. Звычайна ж скура штодня вылучае дастатковую колькасць тлушчу, таму калі галава не мыецца кожны дзень, то кандыцыянер, нанесены на карані, толькі ўцяжарыць валасы і зробіць іх візуальна бруднымі. Таму цырульнікі раяць наносіць кандыцыянер максімум на 2/3 даўжыні валасоў.

**Лакіруем невідзімкі.** Каб невідзімкі не спаўзалі, трэба запомніць адну хітрасць. Перш чым іх закалоць, пакладзіце заколкі на ручнік ці папяровыя сурвэткі і пырсніце на іх трохі лаку для валасоў. Дайце падсохнуць хвіліну-дзве.

**Пераходзім на шоўк.** Усе даўно ведаюць пра тое, што калі валасы выцерці кавалкам шаўковай тканіны, то яны набудуць неверагодны бляск. Але мала хто ведае, што і спаць лепш на шаўковай або атласнай падушцы. Бавоўна ўбірае ў сябе вільгаць з валасоў, і з-за гэтага з'яўляецца раніцай прычоска вядомая як «выбух на макаронай фабрыцы».

**Масіруем галаву.** Штодзённы масаж галавы падчас душу можа здацца пустым марнаваннем часу, але ён сапраўды стымулюе рост валасоў і ўзмацняе карані.

**Грэбень.** Большасць людзей на працягу многіх гадоў робяць адну і тую ж памылку — расчэсваюць вільготныя валасы масажнай шчоткай. Гэтага нельга рабіць ні ў якім разе. Замест яе лепш узяць грэбень з рэдкімі зубамі, валасы пацерпяць нашмат менш.

**Не тым бокам.** Усё жыццё ўсе пагалоўна заколваюць невідзімкі хвалістым бокам уверх. На самай жа справе ўсё павінна быць наадварот. Хвалісты бок якраз і быў прыдуманы для таго, каб лягчэй было збіраць валасы, а вось прамы — для таго каб іх утрымліваць.




**Хаваем карані.** Калі валасы фарбаваліся даўно, давядзіцца хаваць карані, якія адраслі. Для гэтага спатрэбяцца сухі шампунь (усё роўна, што галава чыстая) і грэбень, з дапамогай якіх робім зігзагападобны прабор.

**Непаслухмяныя валасы.** Заўсёды ёсць дзве-тры валасінкі, якія зусім не жадаюць слухацца і класціся ў адведзенае для іх месца. Не трэба паліваць усю галаву лакам. Спатрэбіцца звычайная зубная шчотка, на якую пырскаюць лак. А потым акуратна ўсё ўкладваецца на месца.

**Пышны хвост.** Як ні сумна, але часам на галаве «ўсяго тры валасіны», з якіх атрымліваецца неконскі хвост, а хіба што мышыны хвосцік. Ёсць сакрэт, які дапаможа візуальна зрабіць хвост пышным і прыгожым. Пасля таго як завязаны звычайны хвост, трэба падзяліць яго на верхнюю і ніжнюю частку і закалоць у сярэдзіне маленькі крабік.

*ЖОНКА, ЯКАЯ НЕ ВЯДЗЕ МУЖА НАПЕРАД, АБАВЯЗКОВА ШТУРХАЕ ЯГО НАЗАД (Джон Міль).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

# МЕТАЛУРГІ З ДАЛІНЫ

**Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з дырэктарам унікальнага прадпрыемства, на якое заказчыкі едуць нават з Ульянаўска, — Лідскага завода гарачага цынкавання «Конус» Андрэем ЖАМОЙДА.**



**ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ**

*Родам з суседняй Бярозаўкі. Пасля службы ў арміі працаваў вадзіцелем у сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі, потым перайшоў на шклозавод «Нёман». Пачынаў з рабочага, хімпаліроўшчыка. У хуткім часе быў прызначаны майстрам змены. Далейшыя прыступкі службовай лесвіцы: намеснік начальніка цэха, вядучы інжынер, начальнік навукова-тэхнічнага цэнтра. Затым намеснік галоўнага інжынера, намеснік дырэктара, галоўны інжынер шклозавода. У 2013 годзе сям'я змяніла месца жыхарства, пераехала ў Ліду, і яго кандыдатура была ўзгоднена на пасаду кіраўніка дзяржаўнага прадпрыемства «Конус».*



**Сімвалам і своеасаблівым талісманам прадпрыемства з'яўляецца Зеўс-грамавержац, яго металічная фігура ўзвышаецца перад уваходам у будынак завода.**

— Ідэя стварэння нашага прадпрыемства з'явілася ў Нацыянальнай акадэміі навук яшчэ ў 2008 годзе, — расказвае Андрэй Пятровіч. — У рэспубліцы на той час прадпрыемствы па гарачым цынкаванні адсутнічалі, а патрэба ў іх была велізарная. Вялася татальная мадэрнізацыя малочна-таварных фермаў, і неабходна было абараняць абсталяванне ад агрэсіўнага асяроддзя, якое выклікала карозію металу. А найлепшая абарона ад карозіі — гарачы цынк, бо фарбаванне вырашае праблему толькі часова.

У гэты час кіраўнік краіны паставіў задачу прывесці ў парадак дарогі, асноўныя транспартныя артэрыі. І патрэбна была дапамога ў апрацоўцы гарачым цынкам шматлікіх металаканструкцый — адбойнікаў, агароджаў, сетак ад жывёлы і гэтак далей.

У выніку вясной 2010 года Прэзідэнт падпісаў адпаведны Указ. Месцам размяшчэння была выбрана вёска Даліна на ўскрайку Ліды, у свабоднай эканамічнай зоне Гродна, што дало шэраг прэферэнцый.

Першы камень у падмурак завода быў закладзены ў канцы 2010 года з удзелам прэм'ер-міністра, старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, губернатара, кіраўніцтва РНПЦ па механізацыі сельскай гаспадаркі — а гэта наш галоўны заснавальнік — і мясцовай выканаўчай улады.

Пабудавалі прадпрыемства хутка. У кастрычніку 2011-га адбылося распальванне ванны для цынкавання. Затраты на наша будаўніцтва склалі больш за 20 мільёнаў долараў. Усё гэта былі пазыковыя сродкі, якія патрэбна да канца 2018 года вярнуць. Абсталяванне паставіла кампанія Джымека, якая выйграла конкурс. Яе абсталяванне лепш за ўсё падыходзіла па тэхнічных параметрах, як і прапанаваная тэхналогія.

Пасля завяршэння пусканаладачных работ у сакавіку 2012 года атрымалі першую прадукцыю. З таго моманту прадпрыемства прыступіла да аказання паслуг па гарачым ацынкаванні. Пры гэтым працягваем развівацца, і дастаткова дынамічна. Завод штогод дабаўляе аб'ёмы ацынкавання халодных сталяў і металаканструкцый.

**— Але спачатку былі пэўныя складанасці з заказамі. Як вы з імі справіліся?**

— Пэўныя складанасці ў самым пачатку былі звязаны з тым, што ў тэхнічных дакументах прадпрыемстваў такі важны пункт, як абарона ад карозіі, быў запісаны недзе ў самым канцы. І каб загрузіць свае магутнасці, мы выбралі два кірункі. Па-першае, служба маркетынгу ўшчыльную занялася вывучэннем рынку — як унутры Беларусі, такі і ў блізкім замежжы. І пачала актыўна прапаноўваць нашы паслугі. І па-другое, паклапаціліся пра ўнясенне змяненняў у нарматыўную дакументацыю, каб гарачае цынкаванне паставіць у прыярытэт. Праводзілі нарады на шэрагу прадпрыемстваў, з буйнымі арганізацыямі, з намеснікамі міністраў усіх зацікаўленых міністэрстваў, якія маглі стаць і сталі асноўнымі заказчыкамі.

У выніку агульных старанняў у 2015 годзе быў падпісаны дакумент, які ўносіў змяненні ў нарматыўную дакументацыю. І сёння сярод мерапрыемстваў па абароне ад карозіі гарачае ацынкаванне знаходзіцца наперадзе. Усё, што ўзводзіцца ў краіне і дзе дазваляюць тэхнічныя магчымасці, цынкуецца. У выніку эканомяцца надзвычай вялікія сродкі — як непасрэдна для заказчыка, так і для краіны ў цэлым. Бо мінімальны тэрмін эксплуатацыі вырабаў, пакрытых гарачым цынкам, — 25 гадоў і больш. А практыка паказвае, што такія вырабы могуць служыць у сярэднім 50 гадоў. У той час, як любое лака-фарбавае пакрыццё служыць два-тры гады. Узровень абароны металу зусім іншы.



**Ацынкоўшчыкі Дзмітрый КІСЛЫ і Аляксандр КІСЛЯК працуюць у ахоўным спецадзенні — побач расплаўлены метал, тэмпература якога дасягае 450 градусаў па Цэльсію.**

Напрацаваны пэўны вопыт, і сёння да нас едуць па яго дзясяткі прадстаўнікоў заводаў Расіі, Прыбалтыкі, Польшчы. Калі паглядзець ролікі, знятыя падчас нашых паездак да замежных калег, то вы пераканаецеся, што наша вытворчасць — найбольш передавая і з пункту гледжання арганізацыі, і з пункту гледжання тэхналогій, тэхнікі бяспекі. Нават на еўрапейскіх прадпрыемствах (не будзем канкрэтызаваць, каб нікога не пакрыўдзіць) устаноўлены невялікія адкрытыя ванны для падрыхтоўкі вырабаў



**У гэтай самай вялікай у Еўропе ванне гарачага цынкавання апрацоўваюць металаканструкцыі вагою да шасці тон.**

У нас — на малекулярным узроўні.

Потым мы пайшлі далей і цяпер абараняем самае дарагое для любога прадпрыемства, асяродак любой вытворчасці — сучаснае тэхналагічнае абсталяванне. Заключылі кантракт на суправаджэнне нашых работ з нямецкай кампаніяй «Хервік», якая пастаўляе сучасныя тэхналогіі цынкавання і хімічныя інгрэдыенты.

да цынкавання, ванна для цынкавання, у якой — расплаўлены метал, яго тэмпература 450 градусаў. У вытворчасці прымяняецца значна большы працэнт ручной работы, чым у нас. Персанал, які абслугоўвае працэс, дыхае парамі салянай кіслаты на працягу змены, і гэта лічыцца нормай. У нас жа працуе аўтаматызаваная лінія, а ванны падрыхтоўкі вырабаў да цынкавання размешчаны ў ахоўна-выцяжным корабе. Ванна з цынкам даўжынёй 15 метраў таксама закрытая, бакавыя сценкі яе аўтаматычна паднімаюцца толькі для выканання вельмі невялікай колькасці аперацый, скажам, ачысткі цынкавага люстэрка. Усімі асноўнымі працэсамі кіруе аўтаматыка па зададзенай праграме. У залежнасці ад металу, ад таго, наколькі ён пашкоджаны іржой, на камп'ютары выстаўляецца час траўлення, іншых аперацый. А іх па тэхналогіі шмат — абястлушчванне паверхні, прамыўка, флюсаванне, сушка і іншыя. Шмат сваіх нюансаў. Скажам, таўшчыня цынкавага пакрыцця можа быць ад 40 да 200 мкм — у залежнасці ад маркі сталі, таўшчыні металу і пажадання заказчыка.

Прадукцыйнасць лініі — да 3 000 тон металу ў месяц. Але ў сваёй рабоце на першы план ставім нават не колькасць, а якасць, культуру вытворчасці. На гэта нацэлены аддзел тэхнічнага кантролю, кантралёры якога таўшчынамерам замяраюць таўшчыню пакрыцця, даследуюць знешні выгляд, каб не было не пакрытых цынкам участкаў, наплываў, уздуццяў. Праводзіцца рэгулярная праверка ўсіх працэсаў і вырабаў з запісам у журналах. Працуе сістэма менеджменту якасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ISO 9001-2009. Сучаснае кіраванне якасцю на прадпрыемстве развіваецца па кірунку папярэджання памылак, і гэта дае большы эфект, чым іх выяўленне і выпраўленне. Акрамя таго, пытаннямі якасці займаецца не толькі аддзел тэхнічнага кантролю, яны сталі клопатам кожнага.

Так што ў пераліку прыярытэтаў спачатку ідзе якасць, потым — тэрміны выканання работ, і толькі тады — цана. Дзякуючы гэтаму ў структуры заказаў больш за 50 працэнтаў — заказы на экспарт. Прыток валюты ў краіну перавысіў 3 мільёны 200 тысяч долараў.

**— Але ж пералік сваіх паслуг вы не абмяжоўваеце толькі ацынкаваннем.**

— Аказваем паслугі па лагістыцы, для чаго арандуем транспарт і маем свой транспартны цэх. У тым ліку вялікагрузныя аўтамабілі, на якіх дастаўляем у Расію буйнагабарытныя дэталі. 800 тысяч долараў зарабілі на лагістыцы.

Выконваем заяўкі на падрыхтоўку металаканструкцый да гарачага цынкавання, а гэта 10 працэнтаў ад кошту паслугі. Плюс займаемся ўпакоўкай, што таксама мае сваю цану. І гэта дае магчымасць кожнаму структурнаму падраздзяленню акупляць сябе, а прадпрыемству падтрымліваць вытворчы працэс на высокатэхналагічным узроўні.

Асвойваем сумежныя, скажам так, прафесіі. Наладзілі вытворчасць металічных апор асвятлення — як па тыпавых, так і індывідуальных праектах.

**— Наколькі нам вядома, стараннe калектыву заўважана.**

— Па выніках работы за 2014 год калектыў стаў лідарам галіны. У мінулым годзе завод гарачага цынкавання названы найлепшым з сарака прадпрыемстваў Лідчыны. Усё гэта — дзякуючы нашым спецыялістам, рабочым. Без спрактыкаванага спецыяліста нічога не даб'ешся. Да нас часта прыязджаюць замежныя калегі, у якіх тэхналогіі — найноўшыя і хапае грошай на пастаяннае абнаўленне абсталявання. А нешта не атрымліваецца так, як хацелася б. Бо гарачае ацынкаванне патрабуе ідэальнага выканання тэхналогіі. Распытваюць, якія ў нас сакрэты. А галоўны сакрэт — нашы людзі. Сёння калектыў сфарміраваны дасведчаны, з любымі праблемамі спраўляецца.

У сваю чаргу, клапоцімся пра калектыў. Людзей збіраюць і прывозяць на змену і развозяць са змены свае аўтобусы. Створаны цудоўныя бытавыя ўмовы — як і мае быць на новым прадпрыемстве. Набываем сродкі індывідуальнай абароны, форменнае адзенне, уцепленыя курткі, каб людзі на змене адчувалі сябе камфортна. Усе работнікі застрахаваны, і кожны абслугоўваецца ў гарадской паліклініцы без чаргі. Аказваем адчувальную матэрыяльную дапамогу для закупкі сельскагаспадарчай прадукцыі, збораў дзяцей у школу перад новым навучальным годам. Працуе пакой прыёму ежы. Сярэдні заробак — каля васьміста рублёў.

**— Якімі заказамі ганарыцеся, Андрэй Пятровіч?**

— У Беларусі толькі два прадпрыемствы гарачага цынкавання. У Расіі — 63. Чаму тады расіяне вязуць за паўтары тысячы кіламетраў свае заказы нам? Не толькі з Санкт-Пецярбурга і Маскоўскай вобласці, але і нават з Ульянаўска. Іх задавальняе якасць. Так што калі паступае ад суседзяў заказ на гарачае цынкаванне дастаткова складаных кабелянясучых канструкцый, а гэта выраб з тонкага ліставога металу, досыць капрызны, са сваім «характарам», то гэта выклікае пачуццё задаволенасці і гонару за свой калектыў. Раней Расія цынкавала такія канструкцыі ў Сербіі, Аўстрыі, Польшчы, Італіі. А цяпер цынкуецца толькі ў нас.

Уласна кажучы, да любога заказу адносімся адказна — да апор ЛЭП ці вулічнага асвятлення, вышак сотавай сувязі, апор канатных дарог, кантэйнераў па зборы адходаў для ЖКГ, тым больш — вугалкоў для апор ліній электраперадач на Беларускую АЭС, труб, металічных лесвіц, канструкцый для марскіх партоў.

**— Раскажыце, калі ласка, пра сувязь з навукай.**

— Мы цесна працуем з Нацыянальнай акадэміяй навук, з іх боку аказваецца значная дапамога. Дзякуючы гэтым кантактам дабіліся таго, што вытворчасць наша стала безадходнай, усе адходы пасля цынкавання прадаём на біржы і атрымліваем грошы. Можна сказаць, што наш вытворчы цыкл цалкам наблізіўся да замкнутага. У Еўропе да гэтага толькі ідуць, у суседзяў-расіян такога няма. Еўрапейская асацыяцыя ацынкоўшчыкаў ужо раіць некаторым замежным прадпрыемствам прыехаць да нас і павучыцца.



**Канструкцыі, пакрытыя ахоўным антыкаразійным слоем цынка, гатовыя да адпраўкі заказчыку. На пярэднім плане кладаўшчыца Святлана КАРАБАЧ.**

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

**Ад рэдакцыі.** Творчая група шчыра дзякуе за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі начальніку аддзела маркетынгу Сяргею Буракевічу і начальніку аддзела тэхнічнага кантролю Івану Толкачу.

УНП 500015616

■ Гасціннасць

# ПА КАЛАРЫТ — У БЕЛАРУСЬ

**Расійскія чытачы часопіса «National Geographic» лічаць нашу краіну найлепшай для агратурызму.**

Напачатку восені выданне праводзіла штогадовы конкурс «National Geographic Traveler Awards», пераможцаў якога вызначаюць пры дапамозе чытацкага галасавання. Па яго выніках, найлепшай краінай у катэгорыі «Агратурызм» стала Беларусь, якая набрала 24 працэнты галасоў і апярэдзіла такіх канкурэнтаў, як Італія (22 працэнты), Францыя (20), Расія (18), Грузія (9), і іншыя. Акрамя гэтага, чытачы часопіса ацанілі і магчымасці аздараўленчага адпачынку ў нашай краіне. У гэтай намінацыі яна заняла пятае месца, уступіўшы Ізраілю, Чэхіі, Венгрыі і Расіі.

Усяго галасаванне праводзілася па 23 катэгорыях. Сярод іншых пераможцамі сталі такія краіны, як Іспанія («Пляжны адпачынак»), Балгарыя («Сямейны адпачынак»), Італія («Экскурсійны адпачынак»), Аўстрыя («Гарналыжны адпачынак»), Швецыя («Экаадпачынак»), Індыя («Прыгодніцкі адпачынак»), Грузія («Адкрыццё года»), Куба («Экзатычны адпачынак»), Кітай («Найлепшы гастранамічны тур»).

Трэба адзначыць, што цікавасць расійскіх аматараў вандровак да Беларусі цяпер становіцца тэндэнцыяй. Так, толькі за апошні час Беларусь стала для нашых усходніх суседзяў самым запатрабаваным маршрутам гастранамічнага турызму, а сталіца краіны стабільна ўваходзіць у топ-3 найбольш папулярных месцаў адпачынку грамадзян Расіі падчас самых розных святаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Адкрыты заклік

# ФАРБЫ — БЕЗ СВІНЦУ!

**Эколагі заклікаюць вытворцаў адмовіцца ад свінцу ў фарбах**



**Эмалевыя лакафарбавыя вырабы з гэтым небяспечным кампанентам усё яшчэ сустракаюцца ў многіх краінах, у тым ліку ў нашай, а гэта і сур'ёзныя захворванні правакуе, і навакольле забруджвае. Цэнтр экалагічных рашэнняў накіраваў адкрытыя пісьмы беларускім вытворцам фарбаў, імпарцёрам і буйным гандлёвым сеткам.**

— Мы просім вытворцаў, якія працягваюць выкарыстоўваць свінец у фарбах, адмовіцца ад гэтага, — кажа **дырэктар цэнтра Яўген ЛАБАНАЎ.** — Настойваем на ўзмацненні кантролю над сыравінай на наяўнасць свінцу. Акрамя таго, рэкамендуем вытворцам, якія перайшлі ўжо на больш дружалюбныя і бясшкодныя практыкі, дзяліцца сваім вопытам з калегамі і інфармаваць аб гэтым спажыўцоў з дапамогай спецыяльнай маркіроўкі. А імпарцёраў і гандлёвыя сеткі просім аддаваць перавагу фарбам без свінцу.

Цэлы шэраг эмалевых фарбаў, даступных на беларускім рынку, змяшчае свінец у рознай канцэнтрацыі, а санітарныя нормы дапускаюць у нас наяўнасць свінцу ў фарбах, і дапушчальныя значэнні намнога вышэй, чым у ЕС і ЗША. Між тым пра таксічнасць свінцу вядома даўно. Бяспечнага ўзроўню ўздзеяння рэчыва не існуе. Асабліва таксічны свінец для нервовай сістэмы дзяцей, ён можа выклікаць цяжкія і незваротныя наступствы.

Цэнтр экалагічных рашэнняў працягвае грамадскую кампанію з прыцягненнем вытворцаў, імпарцёраў, гандлёвых сетак і спажыўцоў для дасягнення поўнай забароны выкарыстання свінцу ў фарбах, прызначаных для памяшканняў. Вытворцы, дарэчы, спасылаюцца пакуль на падаражанне магчымага новага прадукту, аднак у сапраўднасці гэта не зусім так. Тым часам выбірайце водараспаральныя фарбы, а таксама памятайце, што да ліку асабліва небяспечных адносяць чырвоную, жоўтую, аранжавую і белую фарбы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# Каб за прыгажосць не заплаціць здароўем



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

...Але ж у Антаніны Пятроўны, былой медсястры, пракалвалі амаль усе дзяўчаты з іх класа гадоў восем таму. Тады яна крыху баялася і вось толькі зараз адважылася. Да пажылой жанчыны з суседняга дома і цяпер бегаюць дзяўчынкі-школьніцы, якія хочуць насіць завушніцы. Хоць гэтую працэдуру даўно можна зрабіць у медыцынскай установе.

Аксана, спецыяліст з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй, ведае, што даказаць цяпер нічога немагчыма, але зараз яна і дзясятаму закажа неабачліва ставіцца да свайго здароўя. Бо наступствы перанесенага ў вострай форме гепатыту могуць даваць аб сабе знаць усё далейшае жыццё.

Прыведзеная вышэй гісторыя — карцінка з натуры аднаго раённага стацыянара. І такіх, альбо крыху іншых карцінак, на жаль, можна накрэсліць вельмі шмат. Толькі ў Брэсцкай вобласці за першыя дзевяць месяцаў года выяўлена 662 новыя выпадкі вірусных гепатытаў з парэнтэральным механізмам заражэння. У вострай форме, як было апісана вышэй, хвароба працякала ў 1,6 працэнта пацыентаў, астатнія хварэюць у хранічнай форме альбо сталі носьбітамі віруса. І варта адзначыць, што большасць людзей атрымалі гэту небяспечную хваробу палавым шляхам, што абумоўлена паводзінамі людзей, іх асабістым выбарам.

Але, як паведаміла **Тацяна КОРЧЫК, якая выконвае абавязкі галоўнага ўрача Брэсцкага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя,** прааналізаваўшы ўсе выпадкі, урачы атрымалі падставу для меркавання, што 26 чалавек захварэлі пасля розных немедыцынскіх маніпуляцый. Напрыклад, гэта магло здарыцца ў цырульні пры карыстанні інструментамі, якія патрабуюць правільнай дэзынфекцыі пры адсутнасці апошняй.

У ходзе сёлетняга эпідэміялагічнага расследавання гепатытаў В і С у 17 чалавек, якія жывуць у Пінску, Кобрынскім, Бярозаўскім, Івацэвіцкім і Ляхавіцкім раёнах, спецыялісты не выключылі магчымасць інфіцыравання пры правядзенні манікюру, педыкюру, нарошчванні пазногцяў па-за спецыялізаванымі аб'ектамі, часцей за ўсё — па месцы пражывання.

Восем чалавек, гаворка ідзе пра жыхароў Пружанскага, Лунінецкага, Драгічынскага, Кобрынскага раёнаў, захварэлі пасля нанясення татуіровак, адзін — пасля пракалвання вушэй. Сцвярджаць адназначна пра тую ці іншую крыніцу віруса ніхто не мае права, але, як кажуць спецыялісты, надта ж ужо характэрныя супадзенні.

Паводле слоў **загадчыка аддзела камунальнай гігіены абласнога ЦГЭГЗ Максіма БАГДАНОВІЧА,** сёлета санэпідслужба асабліва ўпор зрабіла на праверкі цырульняў і салонаў прыгажосці. За студзень-верасень было праверана 347 названых устаноў. Рознага кшталту парушэнні выяўлены ў 80 працэнтаў правераных аб'ектаў, у тым ліку ёсць хібы непасрэдна пры аказанні паслуг. Максім Сяргеевіч падкрэсліў, што спецыялісты ва ўсіх раёнах маюць тыповыя праграмы кантролю якасці названых паслуг. І накіроўваючыся на праверку, стараюцца асаблівую ўвагу ўдзяліць галоўным складальнікам бяспекі. Напрыклад, калі ў цырульні не памытая падлога, гэта таксама парушэнне, за якое трэба спытаць з кіраўніка. Але ж нават неспецыяліст разумее, што заразіцца тым жа гепатытам з прычыны бруднай падлогі нельга. Іншая справа — не апрацаваныя належным чынам нажніцы альбо шчыпцы. Гэта альфа і амега работы цырульніка. Максім Багдановіч лічыць, што работнікі сферы бытавога абслугоўвання ў абсалютнай большасці сваёй разумеюць адказнасць. Ні сёлета, ні летась не было выяўлена выпадкаў гепатыту ці іншых інфекцый, дзе б людзі наракалі на легальныя цырульні.

— А вось падпольныя, паўпадпольныя кабінеты, майстры па выкліку пакуль з'яўляюцца праблемай, — сказала **загадчыца аддзела эпідэміялогіі Алена ПАДУШКІНА.**

Усе выпадкі заражэння, пра якія гаварылася вышэй, дапушчаны менавіта ў саматужных майстэрнях прыгажосці. Алена Антонаўна выказала шкадаванне, што людзі карыстаюцца паслугамі прыватных цырульнікаў, якія не маюць адпаведнага дазволу, гэта значыць практыкуюць незаконна. Але самае горшае, што гэтыя людзі не вельмі клапоцяцца пра чысціню рабочых інструментаў. Не ўсе з іх сёння маюць той узровень свядомасці, каб падтрымліваць інструменты шматразовага выкарыстання ў належным стане, бо гэта каштуе грошай. Адваротнае ж нярэдка каштуе здароўя кліентам. Калі людзі звяртаюцца да сумнеўнага майстра па меркаваннях эканоміі, яны павінны ведаць пра небяспеку, падкрэсліла Алена Падушкіна.

* * *

Мая сяброўка шмат гадоў карыстаецца паслугамі майстра-цырульніка Алены, якая прыязджае ў любы зручны час па выкліку. Вядома, што Алена мае цэлую сетку кліентаў, якіх абслугоўвае падобным чынам. Пры падрыхтоўцы матэрыялу я падзялілася з сяброўкай вышэйпрыведзенай інфармацыяй. На што тая адказала так: "Калі я паўтара месяца ляжала ў бальніцы, то мая цырульніца прыязджала да мяне і туды, каб паправіць прычоску. Майстар з якога салона праявіць падобную ўвагу да кліента? Я ведаю яе даўно, і давяраю Алене". Што ж, кожны робіць свой выбар сам. Але рызыку трэба ўлічваць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*


БЕЛАРУСБАНК

**ВНИМАНИЮ КЛИЕНТОВ ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК»!**

С 09 ноября 2016 года в банкоматах «Беларусбанка» реализован сервис по переводу денежных средств между банковскими платежными карточками различных банков одной платежной системы.

С указанной даты за перевод денежных средств с использованием карточек в системах дистанционного банковского обслуживания ОАО «АСБ Беларусбанк» установлены следующие размеры вознаграждений (с подробной информацией о перечне устройств и систем, в которых можно совершить операции по переводу, можно ознакомиться на сайте ОАО «АСБ Беларусбанк» www.belarusbank.by):

| Наименование операции | Размер вознаграждения |
|---|---|
| Перечисление денежных средств (перевод) в белорусских рублях с использованием личной дебетовой карточки ОАО «АСБ Беларусбанк» или ее реквизитов: | |
| со счета на счет одного физического лица | **не взимается** |
| на счет другого физического лица | **1,5%** |
| на счет, к которому оформлена карточка другого банка* | **2,5%** |

* В рамках платежной системы БЕЛКАРТ перевод осуществляется на счета, к которым оформлены карточки БЕЛКАРТ ОАО «Белагропромбанк», ОАО «БПС-Сбербанк», ОАО «Белинвестбанк», ОАО «Паритетбанк», ЗАО «Банк «Решение», ОАО «БНБ-Банк», «Франсабанк» ОАО, ЗАО «Цептер Банк», ЗАО «БТА Банк». Вознаграждение не применяется при совершении операций перечисления денежных средств (переводов) с использованием АИС «Расчет» (ЕРИП).

| Наименование операции | Размер вознаграждения |
|---|---|
| Перечисление денежных средств (перевод) в белорусских рублях с использованием карточки банка-резидента: | |
| на счет, к которому оформлена карточка ОАО «АСБ Беларусбанк»** | **2% от суммы** |
| на счет, к которому оформлена карточка другого банка** | **2,5% от суммы** |

** В рамках платежной системы БЕЛКАРТ перевод осуществляется со счетов/на счета, к которым оформлены карточки БЕЛКАРТ ОАО «Белагропромбанк», ОАО «БПС-Сбербанк», ОАО «Белинвестбанк», ОАО «Паритетбанк», ЗАО «Банк «Решение», ОАО «БНБ-Банк», «Франсабанк» ОАО, ЗАО «Цептер Банк», ЗАО «БТА Банк».

**Контакт-центр – 147**
**www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5»

**Жилой дом № 2 по генплану**

**ДОЛЕВОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО НА КОММЕРЧЕСКОЙ ОСНОВЕ**

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ:**

Закрытое акционерное общество «Совавто Инвест»; место нахождения: г. Минск, ул. Сурганова, дом 61, помещение 81; режим работы: с 09.00 до 17.30. Обеденный перерыв: с 13.00 до 13.30. Выходные дни: суббота и воскресенье. Общество зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 28.03.2011 за № 191445853. Застройщик принимал участие в строительстве жилого дома № 3 по генплану в составе объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5». Фактические сроки строительства жилого дома № 3 по генплану: 07.12.2015-13.07.2016.

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА:**

1. Цели строительства: **возведение многоквартирного жилого дома**; этапы и сроки реализации: **возведение в один этап в срок по 26.09.2017**; получено положительное заключение государственной экспертизы **от 29.02.2016 № 72-15/16**.

2. Сведения о месте нахождения объекта строительства и его характеристики, в том числе сведения о количестве объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров, сведения о ценах на объекты долевого строительства и условия их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке: **1-подъездный 19-этажный крупнопанельный 126-квартирный жилой дом № 2 по генплану в изделиях серии М111-90 по ул. Олешева в г. Минске.**

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются следующие квартиры по указанным ниже ценам:

| Тип квартиры | Площадь по СНБ (кв.м) | Стоимость 1 кв.м* в долларах США** | Цена объекта долевого строительства в долларах США** | Количество квартир | Номера квартир |
|---|---|---|---|---|---|
| 2к | 60,52 | 1 100 | 66 572 | 6 | 15, 22, 17, 24, 19, 26 |
| 2к | 60,29 | 1 100 | 66 319 | 4 | 64, 66, 68, 75 |
| 1к | 45,14 | 1 100 | 49 654 | 6 | 16, 23, 18, 25, 20, 27 |
| 1к | 44,91 | 1 100 | 49 401 | 3 | 65, 67, 69 |
| 3к | 78,02 | 1 000 | 78 020 | 2 | 21, 28 |
| 3к | 77,79 | 1 000 | 77 790 | 1 | 70 |
| **ИТОГО для заключения договоров долевого строительства предлагаются** | | | | **22 квартиры** | |

**** Действует система скидок.***

***** Оплата производится в белорусских рублях по официальному курсу, установленному Нацбанком на дату платежа по договору.***

Цена объекта долевого строительства может быть изменена застройщиком в одностороннем порядке в случае нарушения дольщиком срока оплаты и (или) размера платежей по договору создания объекта долевого строительства вне зависимости от периода просрочки платежа и/или размера несвоевременно внесенного платежа.

3. Информация о решении местного исполнительного и распорядительного органа о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (при наличии такой информации): **нет.**

4. Данные о правах застройщика на земельный участок, его площади: **право временного пользования в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000008001883, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Олешева, 5, площадью 2,5774 га.**

Границы земельного участка: ограничен с севера красными линиями ул. Олешева; с востока территорией существующего жилого дома ТС «Логойское» и строящегося дома ОДО «ОлКи»; с юга территорией существующей группой жилых домов ОАО «ДСТ-5»; с запада пешеходным тротуаром вдоль ул. Восточной.

Данные об элементах благоустройства: **организация подъездов, проездов и парковок; формирование сети пешеходных тротуаров и дорожек; устройство детских площадок, площадок для отдыха взрослого населения и площадки для хозяйственных нужд; озеленение территории; оборудование территории малыми архитектурными формами.**

5. Сведения о количестве в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию жилого дома и иных объектов недвижимости: **22 квартиры.**

6. Сведения о функциональном назначении нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества многоквартирного жилого дома: **7 административных помещений.**

7. Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам: **межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.**

8. Сведения о предполагаемом сроке приемки в эксплуатацию строящихся жилого дома: **26.09.2017.**

9. Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком (при их наличии), и порядке ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: **договор строительного генподряда от 16.05.2016 № 32/05-16, заключенный застройщиком с ОАО «МАПИД».** Дольщикам вправе ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству по согласованию с Застройщиком в установленное им время и в присутствии его уполномоченного представителя с соблюдением правил и техники безопасности. **Уполномоченный представитель Застройщика: ООО «Сильван» (г. Минск, ул. Я. Купалы, д. 17/30; тел.: 8 017 222 38 32, 8 017 222 38 17). Инженерная организация: ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».**

БАНК РЕШЕНИЕ

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2016 г.

Наименование банка: ЗАО «Банк Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2016 | 01.10.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 374 | 3 822 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 30 | 33 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5 557 | 34 403 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 15 453 | 19 437 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5 828 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 52 671 | 44 086 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 18 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 460 | 460 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 20 316 | 15 821 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 4 264 | 4 418 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 7 303 | 6 914 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 116 256 | 129 412 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | 4 800 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 2 | 53 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 65 267 | 86 175 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 5 500 | 998 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 4 093 | 1 177 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 74 862 | 93 203 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 25 519 | 23 612 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 2 682 | 2 670 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 11 894 | 8 650 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 1 299 | 1 277 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 41 394 | 36 209 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 116 256 | 129 412 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2016 г.

Наименование банка: ЗАО «Банк Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2016 | 01.10.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7 512 | 5 867 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 418 | 4 791 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 094 | 1 076 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 760 | 2 915 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 429 | 299 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 331 | 2 616 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 3 | 12 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 577 | 2 283 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 203 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 807 | 1 240 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 837 | 924 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6 397 | 5 277 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 202 | 274 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 436 | 323 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 202 | 110 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 234 | 213 |

Председатель Правления В.М. Саксон

Заместитель главного бухгалтера В.С. Боричевская

Дата подписания «18» октября 2016 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 14 от 08.06.2016 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100789114.

БАНК РЕШЕНИЕ

**Уважаемые вкладчики ЗАО «Банк «Решение»!**

Информируем Вас о том, что с 12.12.2016 в отношении вкладов в иностранной валюте **«Шкварка»** будут действовать новые условия:

| Вид вклада (депозита) | Ранее действующий размер процентных ставок | Новый размер процентных ставок |
|---|---|---|
| «Шкварка» в долларах США* | 5,5% | **4%** |
| «Шкварка» евро* | 5% | **4%** |
| «Мясцовая Шкварка» в долларах США* | 5% | **4%** |
| «Мясцовая Шкварка» в евро* | 4,5% | **4%** |

* Новый размер процентной ставки применяется по вкладам, оформленным в период с 24.07.2015 по 11.11.2015.

По возникшим вопросам Вы можете обратиться в контакт-центр Банка (465 – с мобильного, 8 801 100 33 33 – бесплатный номер для звонков с городского телефона).

ЗАО «Банк «Решение». УНП 100789114. Лиц. №14 от 08.06.2016 г. НБ РБ.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для обслуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5»

**Жилой дом № 1 по генплану**

**ДОЛЕВОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО НА КОММЕРЧЕСКОЙ ОСНОВЕ**

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ:**

Закрытое акционерное общество «Совавто Инвест»; место нахождения: г. Минск, ул. Сурганова, дом 61, помещение 81; режим работы: с 09.00 до 17.30. Обеденный перерыв: с 13.00 до 13.30. Выходные дни: суббота и воскресенье. Общество зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 28.03.2011 за № 191445853. Застройщик принимал участие в строительстве жилого дома № 3 по генплану в составе объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5». Фактические сроки строительства жилого дома № 3 по генплану: 07.12.2015-13.07.2016.

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА:**

1. Цели строительства: **возведение многоквартирного жилого дома**; этапы и сроки реализации: **возведение в один этап в срок по 10.11.2017**; получены положительные заключения государственной экспертизы **от 27.08.2013 № 568-60/13, от 25.02.2016 № 1099-60/15, от 07.07.2016 № 574-60/16**.

2. Сведения о месте нахождения объекта строительства и его характеристики, в том числе сведения о количестве объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров, сведения о ценах на объекты долевого строительства и условия их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке: **9-подъездный 10-этажный крупнопанельный 320-квартирный жилой дом № 1 по генплану в изделиях серии М464-10-У по ул. Олешева в г. Минске.**

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются следующие квартиры по указанным ниже ценам:

| Тип квартиры | Площадь по СНБ (м.кв.) | Стоимость 1 кв.м* в долларах США** | Цена объекта долевого строительства в долларах США** | Количество квартир | Номера квартир |
|---|---|---|---|---|---|
| 2к-28 | 61,44 | 1 100 | 67 584 | 9 | 1, 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29, 33 |
| 2к-23 | 57,07 | 1 100 | 62 777 | 9 | 2, 6, 10, 14, 18, 22, 26, 30, 34 |
| 2к-4 | 57,51 | 1 100 | 63 261 | 9 | 3, 7, 11, 15, 19, 23, 27, 31, 35 |
| 3к-40 | 78,38 | 1 000 | 78 380 | 9 | 4, 8, 12, 16, 20, 24, 28, 32, 36 |
| 2к-26* | 59,01 | 1 100 | 64 911 | 3 | 41, 45, 49 |
| 1к-17 | 39,92 | 1 100 | 43 912 | 3 | 42, 46, 50 |
| 3к-28* | 70,66 | 1 000 | 70 660 | 3 | 59, 63, 67 |
| 4к-42 | 85,15 | 1 000 | 85 150 | 1 | 40 |
| 4к-6 | 92,81 | 1 000 | 92 810 | 4 | 52, 56, 60, 64 |
| 3к-36 | 80,85 | 1 000 | 80 850 | 1 | 73 |
| 3к-37* | 75,92 | 1 000 | 75 920 | 1 | 76 |
| 3к-14* | 79,70 | 1 000 | 79 700 | 7 | 80, 84, 88, 92, 96, 100, 104 |
| 1к-18 | 39,92 | 1 100 | 43 912 | 1 | 74 |
| 1к-2 | 39,99 | 1 100 | 43 989 | 8 | 77, 81, 85, 89, 93, 97, 101, 105 |
| 2к-27* | 59,01 | 1 100 | 64 911 | 1 | 75 |
| 1к-18 | 39,92 | 1 100 | 43 912 | 8 | 78, 82, 86, 90, 94, 98, 102, 106 |
| 2к-27* | 59,01 | 1 100 | 64 911 | 8 | 79, 83, 87, 91, 95, 99, 103, 107 |
| 2к-26* | 59,01 | 1 100 | 64 911 | 2 | 115, 119 |
| 1к-17 | 39,92 | 1 100 | 43 912 | 1 | 128 |
| 1к-1 | 39,99 | 1 100 | 43 989 | 2 | 113, 117 |
| 3к-18* | 75,92 | 1 000 | 75 920 | 1 | 114 |
| 3к-16* | 79,70 | 1 000 | 79 700 | 1 | 118 |
| 2к-26* | 59,01 | 1 100 | 64 911 | 2 | 147, 151 |
| **ИТОГО для заключения договоров долевого строительства предлагаются** | | | | **94 квартиры** | |

**** Действует система скидок.***

***** Оплата производится в белорусских рублях по официальному курсу, установленному Нацбанком на дату платежа по договору.***

Цена объекта долевого строительства может быть изменена застройщиком в одностороннем порядке в случае нарушения дольщиком срока оплаты и (или) размера платежей по договору создания объекта долевого строительства вне зависимости от периода просрочки платежа и/или размера несвоевременно внесенного платежа.

3. Информация о решении местного исполнительного и распорядительного органа о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (при наличии такой информации): **нет.**

4. Данные о правах застройщика на земельный участок, его площади: **право временного пользования в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000008001883, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Олешева, 5, площадью 2,5774 га.**

Границы земельного участка: ограничен с севера красными линиями ул. Олешева; с востока территорией существующего жилого дома ТС «Логойское» и строящегося дома ОДО «ОлКи»; с юга территорией существующей группой жилых домов ОАО «ДСТ-5»; с запада пешеходным тротуаром вдоль ул. Восточной.

Данные об элементах благоустройства: **организация подъездов, проездов и парковок; формирование сети пешеходных тротуаров и дорожек; устройство детских площадок, площадок для отдыха взрослого населения и площадки для хозяйственных нужд; озеленение территории; оборудование территории малыми архитектурными формами.**

5. Сведения о количестве в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию жилого дома и иных объектов недвижимости: **94 квартиры.**

6. Сведения о функциональном назначении нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества многоквартирного жилого дома: **19 административных помещений.**

7. Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам: **межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.**

8. Сведения о предполагаемом сроке приемки в эксплуатацию строящихся жилого дома: **10.11.2017.**

9. Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком (при их наличии), и порядке ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: **договор строительного генподряда от 24.05.2016 № 39/05-16, заключенный застройщиком с ОАО «МАПИД».** Дольщики вправе ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству по согласованию с Застройщиком в установленное им время и в присутствии его уполномоченного представителя с соблюдением правил и техники безопасности. **Уполномоченный представитель Застройщика: ООО «Сильван» (г. Минск, ул. Я. Купалы, д. 17/30; тел.: 8 017 222 38 32, 8 017 222 38 17). Инженерная организация: ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».**

## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Huawei зовет учиться!»

**Наименование организатора:** Издательско-производственное частное унитарное предприятие «Проспектпресс».

**Место нахождения организатора:** 220030, г. Минск, ул. Интернациональная, д. 16.

**Наименование рекламной игры:** Huawei зовет учиться!

**Территория проведения рекламной игры:** Магазины «5 элемент», «Электросила», «Алло!», «На связи», «Связной», «Техно Плюс», «Velcom», «МТС», «life:)» и официальные дилеры сотовых операторов.

**Срок начала рекламной игры:** 1 сентября 2016 года.

**Срок окончания рекламной игры:** 11 ноября 2016 года.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2814 от «30» августа 2016 г., выданное Министерством торговли Республики Беларусь.

**Количество участников рекламной игры:** 594 участника.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:** призовой фонд разыгран полностью.

| № | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш |
|---|---|---|
| **Призы первого уровня** | | |
| 1. | Прищепа Артём Александрович | Денежный приз в размере 4000,00 белорусских рублей + Денежный приз в размере 582,91 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) |
| 2. | Денис Юрий Иванович | |
| 3. | Кудревич Вадим Николаевич | |
| **Призы второго уровня** | | |
| 4. | Ерошенко Евгений Михайлович | Обучение на курсах (Английский язык) + Денежный приз в размере 150,89 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 5. | Воробьева Анна Михайловна | |
| 6. | Черныш Сергей Викторович | |
| 7. | Новик Вадим Владимирович | Организация образовательных услуг по курсу «Дизайн START + Моушн-дизайн» + Денежный приз в размере 119,69 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Планируемая дата начала занятий: 09 ноября 2016 г., слушатели вправе выбрать другую дату, но не позднее 05 июня 2017 г.)* |
| 8. | Сухотская Екатерина Геннадьевна | |
| 9. | Соболь Вероника Петровна | |
| 10. | Котинёва Анна Анатольевна | Подготовка (переподготовка, повышение квалификации) водителя механических транспортных средств категории «B» + Денежный приз в размере 88,31 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Точная дата начала занятий определяется приказом по мере комплектования группы, но не позднее 01 января 2017 г.)* |
| 11. | Кислюк Виктория Сергеевна | |
| 12. | Гвоздь Елизавета Сергеевна | |
| **Призы третьего уровня** | | |
| 13. | Шот Елена Игоревна | Обучение на курсах (Визаж) + Денежный приз в размере 26,45 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 14. | Кисель Наталья Васильевна | |
| 15. | Веркович Татьяна Николаевна | |
| 16. | Кливенок Максим Владимирович | Обучение на курсах (Web-дизайн (графический дизайн) + Денежный приз в размере 25,55 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 17. | Ключка Елена Сергеевна | |
| 18. | Мацкевич Ольга Валерьевна | |
| 19. | Кистень Екатерина Александровна | Обучение на курсах (Английский язык) + Денежный приз в размере 68,05 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 20. | Пашкявичюс Анна Викторовна | |
| 21. | Якубовская Ольга Брониславовна | |
| 22. | Гончарова Юлия Анатольевна | Обучение на курсах (Массаж) + Денежный приз в размере 42,59 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 23. | Пытель Ирина Николаевна | |
| 24. | Сац Игорь Александрович | |
| 25. | Зубковская Анастасия Сергеевна | Обучение на курсах (Дизайнер интерьера) + Денежный приз в размере 25,55 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 26. | Досова Валерия Олеговна | |
| 27. | Кута Наталья Александровна | |
| 28. | Емельянович Сергей Николаевич | Обучающий курс «WEB-дизайн и анимация (Photoshop, Flash, ActionScript)» + Денежный приз в размере 20,77 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Точная дата начала занятий определяется Приказом о начале обучения по мере комплектования группы, но не позднее 01 января 2017 г.)* |
| 29. | Веркович Андрей Константинович | |
| 30. | Ликий Антон Сергеевич | |
| 31. | Калишук Артем Игоревич | Обучение на курсах «Бухгалтерский учет» + Денежный приз в размере 30,57 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 32. | Занько Тамара Ивановна | |
| 33. | Юркевич Надежда Сергеевна | |
| 34. | Солодуха Валентин Александрович | Обучающий курс «Реклама в интернете: SEO-продвижение, контекстная реклама, маркетинг в SMM, веб-аналитика» + Денежный приз в размере 24,58 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Точная дата начала занятий определяется Приказом о начале обучения по мере комплектования группы, но не позднее 01 января 2017 г.)* |
| 35. | Любко Сергей Владимирович | |
| 36. | Шлапаков Александр Евгеньевич | |
| 37. | Дубовик Павел Геннадьевич | Обучение на курсах (Фотографии) + Денежный приз в размере 25,55 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Срок обучения: по 16 января 2017 г.)* |
| 38. | Батраченко Ирина Николаевна | |
| 39. | Савчук Наталья Вячеславовна | |
| 40. | Воронова Наталья Петровна | Образовательная услуга для Слушателя по программе «STEM для начинающих/продолжающих для детей от 5 класса» + Денежный приз в размере 3,14 белорусских рублей (компенсация подоходного налога) *(Планируемая дата начала занятий – 09 января 2017 г. Точная дата начала занятий определяется Приказом о начале обучения по мере комплектования групп, но не позднее 15 января 2017 г.)* |
| 41. | Чуб Александра Михайловна | |
| 42. | Вечканова Оксана Вячеславловна | |

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (29) 322 42 52 (в рабочие дни с 9.00 до 18.00).

УНП 101520868

## Кантрамарка

# Наўкол, магчыма, нехта ёсць

**Калі я раніцой у гуморы, то, выходзячы з пад'езда, люблю ўявіць, што здымаюся ў кіно. Акурат цяпер здымаюць сцэну: я выходжу на вуліцу пад пэўны саўндтрэк. Шпацыр з пятага паверха дазваляе паразважаць, пад які менавіта. Калі я адчыняю дзверы, ён гучыць у маёй галаве сваім лепшым фрагментам. І я ніколі не думала, што змагу пабачыць спектакль пра музыку ў маёй галаве ды крохкае адчуванне свету ў гэты момант...**

Бадай што самай галоўнай падзеяй сёлетняга Міжнароднага форуму тэатральнага мастацтва «TEART» для знаўцаў стаў паказ у Мінску спектакля вядомага еўрапейскага рэжысёра Крыстафа Марталера «Кінг сайз» (Тэатр Відзі-Лазан, Швейцарыя). За некалькі дзесяцігоддзяў работы Марталер займеў у тэатральным свеце рэпутацыю вясёлага правакатара і вынаходніка ўнікальнай тэатральнай мовы. Спектакль, паказаны ў межах Форуму (дарэчы, Марталера пабачылі ў Мінску ўпершыню), пацвердзіў яе напалову. Дзеянне, што разгорталася ў блакітным гасцінічным нумары, наўрад ці ставіла за мэту справакаваць гледача, аднак пераконвала: у нас так не пішуць.

Адпраўной кропкай для тэатральнага сачынення Марталера стаў успамін пра старую партугальскую гасцініцу, дзе ён аднойчы апынуўся, і жанчыну, што іграла там на раялі. Аднак рэжысёр рэканструюе, хутчэй, не карціны з мінулага, а настрой, які апаноўвае, калі ён успамінае гэтыя карціны.

Тое, што адбываецца на сцэне, складана апісаць. У інтэр'ерах нумара, значную частку якога займае вялікі ложак (ложак «кінг сайз» — адсюль і назва спектакля), існуюць чатыры чалавекі: мужчына і жанчына сярэдняга ўзросту, жанчына сталага ўзросту і мужчына-тапёр. Пара цягам гадзіны (у сцэнічным часе: з ранку да вечара) выконвае розныя песні — ад народных да сучасных хітоў. Артысты спяваюць у самых нечаканых мізансцэнах: лежачы на ложку; лежачы пад ложкам і намагаючыся заесці спеў садавінай;


Фота Ігара ЧЫШЧЭНІ.

хаваючыся ў шафе. Пажылая жанчына прагульваецца па нумары з сумкай, адкуль з'яўляюцца адны нечаканыя рэчы (напрыклад, капусны ліст, што потым з'есць спявачка) і куды знікаюць іншыя нечаканыя рэчы (напрыклад, тэлефонны апарат з нумара). Час ад часу яна прамаўляе невялікія празаічныя фрагменты тэксту накшталт: «Я такая шчаслівая, што душа мая навыварат». Тапёр стварае музычны каркас дзеяння і час ад часу ўключаецца ў яго драматычны складнік.

«Кінг сайз», безумоўна, нечым падобны на вадэвіль ці аперэту — музыка, іранічныя куплеты, камедыйныя эпізоды. Аднак умоўная лінія сюжэта, уздоўж якой прасціраецца ўспамін-фантазія, тут зусім не вадэвільная. Марталер іранізуе з ладу жыцця сучаснага чалавека, яго дзіўнай рытуальнасці, інфармацыйнага шуму (які пераўвасабляе ў шум музычны). А галоўнае: разважае над тым, якія ж мы ўсе адзінокія — побач, але не разам.

Чалавек з'яўляецца ў гэтым вялікім свеце памеру «кінг сайз» адзінокім, усведамляючы часовасць свайго быцця — нібы ў нумары гатэля. Умовы існавання зададзеныя Марталерам для акцёраў, пераконваюць, што нічога нас не здолее выратаваць. Тут усе існуюць паасобку, нават пара — мужчына і жанчына. Тое, што яны паасобку, адчуваецца і ў манеры выканання песень быццам дуэтам, і ў тым, як пабудаваны мізансцэны спектакля, як не зважаючы адзін на аднаго героі жывуць сваё жыццё.

...Але вось раптам пажылая жанчына валіцца ў ложак, які ўжо заняў дуэт. Яна ўладкоўваецца акурат паміж імі. Нечакана мужчына ў сне абдымае старую. Ды сполах надзеі на шанц быць заўважаным імгненна згасае. Сцэна пабудавана так, што ўзнікненне пачуццяў паміж гэтымі героямі падаецца гледачам з'явай, якая ніколі не можа адбыцца.

«Кінг сайз» — гэта музычны тэатр абсурду. Чаму пажылая жанчына пачынае есці спагеці, дастаючы іх з уласнай сумкі часалкай для спіны, нібы велізарным відэльцам? Чаму героі спяваюць з шафы, быццам з музычнай шкатулкі, і заціхаюць, як толькі зачыняюцца дзверы? Абсурд Марталера блізкі да эстэтыкі анімацыйнага фільма, дзе па волі мастака выявы вынікаюць адна з адной невытлумачальна, але неверагодна прыгожа. Марталер дадае да выяў музыку. І калі можна было б паглядзець на дзеянне праз нейкі фільтр, накшталт тых, што ператвараюць фота на тэлефоне ў малюнак, гледачоў увогуле нічога не здзівіла б. Прыўкрасны і крыху сумны мультфільм для дарослых!

У фінале Марталер пакідае нас у вясёлым настроі і разгубленасці перад законамі свету. Уяўляеце, мы пражываем жыццё, якое можна праспяваць крыху больш, чым за гадзіну? І ў той жа час існуем у свеце «каралеўскага памеру», дзе кожны можа аказацца побач з табой, але не разам.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.28 | 17.18 | 8.50 |
| Віцебск — | 8.22 | 17.03 | 8.41 |
| Магілёў — | 8.18 | 17.08 | 8.50 |
| Гомель — | 8.09 | 17.11 | 9.02 |
| Гродна — | 8.42 | 17.35 | 8.53 |
| Брэст — | 8.37 | 17.41 | 9.04 |

### Месяц

*Першая квадра 07.11—13.11.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

*Пр. Праскоўі, Арсенія, Дзмітрыя, Івана, Максіма, Несцера, Сцяпана.*
*К. Наталлі, Нэлі, Андрэя, Любаміра, Льва, Лявона, Сцяпана.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Крымінал

### Пазабаўляўся на справу

**Даўнавата ў Брэсце не было «мінёраў», дык знайшоўся прыезджы — з Магілёўшчыны.**

35-гадовы мужчына зайшоў у кабінку таксафона ў самым цэнтры горада, набраў нумар «102» і паведаміў, што гарыць аўтавакзал, а ўнутры памяшкання закладзена бомба. Як паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў Брэсцкага абласнога УУС, на месца прыбылі вайскоўцы сапёрна-піратэхнічнай групы, былі праведзены ўвесь комплекс мерапрыемстваў. З вакзала эвакуявалі 20 чалавек. Памяшканне агледзелі, небяспечных прадметаў не знайшлі. З дапамогай запісу відэакамеры ў раёне размяшчэння таксафонаў хутка вылічылі тэлефоннага «мінёра». Ім аказаўся жыхар вёскі з Магілёўскага раёна, які раней прыцягваўся да адказнасці за наўмысны падпал. Як высветлілася, у Брэст ён прыбыў у пошуках новых прыгод, нагаваў на вуліцы, вёў бадзяжны лад жыцця. Заведзена крымінальная справа.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 10 ЛІСТАПАДА

**1882** год — нарадзіўся Андрэй Мікалаевіч Тупалеў, расійскі савецкі вучоны і авіяканструктар, акадэмік АН СССР, генерал-палкоўнік-інжынер, тройчы Герой Сацыялістычнай Працы. Пад яго кіраўніцтвам створана звыш 100 тыпаў ваенных і грамадзянскіх самалётаў, у тым ліку АНТ-25, Ту-104 (першы пасажырскі рэактыўны), Ту-114, Ту-134, Ту-154. На самалётах Тупалева ўстаноўлена 78 сусветных рэкордаў, выканана 28 унікальных пералётаў, у тым ліку В. Чкалавым і М. Громавым на АНТ-25 праз Паўночны полюс у ЗША. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР (1943, 1948, 1949, 1952, 1972 гг.).

**1885** год — з Бад-Канштата ва Унтэрцюркхайм (прыгарады Штутгарта) па набярэжнай ракі Некар з неверагоднай для таго часу хуткасцю 12 км/г пранёсся першы матацыкл. Гэта быў вельмі арыгінальны веласіпед з маторам. Рама гэтак жа, як і колы, была выраблена з дрэва. Прычым колаў было не два, а чатыры, усе замест гумавых пакрышак былі зверху абабітыя жалезам. Пад сядзеннем размяшчаўся рухавік унутранага згарання магутнасцю 0,5 к. с. У якасці паліва мог быць выкарыстаны бензін або газ. Каб запусціць сілавы агрэгат, першапачаткова трэба было бензінавым награвальнікам распаліць медную запальную трубку, ад якой у далейшым запальвалася гаручая сумесь. Рухавік запускалі завадной рукаяткай, і калі ўсё было добра, то гэтая аперацыя займала прыблізна адну хвіліну.



**1917** год — Памесны сабор Рускай праваслаўнай царквы прыняў гістарычнае рашэнне аб аднаўленні Патрыяршаства, скасаванага Пятром Першым. 18 лістапада 1917 года ў храме Хрыста Збавіцеля адбыўся ўсеагульны сход Святога сабора, на якім Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі быў абраны мітрапаліт маскоўскі Ціхан (Бялавін). 4 снежня ва Успенскім саборы Крамля адбылася інтранізацыя Патрыярха.

**1921** год — 95 гадоў таму нарадзіўся (г. Смаргонь) Віктар Роўда, беларускі харавы дырыжор, педагог. Народны артыст Беларусі і СССР. З 1956 года хормайстар і дырыжор Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор акадэмічнага хору тэлебачання і радыё. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2007 годзе.

**1936** год — 80 гадоў таму нарадзіўся Валянцін Сяргеевіч Кароўкін, беларускі вучоны ў галіне фтызіятрыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. У 1960 годзе скончыў Крымскі медыцынскі інстытут. З 1969-га — у Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Аўтар шэрагу навуковых работ.

Было сказана

**Андрэй МАКАЁНАК, драматург:**
*«Калі Бог захоча моцна пакараць чалавека, ён задавальняе ўсе яго патрэбнасці».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Два банкіры адпачываюць на прыродзе.**
**— У цябе ахова колькі чалавек?**
**— 11. А ў цябе?**
**— І ў мяне 11. Слухай, можа, у футбол сыграем?**

Кідаю курыць. Дзень сёмы. Накрычаў на хлеб за тое, што ён моцна крышыцца...

**— Казімір! Да выставы пяць хвілін, а ў цябе яшчэ нічога не гатова!**
**— Зараз усё будзе.**

Мужчына ў ведзьмака.
— Дапамажыце прычараваць дзяўчыну.
— Добра, запамінай чары. Прыходзіш з ёй у краму моднага жаночага адзення і кажаш запаветныя словы: «Бяры, што хочаш — усё аплачу».

**Вадзім ужо паўтара года хацеў развітацца з Ірынай, але Іра была чэмпіёнкай горада па дзюдо і таму сама вырашала, калі і з кім развітвацца.**



Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4504.
Нумар падпісаны ў 19.30 9 лістапада 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12